№ 35 (537) 27 верасьня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА
ISSN 1819-1614
Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## У НУМАРЫ

**Тадэвуш Кандрусевіч: Хачу сустрэцца з уладыкам Філарэтам**

Першае інтэрвію новага кіраўніка Менска-Магілёўскай дыяцэзіі, мітрапаліта Кандрусевіча. **Старонка 6.**

# Адстаяў права быць беларусам

Гомельскі хлопец **Сяргей Сямёнаў** вымусіў старшыню Канстытуцыйнага суду і Мытнага камітэту зьвярнуць увагу на правы беларускамоўных. **Старонка 3.**



**Усё жыцьцё — дзіўны сон**

**Гурт «Крама» прэзэнтаваў новы альбом, нягледзячы на забароны ідэолягаў. Сярод іншых павіншаваць Варашкевіча з выхадам альбому прыехала поп-зорка Іна Афанасьева. Старонка 21.**

Юлія Дарашкевіч

# Наркамаўка ці тарашкевіца?

Ці зможа нацыянальная культура стаць маналітнай? Бурная дыскусія аб пераходзе на адзіны правапіс: пішуць **Сяргей Богдан**, **Зьміцер Саўка**, **Сяргей Дубавец**, **Пётра Рудкоўскі**, **Андрэй Дынько**, **Руслан Равяка**. Старонкі 27—33.

**Беларускі інстытут стратэгічных дасьледаваньняў**

правёў сваю першую канфэрэнцыю. Пішуць Аляксандар Класкоўскі, Віталь Сіліцкі. **Старонка 34.**

**Андрэй Сухарэнка ў Страсбургу**

Адстаўка Сьцяпана Сухарэнкі не адбілася на бліскучай кар'еры яго сына. **Старонка 4**.

**Манахі супраць генэралаў**

М'янма: аранжавая рэвалюцыя. **Старонка 12.**

**Арыгінальны адказ Пяткевіч**

Арганізатараў «Эўрапейскага» і «Сацыяльнага» маршаў, Віктара Івашкевіча і Валера Ухналёва затрымалі і даставілі... у выцьвярэзьнік. **Старонка 5.**

з ь б я р ы « К н і г а р н ю « Н а ш а Н і в а »




**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў**

Кніга падарожных эсэ.




**Віталь Тарас. Звыклае зло**

Зборник эсэ.




**Алесь Кудрыцкі.** Суд на Каляды

Зборнік публіцыстыкі.

ш у к а й ц е ў к н і г а р н я х і ў н е з а л е ж н ы х р а с п а ў с ю д н і к а ў




**Андрэй Хадановіч.** Сто лі100ў на tut.by

Новая кніга паэта, якога няма патрэбы прэзэнтаваць.




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна**

Кнігу склалі апавяданьні і дэтэктыўная аповесьць.




**Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне Беларусі**

Пётра Рудкоўскі мне нагадвае Максіма Багдановіча — і першы, і другі адразу па прыходзе ў беларускае пісьменства (першы — у прыгожае, а другі — ужо ў інтэлектуальнае) радыкальна зьмянілі яго стыль і занялі ў ім вядучыя пазыцыі.

**З прадмовы Валера Булгакава**

с э р ы я з а с н а в а н а я ў г о н а р 100-г о д з ь д з я « Н а ш а й Н і в ы »

# Адстаяў права быць беларусам

Гомельскі хлопец Сяргей Сямёнаў вымусіў старшыню Канстытуцыйнага суду і Мытнага камітэту зьвярнуць увагу на прыродныя правы беларускамоўных.

Гісторыя гомельскага хлопца Сяргея Сямёнава пачалася 20 жніўня сёлета, калі хлопец перасякаў беларуска-ўкраінскую мяжу. Хлопец кажа, што праблемы на мяжы ў яго ўзьнікаюць заўсёды, ня стаў выключэньнем і той выпадак.

«Мне прапанавалі запоўніць мытную дэклярацыю. Я папрасіў, каб мне далі дэклярацыю на беларускай мове, але такой у мытнікаў не аказалася. Я застаўся пры сваёй пазыцыі, абгрунтаваўшы гэта тым, што праз кепскае веданьне расейскай мовы магу дапусьціць нейкія памылкі. Не граматычныя, а па зьмесьце. Пасьля адмовы прапанаваў, каб мне прадставілі прафэсійнага перакладчыка, але і ў гэтым было адмоўлена. Дэклярацыю я так і не запоўніў. За гэта на мяне і быў складзены пратакол паводле артыкула 23.4 Кодэксу аб адміністратыўных правапарушэньнях (непадпарадкаваньне законным патрабаваньням)», — кажа С.Сямёнаў.

30 жніўня над Сямёнавым па гэтай справе адбыўся суд. Судзьдзя Дамненка вынесла прысуд адразу ж пасьля сьведчаньняў Сямёнава, хлопец атрымаў 30 базавых велічыняў штрафу (930 тысячаў рублёў). Не былі нават апытаны супрацоўнікі мытні, якія складалі пратакол.

Акурат празь дзесяць дзён С.Сямёнаў яшчэ раз выяжджаў ва Ўкраіну. На кантрольна-прапускным пункце «Новая Гута» яго папрасілі зноў запоўніць мытную дэклярацыю. Нягледзячы на сумны мінулы досьвед, хлопец усё адно папрасіў прадставіць яму дэклярацыю па-беларуску. На што атрымаў рашучую адмову. Далей гісторыя разьвівалася прыкладна па тым самым сцэнары, што і ў першы раз. С.Сямёнава прывялі да начальніка зьмены.


WWW.SVABODA.ORG

Памежнікі адпусьцілі хлопца ўжо тады, калі нічым дабрацца да Чарнігава было немагчыма, таму ўсе 65 кілямэтраў ён прайшоў пешшу.

«Я вырашыў усё адно цьвёрда трымацца свайго», — зазначае хлопец.

На яго быў складзены адміністрацыйны пратакол па тым самым правапарушэньні, што і 20 жніўня. Памежнікі адпусьцілі хлопца ўжо тады, калі нічым дабрацца да Чарнігава было немагчыма.

«Аднак у мяне а 9-й раніцы была важная сустрэча, таму вырашыў усё ж дабірацца да прызначанага месца. Разьлічваць на тое, што мяне падбярэ нейкая машына з маім выглядам і ростам не выпадала, таму ўсе 65 кілямэтраў да Чарнігава прайшоў пешшу», — кажа С.Сямёнаў.

Менавіта гэтыя гісторыі паслужылі падставай для заяваў старшыні Канстытуцыйнага суду Рыгора Васілевіча. 18 верасьня на сэмінары, прысьвечаным пытаньням міжнародных стандартаў у галіне правоў чалавека і правасудзьдзя, ён адзначыў, што ў краіне парушаюцца правы беларускамоўных, прывёўшы прыклад Сямёнава.

Праз пару дзён на інцыдэнт зрэагаваў і старшыня мытнага камітэту Аляксандар Шпілеўскі, які паабяцаў, што бліжэйшым часам на мытнях зьявяцца дэклярацыі на беларускай мове.

24 верасьня намесьнік Шпілеўскага Пехцераў заявіў, што беларускамоўныя блянкі зьявіліся на ўсіх мытнях краіны.

Сямёнаў на гэта рэагуе проста:

«Здарылася тое, што мусіла здарыцца ў любой краіне. Нічога звышнатуральнага не адбылося. Мы проста адстаялі свае права размаўляць і пісаць па-беларуску. Права быць беларусам. Прыемна, што і я крыху спрычыніўся да гэтага».

Аднак судовыя разьбіральніцтвы па справе Сямёнава ня скончыліся. Суд па другім пратаколе мусіў адбыцца ў панядзелак пасьля абеду, але зь незразумелых для хлопца прычынаў разгляд справы перанесьлі на 4 кастрычніка. Бліжэйшымі днямі ў Гомельскім абласным судзе павінна быць разгледжаная скарга Сямёнава па першым прысудзе.

**Зьміцер Панкавец**

**Аляксандар Шпілеўскі**

старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэту пра адсутнасьць беларускамоўных блянкаў: «Гэта недагляд, нават больш — гэта мая асабістая памылка, якую вельмі хутка выправім».

**Рыгор Васілевіч**

старшыня Канстытуцыйнага суду: «Адказнасьць за непавагу да дзяржаўнай мовы ніхто не адмяняў. Да нас неаднаразова паступаюць скаргі на тое, што заяву ў суд не прымаюць, таму што яна напісана па–беларуску. Я сам бачыў такую рэзалюцыю: «Перапішыце заяву на нармальнай мове». У Канстытуцыі запісана, што ў Беларусі дзьве дзяржаўныя мовы — руская і беларуская, таму такая рэзалюцыя зьяўляецца непавагай да дзяржаўнай мовы».

# Упершыню беларускацэнтрычнае навагодняе шоў

АНТ пачало здымаць першы беларускі тэлем'юзыкал «Паўлінка–new».

Аляксандар Бутар, рэжысэр-пастаноўшчык фільму кажа: «Мы крыху зрабілі сучасны погляд на гэтую гісторыю. Дадалі некаторыя сучасныя дэталі. Пры гэтым захавалі каларыт — купалаўскую гісторыю, купалаўскія характары».

Мужа й жонку Пустарэвічаў загрюць тэлевядоўца Яўген Лашкоўскі (**на фота**) й сьпявачка Таццяна Лазоўская. Удзел у пастаноўцы бяруць таксама Іна Афнасьева, Яўген Булка, браты Калдуны.

**Паводле ONT.by**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Новая крымінальная справа супраць Дашкевіча



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Палітвязень Зьміцер Дашкевіч паведаміў у пісьме, што сьледчыя КДБ завялі супраць яго новую крымінальную справу. Цяпер яго вінавацяць паводле арт. 402 — за адмову даваць паказаньні.

Дашкевіч, лідэр незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт», адбывае ў Шклоўскай турме паўтара году за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. Яго не аднойчы дапытвалі па крымінальных справах некаторых юнакоў, якіх абвінавачвалі ў прыналежнасьці да «Маладога фронту». Дашкевіч адмаўляецца паказваць супраць сваіх сяброў.

**Ул. інф.**

# Андрэй Сьцяпанавіч Сухарэнка працуе ў Страсбургу

Сумная доля Сьцяпана Сухарэнкі не адбілася на бліскучай кар'еры Андрэя Сьцяпанавіча.

Той цяпер працуе першым сакратаром пасольства Беларусі ў Францыі па пытаньнях Рады Эўропы. Ён мае за сядзібу не Парыж, а Страсбург — там кшталту нефармальнага прадстаўніцтва пры Радзе Эўропы, якое забясьпечвае узаемадзеяньне Беларусі з Радай Эўропы і Эўрапарлямэнтам. Нагрузка невялікая — улічваючы, што Беларусь мае мінімум кантактаў і за парушэньні дэмакратычных нормаў страціла нават статус спэцыяльна запрошанага.

Раней у Страсбургу працаваў толькі адзін чалавек на пасадзе дарадцы, а цяпер дарадца зьяўляецца і першым сакратаром. Дарэчы, з дыпляматычнай пляцоўкі ў Страсбургу пачыналася бліскучая кар'ера Ўладзімера Макея, гадаванца контравыведкі, які перакачаваў у крэсла дарадцы, але ўжо не пасольства, а самога Аляксандра Лукашэнкі, і цяпер лічыцца адной з найбольш уплывовых асобаў краіны.

Цікава, што сын міністра ўнутраных справаў У. Навумава працуе ў Нідэрляндах — празь якія адбываецца львіная доля рээкспарту беларускіх нафтапрадуктаў, а сын Канаплёва — у Кітаі.

**Мікола Бугай**

# Генпракурорам ЗША можа стаць беларус

Прапанаваны на пост міністра юстыцыі і генпракурора ЗША колішні фэдэральны судзьдзя Майкл М'юкейсі (Mukasey) — выхадзец зь Беларусі, паведаміў РІА «Новости» Валер Шчукін, перакладчык, які доўгі час працаваў разам з М'юкейсі ў фэдэральным судзе Паўднёвай акругі Нью-Ёрку.

«Я цікавіўся каранямі М'юкейсі, і ён мне сказаў, што яго бацька — выхадзец зь Беларусі, зь мястэчка пад Баранавічамі. У іх распаўсюджанае ў Беларусі прозьвішча Мукасей, трансфармаванае ў амэрыканскае М'юкейсі. Беларускай моваю ён не валодае, бо нарадзіўся ўжо ў ЗША», — сказаў Шчукін, які таксама эміграваў зь Беларусі.

Кандыдатура новага генпракурора, які паводле пасады адказвае і за кіраўніцтва ФБР, мусіць прайсьці зацьверджаньне ў сэнаце ЗША і толькі пасьля гэтага М'юкейсі зможа ўзначаліць гэтае самае ўплывовае ведамства.

М'юкейсі-Мукасей працаваў 18 гадоў судзьдзём у Паўднёвай акрузе да выхаду на



пэнсію ў 2006 г. Ён выносіў вэрдыкты па «гучных» тэрарыстычных справах, у прыватнасьці, на працэсе ісламістаў, якія арганізавалі выбух у гаражы Сусьветнага гандлёвага цэнтру ў 1993 г.

«М'юкейсі таксама разглядаў шматлікія справы «рускай мафіі» і вылучаўся справядлівым і незалежным стаўленьнем», — сказаў Шчукін.

М'юкейсі мусіць замяніць Альбэрта Гансалеса, які сышоў у адстаўку ў мінулым месяцы і якога дэмакраты вінавацілі ў прадузятасьці й залішняй ляяльнасьці да адміністрацыі Джорджа Буша.

**Паводле РИА Новости**

# Маршы рыхтуюцца, Пяткевіч маўчыць

Дэмакратычная апазыцыя падсумавала свае пляны на восень: два маршы, агульнанацыянальныя пікетаваньні і зварот да дэпутатаў.

У Менску прайшла чарговая прэсавая канфэрэнцыя арганізатараў пратэставых акцыяў, прымеркаваных на восень.

Журналістаў склікалі найперш для таго, каб заявіць: гэта будуць не асобныя ўсплёскі пратэсту, а скаардынаваная палітычная кампанія. Дэмакратычная апазыцыя спадзяецца, што да яе далучацца новыя групы, якія раней не былі актыўнымі ўдзельнікамі палітычных пратэстаў. Асабліва часта ў зьвязку з гэтым узгадваліся чарнобыльцы ды прадпрымальнікі.

Значная частка мерапрыемстваў восеньскай кампаніі маюць падкрэсьлены сацыяльна-эканамічны характар. Першая акцыя адбудзецца 30 верасьня. У гэты дзень у больш чым шасьцідзесяці гарадах і мястэчках па ўсёй краіне пройдуць каля 450 пікетаў — прынамсі, столькі заявак на пікетаваньне ўжо было пададзена ў адпаведныя выканкамы. Афіцыйных адказаў пакуль што не атрымаў ніхто. Зрэшты, арганізатары ня дужа спадзяюцца на тое, што ўлада пойдзе ім насустрач.

Паводле некаторых зьвестак, гэтым разам выканкамам была дадзеная ўстаноўка на тое, каб яны пісалі адмовы не пад капірку, а выяўлялі вынаходлівасьць. На думку **Анатоля Лябедзькі**, ніякі закон не забараняе чалавеку раздаць у двары свайго дому 299 асобнікаў друкаванай прадукцыі, таму пікеты адбудуцца ў любым выпадку. Дый такая колькасьць хоць і невялікіх, але адначасовых пратэставых акцыяў мае стаць сапраўдным выпрабаваньнем для міліцыі ды АМАПу — толькі на Меншчыне было пададзена 102 заяўкі на пікеты.

Наступны этап восеньскай кампаніі — 2 кастрычніка, дзень адкрыцьця чарговай сэсіі Палаты прадстаўнікоў. Перад пачаткам працы дэпутаты атрымаюць адмысловы зварот насельніцтва, у якім будзе дадзеная ацэнка іх заканатворчай дзейнасьці ў сацыяльнай сфэры. Збор подпісаў пад зваротам ужо распачаўся.

### Мілінкевіч запрасіў лідэраў Эўропы

**Аляксандар Мілінкевіч накіраваў запрашэньне на Эўрапейскі марш старшыням Эўракамісіі і Эўрапарлямэнту і кіраўнікам эўрапейскіх дзяржаваў. «Мы запрашаем нашых сяброў быць з намі 14 кастрычніка. Мы будзем удзячныя за праяву салідарнасьці з Вашага боку».**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

### Арыгінальны адказ Пяткевіч

Зьмяшчэньне Віктара Івашкевіча і Валера Ўхналёва ў выцьвярэзьнік засьведчыла: улады вырашылі яшчэ раз паказаць дзеячам апазыцыі, што сочаць за імі. Няма сумневу, БТ скарыстаецца выпадкам, каб паказаць, як лідэры БНФ выпіваюць з камуністамі. Такая вось падрыхтоўка да «Эўрапейскага маршу».

Вулічныя маніфэстацыі застаюцца найбольшым раздражняльнікам для ўладаў, і тыя не шкадуюць сродкаў, каб сарваць або прынамсі аслабіць іх.

Заключным акордам восеньскіх сацыяльных пратэстаў будзе Сацыяльны марш, прызначаны на 4 лістапада. Паводле камуніста **Валера Ўхналёва**, старшыні аргкамітэту Сацыяльнага маршу, была пададзеная заяўка на яго правядзеньне. Хутчэй за ўсё, улады будуць максымальна цягнуць з адказам.

**Віктар Івашкевіч**, старшыня аргкамітэту прызначанага на 14 кастрычніка Эўрапейскага маршу, падкрэсьліў, што ў Беларусі няма ніводнай палітычнай сілы, якая б выступіла супраць правядзеньня Эўрапейскага маршу: «Нават праўрадавыя маўчаць». На прэсавай канфэрэнцыі не было **Аляксандра Мілінкевіча**, аднак Віктар Івашкевіч заклікаў не рабіць з гэтага пасьпешлівых высноваў — Мілінкевіч знаходзіцца ў паездках па рэгіёнах, і цалкам падтрымлівае ідэю Эўрапейскага шляху. На пытаньне, ці будуць арганізатары маршу нейкім чынам спрыяць прыезду актывістаў з рэгіёнаў, Віктар Івашкевіч адказаў: «Кожны сам будзе шукаць шляхоў, як дабрацца». Гэта найлепшы спосаб, лічыць ён.

«Эўрапейскі марш, Сацыяльны марш і кампанія за свабодныя выбары — гэта тры складнікі падрыхтоўкі выбарчай кампаніі», — заявіў Анатоль Лябедзька, маючы на ўвазе выбары ў Палату прадстаўнікоў, якія маюць адбыцца ў 2008 г.

**Вінцук Вячорка** спрагназаваў налета абвастрэньне сітуацыі ў краіне, найперш праз высьпяваючы эканамічны крызіс. Сакавік-2008 будзе гарачым — на яго прыпадае 90-ая гадавіна абвяшчэньня БНР.

Што да ўладаў, дык тыя пакуль што не зьбіраюцца сядаць за стол перамоваў з дэмакратычнай апазыцыяй адносна правядзеньня Эўрапейскага маршу. Прынамсі, ад **Натальлі Пяткевіч** адказу няма дагэтуль.

**Алесь Кудрыцкі**

# Тадэвуш Кандрусевіч: Мне вельмі хочацца сустрэцца з уладыкам Філарэтам

Першае інтэрвію новага кіраўніка беларускага Касьцёлу мітрапаліта **Тадэвуша Кандрусевіча**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Наша Ніва»: Уладыка, ці з Вашым прыходам варта чакаць нейкіх рэформаў у беларускім Касьцёле?**

**Тадэвуш Кандрусевіч**: Разумееце, ніколі нельга проста прыйсьці і пачаць праводзіць нейкія рэформы, не заглыбіўшыся да канца ў сутнасьць справы. Збольшага я ведаю, што сёньня ўяўляе сабой беларускі Касьцёл. Я пэрыядычна бываю на Радзіме, сустракаюся зь сьвятарамі і вернікамі. Гэтым летам адслужыў імшы ў Браславе і Гудагаі. Аднак мяне не было тут 16 гадоў, таму я ня ведаю ўсіх падводных цячэньняў, якія існуюць у Касьцёле. Нічога рэзкага і кардынальнага зьмяняць у Касьцёле ня буду — гэта дакладна. Я ведаю, што сёньня каталіцтва ў Беларусі мае трывалы грунт, добрых сьвятароў, актыўную моладзь. Гэта ўсё станоўчыя моманты. Разам з тым, мне вядома, што ў беларускіх касьцёлах не заўсёды хапае належных каталіцкіх выданьняў. У той жа Расеі за час майго там знаходжаньня было выдадзена каля 600 падобных кніжак. Уявіце, калі такі кнігазбор будзе пры кожнай беларускай парафіі — гэта будзе цэлая бібліятэка. Я ведаю, што па сёньняшні дзень няма поўнага Катэхізісу, выдадзенага пабеларуску, няма на нашай мове і дакумэнтаў Другога Ватыканскага сабору і багата чаго яшчэ, таму ў гэтым кірунку праца будзе абавязковая. Будзем працаваць над тым, каб болей суайчыньнікаў адчувала сьвятарскае і манаскае пакліканьне, бо мясцовых сьвятароў не хапае для кожнай парафіі. Буду рабіць усё магчымае, каб не дапускаць пашырэньня ідэяў сэкулярызму і рэлятывізму, якія пачынаюць дамінаваць шмат у якіх краінах сьвету. Буду імкнуцца да дыялёгу з уладамі і праваслаўнай царквой. Мне вельмі хочацца сустрэцца з уладыкам Філарэтам, я буду бліжэйшым часам прасіць аб гэтай сустрэчы. Спадзяюся знайсьці зь ім паразуменьне ў шмат якіх пытаньнях. Ёсьць выраз пра тое, што касьцёл увесь час рэфармуецца, таму зьмены непазьбежныя, але не чакайце іх адразу. Будзем імкнуцца адказваць на запыты вернікаў і часу.

**«НН»: Калі Вы даведаліся пра новае прызначэньне?**

**ТК**: (сьмяецца) У пятніцу і даведаўся, як і ўсе вы. Канечне, інфармацыя была і раней, але гэта пакідаецца за рамкамі любой размовы.

**«НН»: Калі чакаецца Ваш прыезд у Беларусь?**

**ТК** : У Менску буду ў аўторак, але гэты візыт працягнецца ўсяго некалькі дзён. Пасьля я паеду ў Калінінград, Санкт-Пецярбург, каб разьвітацца зь людзьмі, якія доўгі час атачалі мяне ў Расеі. У Маскве я меў сустрэчу з паслом Беларусі ў Расеі сп. Даўгалёвым. Хацеў расказаць, што мяне прызначылі новым менска-магілёўскім біскупам. Ён добра мяне прыняў, сказаўшы, што ведае пра гэтае прызначэньне. А таксама ўсьцешыўся тым, што ў галаву касьцёлу ставяць ураджэнца Беларусі. Думаю, што канчаткова ў Менск я перабяруся толькі пасьля 10 лістапада.

**«НН»: Зь якімі думкамі і настроем Вы вяртаецеся на Радзіму, пасьля 16 гадоў, якія пражылі ў Расеі?**

**ТК**: У нас жа, як у войску, куды прызначыць Папа, туды і едзем. Напэўна, што чакаў і марыў аб гэтым ад таго моманту, як зьехаў у Расею. Памню, калі зьяжджаў, то бачыў зь цягніка Чырвоны касьцёл, тады мне думалася, ці хутка давядзецца тут правесьці службу як беларускі сьвятар. Як высьветлілася, гэтага давялося чакаць цэлых шаснаццаць год. Дом ёсьць дом і з гэтым нічога ня зробіш, на Радзіме чалавек адчувае сябе заўсёды лепш, чым у іншых краях. Таму я з паслухмянасьцю і радасьцю паставіўся да гэтага кроку Папы.

**«НН»: Гэтымі днямі Вы былі ў Ватыкане, ці мелі там сустрэчу з Папам?**

**ТК** : Так, сапраўды быў, але з Папам не сустракаўся, у мяне былі там зусім іншыя справы.

**«НН»: Пасьля столькіх гадоў працы ў Маскве не шкада пакідаць Расею?**

**ТК**: Канечне, гэта нялёгка рабіць. Я ўклаў у разьвіцьцё Касьцёлу Расеі вельмі шмат сілаў, здароўя, энэргіі. Памятаю, калі я толькі прыехаў у Маскву, то ў Расеі было ўсяго дзесяць парафіяў, восем ксяндзоў і два касьцёлы. Цяпер жа, калі зьяжджаю, мы маем ужо 230 парафіяў, інстытут тэалёгіі, шыкоўную катэдру ў сталіцы, шмат чаго яшчэ. Гэта ўсё давалася вельмі вялікай працай і верай. Да нас прыяжджалі сьвятары з усяго сьвету — Ямайкі, Індыі, — яны ўсе вельмі добрыя людзі, але ім трэба было тлумачыць спэцыфіку краіны, у якую яны прыехалі працаваць. І гэта было нялёгка. Былі цяжкія адносіны зь сьвецкімі ўладамі, Расейскай праваслаўнай царквой, нават мясцовым насельніцтвам. З усім гэтым трэба было нешта рабіць. Шмат працаваў, ні на кога не наракаючы. Здаецца, што нейкіх вынікаў усё ж дабіўся. Я пакідаю ў Расеі частку свайго сэрца, тут я сустрэў шмат разумных і добрых людзей, але ж сьвятарскае пакліканьне вымагае вяртацца.

**«НН»: Пра што Вы будзеце казаць людзям падчас імшы ў сераду ў Катэдры?**

**ТК**: Цяжкое пытаньне, пра якое я яшчэ ня думаў. Збольшага гэта будзе залежаць ад таго, якая эвангеліка будзе ў касьцёле ў сераду. Канечне, я павітаю вернікаў, якія зьбяруцца ў храме. Папрашу шмат маліцца за касьцёл, Папу, за сябе. Буду казаць пра тое, што нам трэба быць такім, якімі нас хоча бачыць Езус і ўсяляк імкнуцца да гэтага.

**Гутарыў**
**Зьміцер Панкавец**

# «А яны зьніклі, іх няма»

Намесьнік міністра эканомікі намякае на перагляд пагадненьня пра «Белтрансгаз».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Намесьнік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур **(на фота)** мяркуе, што з продажам «Газпрому» 50% акцыяў «Белтрансгазу» могуць узьнікнуць пытаньні. Пра гэта ён заявіў у інтэрвію «Московским новостям».

«Падзяліць акцыі «Белтрансгазу» 50 на 50 наўрад ці ўдасца, бо яшчэ ёсьць невялікая частка індывідуальных уласьнікаў, а яны зьніклі, іх няма», — паведаміў намесьнік міністра эканомікі.

«Таму можа ўзьнікнуць сытуацыя, пры якой нехта канечне будзе валодаць на адну сотую або тысячную больш, а гэта ўжо не парытэт», — мяркуе намесьнік міністра.

Нагадаем, што дамова аб продажы «Газпрому» 50% акцыяў «Белтрансгазу» за 2,5 млрд даляраў прадугледжвае, што цягам чатырох гадоў «Газпром» будзе набываць па 12,5% акцыяў «Белтрансгазу».

# Трывожны дэфіцыт

Багданкевіч чарговы раз прагназуе эканамічны каляпс.

Выступаючы на прэс-канфэрэнцыі да «Эўрапейскага маршу», былы старшыня Нацыянальнага банку Беларусі Станіслаў Багданкевіч заявіў аб магчымасьці хуткага эканамічнага каляпсу ў краіне.

«Беларусь на мяжы сур’ёзнага фінансавага крызысу. Пакуль вонкава гэта ня вельмі праяўляецца. Найбольш трывожным паказчыкам у эканоміцы зьяўляецца дэфіцыт гандлёвага балянсу. Штогод ён складае 2 мільярды даляраў. І гэта робіцца ў той час, калі беларуская эканоміка працягвае сядзець на расейскіх субсыдыях. МВФ падлічыў, калі ў Беларусі ня будуць праведзеныя рэформы, то дэфіцыт плацёжнага балянсу штогод будзе расьці на 7—8% ад узроўню ВУП. Да 2011 году гэты дэфіцыт пераадолее плянку 50% ВУП. Золатавалютныя рэзэрвы краіны збольшага віртуальныя, бо павялічваюцца за кошт пазыкаў ад расейскага боку», — адзначыў С.Багданкевіч.

Варта адзначыць, што гэта ўжо ня першыя пэсымістычныя прагнозы Станіслава Багданкевіча адносна працы беларускай эканомікі.

**Зьміцер Панкавец**

# Расея ўдарыць па беларускіх малаказаводах 1 лістапада

Рассельгаснагляд з 1 лістапада ўвядзе новы парадак імпарту прадукцыі жывёлагадоўлі зь Беларусі. Пастаўкі будуць дазволеныя толькі тым заводам, якія былі праатэставаныя і атрымалі права на экспарт.

Меркавалася, што гэта адбудзецца з 1 кастрычніка, аднак цяпер крайнюю дату перанесьлі на 1 лістапада.

Цяпер у Беларусі перабываюць 10 супрацоўнікаў Рассельгаснагляду, якія «абсьледуюць» 57 беларускіх малаказаводаў.

**МБ**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## З КАМЭНТАРОЎ НА NN.BY

**Гэтая праверка — проста ацэнка актываў**

Размаўляў з кіраўнікамі некаторых малаказаводаў, на якіх ужо былі гэтыя кантралёры. Ад агляду заводаў яны ў шоку. У добрым сэнсе. Не чакалі такога. Але ці дадуць права на экспарт у Расею, цяжка сказаць. Ад іх нічога не залежыць. Рашэньне будзе прымацца ў Крамлі. Ёсьць думка, што гэтая праверка — проста ўдакладненьне з боку Расеі актываў нашых прадпрыемстваў, іх ацэнка дзеля магчымай куплі.

**wint**

**«Расейскі аналяг гэтага прадукту быццам вада падфарбаваная»**

У Маскве даволі складана знайсьці беларускае малако. Заўсёды шукаю, бо расейскі аналяг гэтага прадукту быццам бы вада падфарбаваная, а кошт у два разы вышэйшы (расейскае 22–31 RUR, наша 13–16 RUR).

Адзінае сталае месца нашага малака ў «Діксі» — сетцы крамаў для бедных, дзе заўсёды можна знайсьці малако вытворчасьці віцебскага ці магілёўскага малаказаводаў.

А тое, што да актываў прыцэньваюцца, дык гэта дакладна, бо манапалісты цэнтральнага рэгіёну, кампаніі Unimilk і Vimbilldan б’юцца за кожны заводзік і за кожную крамку, пагатоў што выдаткі на лягістыку зь беларускіх прадпрыемстваў амаль роўныя выдаткам зь якой–небудзь Белгародчыны ці Волагды. У Беларусі сыравіна пад бокам, а ў Расеі малочны статак за апошнія 15 гадоў зьменшыўся ў 10 разоў, а малака менш піць ня сталі, адсюль і высокія кошты.

Таму і трэба пільнаваць, каб нашыя прадпрыемствы не былі недаацэненыя падчас прыватызацыі, якая мае адбыцца.

**jez jerzy**

# У справе продажу VELCOM рана ставіць кропку

Такое меркаваньне падае расейскі «Коммерсант» са спасылкай на крыніцы ў ААТ «Вымпелком».

Паводле інфармацыі «Коммерсанта», ААТ «Вымпелком» з траўня вядзе перамовы з кіпрскай кампаніяй SB-Telecom пра набыцьцё 49% акцыяў МЛС. Але прынцыповага рашэньня не дасягнута.

Кіраўніцтва «Вымпелкома» не хавае сваёй зацікаўленасьці ў беларускім рынку мабільнай сувязі і гатовае скарыстацца зь любой магчымасьці, каб замацавацца ў Беларусі. Ускосным пацьверджаньнем таго, што расейская кампанія мае папярэднія дамоўленасьці аб набыцьці МЛС, «К» называе выхад на беларускі рынак рэклямнага партнэра «Вымпелкома» — групы маркетынгавых камунікацыяў BBDO.

Цікава, што Telecom Austria (TA) бачыцца расейцам як яшчэ адзін прэтэндэнт на набыцьцё долі VELCOM. Тым часам беларускія СМІ два тыдні таму паведамілі пра завяршальную стадыю перамоваў паміж кампаніямі «Telekom Austria» і братамі Самаві, уладальнікамі кіпрскай кампаніі «SB Telecom»

Расейскія экспэрты адзначаюць моцны ўплыў дзяржавы на беларускі сотавы рынак. Старшы кансультант IKS-Consulting Аляксей Данілін мяркуе, што перамога той прэтэндэнт на долю МЛС, што найбольш пасьпяхова прасунецца ў перамовах з урадам Беларусі.

Па-ранейшаму, усе гешэфты адбываюцца ў таямніцы.

**Сямён Печанко**

## Згодна з рашэньнямі прэзыдэнта

На базе «Крыніцы» ўтвораць піваварны холдынг без замежнага ўдзелу. Ініцыятар — «Прыёрбанк».

У яго, акрамя «Крыніцы», маюць увайсьці «Белсолад» і «Берасьцейскае піва». Галіну прапаноўваецца разьвіваць за кошт крэдытаваньня, а не за кошт продажу замежным інвэстарам.

Апавядаючы пра гэта, «Белорусы и рынок» прыводзяць досьвед літоўскіх півавараў. Літва пэўны час таксама не адпускала з рук акцыі айчынных піваварняў, аднак рэзкае падзеньне вытворчасьці і экспансія замежных бровараў змусіла літоўскі ўрад пусьціць замежных інвэстараў. Сёньня якаснае ўласна літоўскае піва паступова выцясьняе замежнае.

**СП**

## Ці вырасьце камуналка на 25% з 1 кастрычніка?

Насельніцтва мусіла сёлета аплачваць выдаткі за паслугі ЖКГ на 41%. Аднак, кажа намесьнік міністра жыльлёва-камунальнай гаспадаркі Сяргей Сушко, па стане на верасень удалося атрымаць толькі 34 %.

Да канца году адставаньне ад заданьня «найхутчэй ня будзе выпраўлена», паведаміў намесьнік міністра на прэс-канфэрэнцыі, прысьвечанай падрыхтоўцы ЖКГ да працы зімой.

Нарыхтавана 32 тыс. т. мазуту, што складае 65% ад заданьня, 759 тыс. кубамэтраў дроваў (60% ад плянаванага).

Дарэчы, да 2012 г. доля мясцовых відаў паліва ў паліўна-энэргетычным балянсе ЖКГ павінна скласьці да 50%.

Сп. Сушко паведаміў, што бліжэйшым часам не чакаецца рэзкага росту тарыфаў на паслугі ЖКГ. Ён не пацьвердзіў распаўсюджаную некаторымі СМІ інфармацыю пра ініцыятыву яго ведамства аб магчымым падвышэньні тарыфаў з 1 кастрычніка на 25%: «Гэтым займаецца Міністэрства эканомікі».

Гаворачы пра выкананьне Дырэктывы № 3, намесьнік міністра зазначыў, што на сёньня лічыльнікі выкарыстаньня вады ўсталяваныя ў 41% кватэраў.

**СП**

## СЬЦІСЛА

### «Нёман» пачаў выпуск «Lucky Strike»

ЗП «Брытыш-Амерыкан Табака Трэйдынг Кампані» і Гарадзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» пачалі вытворчасць цыгарэтаў міжнароднай маркі «Lucky Strike». Гэта першая марка найвышэйшага цэнавага сэгмэнту, выраблена БАТ у Беларусі. Таксама мяркуецца выпуск цыгарэтаў «Kent».

### Да $3 млрд інвэстыцый у здабычу бурага вугалю

18 верасьня ААТ «Белдзяржхімпрам» і кампанія Polar Stars Group S.A. (Люксембург) падпісалі інвэстыцыйныя дамовы на рэалізацыю праекту «Арганізацыя глыбокай перапрацоўкі бурых вуглёў».

### Дэфіцыт перавысіў $2 млрд

У студзені—ліпені асноўным гандлёвым партнэрам краіны заставалася Расея — 48,4% аб’ёму тавараабароту, Нідэрлянды (перапродаж нафты) — 8,9%, Украіна і Нямеччына — па 5,4%, Польшча — 3,8%, Брытанія (таксама рээкспарт нафты) — 3,2%, Кітай — 2,5%, Латвія — 2%, Літва — 1,7%.Экспарт склаў 12 млрд 881,6 млн (на 16,5% больш), імпарт — 14 млрд 929,4 млн (на 23,9%). Сальда адмоўнае — 2 млрд 47,8 млн даляраў.

### Урад спрабуе стрымаць цэны на алей

Рост попыту на этанол у ўсясьветным маштабе падвысіў цэны збожжа і алею. Урад спрабуе зьмякчыць наступства гэтага для раздробнага гандлю. Пастанова Мінэканомікі абмежавала гандлёвыя надбаўкі на алей.

### У Менску плянуюць трэцюю лінію мэтро

Яна будзе мець працягласьць у 17 км і 14 станцыяў. Яна пройдзе ад Курасоўшчыны да Зялёнага Лугу. На першую лінію перасядка на «Плошчы Леніна», на другую — на «Фрунзэнскай». Будаўніцтва пачнецца з 2010 г.

### Тэмпы росту ВУП складаюць 8,6 працэнта

Такі вынік дзевяці месяцаў.

### Дзесяць ЦЭЦ на абрэзках

У Беларусі да 2010 г. будзе функцыянаваць 10 міні-ЦЭЦ на мясцовых відах паліва. Пра гэта паведаміў прэм’ер Сяргей Сідорскі.

# Беларусь і Кітай пачалі перамовы аб будаўніцтве АЭС

«Перамовы між беларускім і кітайскім бакамі наконт будаўніцтва ў вашай краіне атамнай станцыі толькі пачаліся, таму нічога канкрэтнага я сказаць пакуль не магу. Я ведаю толькі, што беларускі бок зацікаўлены ў нашых паслугах», — заявіў на прэс-канфэрэнцыі пасол Кітаю У Хунбінь.

Яшчэ было адзначана, што кітайцы зацікаўленыя ў інвэстыцыях у цэментны завод і фабрыку па вырабе ДСП.

У Хунбінь таксама паведаміў, што ў Беларусі вучыцца 2000 кітайскіх студэнтаў.

**Зьміцер Панкавец**

# Эўропа гатовая, але ня можа

Эўракамісар па замежных сувязях: «Мы гатовыя пачаць зь Беларусьсю паўнавартаснае супрацоўніцтва». Хаўер Салана: «Без вызваленьня палітвязьняў ня можа быць супрацы ў энэргетыцы».

«Мы гатовыя пачаць зь Беларусьсю паўнавартаснае супрацоўніцтва», — заявіла камісар Эўрасаюзу па замежных сувязях і палітыцы добрасуседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр 18 верасьня на сустрэчы зь беларускімі журналістамі ў Брусэлі. Б.Фэрэра-Вальднэр падкрэсьліла, што ўсе прапановы ЭС выкладзены ў дакумэнце «Што Эўрасаюз можа даць народу Беларусі».

Пры гэтым камісар ЭС падкрэсьліла, што самымі важнымі ўмовамі для пачатку супрацоўніцтва зьяўляюцца вызваленьне палітвязьняў, магчымасьці для свабоднай працы СМІ, правядзеньне свабодных і сумленных выбараў.

«За час, што прайшоў з моманту прадстаўленьня дакумэнту, мы не заўважылі ніякай рэакцыі ў адказ з боку беларускіх уладаў. А мы ня можам працаваць з апошнім дыктатарскім рэжымам у Эўропе», — патлумачыла яна.

Амаль тое самае паўтарыў у часе візыту ва Ўкраіну Хаўер Салана, Вярхоўны камісар ЭС па агульнай замежнай палітыцы і палітыцы бясьпекі: «Палітычныя адносіны могуць будавацца толькі на супольных эўрапейскіх каштоўнасьцях. Пакуль Беларусь ня вызваліць палітвязьняў, супрацоўніцтва ў палітычнай сфэры не прадстаўляецца магчымым, – заявіў ён. — Мы ўсе заклапочаныя праблемамі энэргетычнай бясьпекі. Аднак палітычная сытуацыя ў Беларусі не дае нам магчымасьці разьвіваць паўнавартаснае супрацоўніцтва ў энэргетычнай сфэры».

**МБ**

## СЬЦІСЛА

### 39 чалавек у выцьвярэзьніку на «Дажынках»

39 грамадзянаў у стане алькагольнага ап’яненьня паступілі ў Рэчыцкую цэнтральную раённую бальніцу падчас сьвяткаваньня фэстывалю «Дажынкі-2007».

### Самагонны апарат на 5 тонаў брагі сканфіскаваны ў Івейскім раёне

Як паведамілі ў прэс-цэнтры памежных войскаў, у жыхара знайшлі і сканфіскавалі 75 літраў самагонкі, паўтары тоны брагі, а таксама самагонны апарат, што складаецца зь дзьвюх цыстэрнаў на дзьве і пяць тонаў.

### «Белсат» пачне працаваць у дзень правоў чалавека

Незалежны тэлеканал на беларускай мове пачне вяшчаньне 10 сьнежня. Пра гэта паведаміла дырэктарка каналу Агнешка Рамашэўская.

### 10 сутак арышту за 96 сьцягоў Эўрасаюзу

Судзьдзя Партызанскага суду Менску Алена Ціцянкова прызнала дэмакратычнага актывіста Леаніда Навіцкага вінаватым у дробным хуліганстве і пакарала 10 суткамі арышту. 21 верасьня да яго на кватэру прыйшлі супрацоўнікі КДБ і знайшлі 96 сьцягоў Эўрасаюзу, бэйсболкі і майкі з эўрапейскай сымболікай. На яго склалі пратаколы за нецэнзурную лаянку і за падрыхтоўку несанкцыянаванай акцыі.

### «Зялёныя» адышлі ад АДС

Беларуская партыя «Зялёныя» (БПЗ) часова прыпыніла свой удзел у выбарчай кампаніі ў рамках кааліцыі Аб’яднаных дэмакратычных сілаў. Гэта адбылося «зыходзячы з таго, што выбарная сыстэма не зьмянілася ў бок дэмакратызацыі», і таго, што партыя ня можа згадзіцца з шэрагам вылучаных кааліцыяй перадвыбарных патрабаваньняў, у прыватнасьці, з ідэяй прыватызацыі.

### Беларусы будуць плаціць за пэрлюстрацыю ўласнай пошты

Як патлумачылі ў РУП «Белпошта», згодна з Мытным кодэксам паштары мусяць перадаваць усе міжнародныя паштовыя адпраўленьні для мытнага нагляду. Калі адпраўленьні ўскрываюць і заклейваюць назад, то гэтую працэдуру сплачвае адрасат. За нагляд сваёй карэспандэнцыі беларусы вінныя паштарам 2130 рублёў зь ліста.

**МБ; БЕЛТА, БелаПАН, радыё «Свабода»**

# Лукашэнка паабяцаў жорсткае змаганьне за нацыянальныя інтарэсы

Камэнтуе **Аляксандар Класкоўскі.**

На «Дажынках» афіцыйны кіраўнік пасьля доўгай паўзы выказаўся на тэму стасункаў з Расеяй. Адчувалася ўнутраная калізія. З аднаго боку, ня хочацца дражніць гусей у Крамлі. Разам з тым, ілюзіяў няма, і трэба псыхалягічна рыхтаваць электарат да непазьбежнай бітвы за газ.

Таму Лукашэнка хоць і ўзнагародзіў дзяжурным камплімэнтам новага прэм’ера Зубкова (маўляў, валявы чалавек і пісьменны эканаміст), але тут жа зазначыў, што радыкальных зьменаў у двухбаковых дачыненьнях ад гэтага прызначэньня не чакае.

Ну а газавая тэма справакавала жорсткія заявы. Кшталту той, што «Газпром» яўна нажываецца на нашай краіне». Маўляў, даходнасьць практычна такая, як пры пастаўках у Нямеччыну. «Налета яны хочуць падняць цану яшчэ на 15-20%. То бок, даходнасьць у Беларусі будзе для Расеі яшчэ вышэйшай, чым у Нямеччыне. Я ня ведаю, у чым мы так правініліся перад кіраўніцтвам Расеі», — дадаў беларускі кіраўнік.

Эканамісты, мусіць, паспрачаюцца з разьлікамі: усё ж 100 даляраў для нас і 240 для немцаў — розьніца вельмі вялікая, тут на адну толькі адлегласьць, на так званае «плячо» ня сьпішаш. Але халера зь імі, зь лічбамі! Заява мае іншы — псыхалягічны разьлік. Не выпадкова ў параўнаньні фігуруе менавіта тая краіна, у вайне супраць якой некалі «разам гнілі ў акопах». Закранае струны, асабліва ў старэйшых.

Але як ні круці, а немцы плацяць спраўна, і да іх прэтэнзіяў ніякіх. Затое — во дзе сапраўды гістарычныя грымасы! — рэальнасьцю сталі газавыя войны між фармальнымі хаўрусьнікамі.

Вось і цяпер ужо чуюцца далёкія грымоты. Дэкляраваны намер на перамовах з «Газпромам» жорстка прытрымлівацца нацыянальных інтарэсаў. Хаця вынік чарговай калізіі не відавочны. Максымум абяцанага палягае у тым, што «кантракт мы пастараемся пасьпець падпісаць да бою крамлёўскіх курантаў». Няўжо будзе дэжа-вю?

### Цыганкоў: Калі сыдзе і Шэйман, пачнецца новы этап палітыкі

«Сыход Канаплёва яшчэ можна тлумачыць нейкімі асабістымі чыньнікамі, але калі сыдзе і Шэйман, то гэта ўжо будзе канчатковым сьведчаньнем наступленьня чарговага этапу у беларускай палітыцы. Надыходзяць больш жорсткі час, больш жорсткія эканамічныя адносіны, больш жорсткія прафэсіяналы. Канаплёў у гэтым сэнсе ўжо прыносіў мала карысьці».

**Праскі акцэнт, радыё «Свабода»**



**БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ КАМЕНЬНЕМ. Невядомыя складаюць уздоўж дарог гіганцкія надпісы па-беларуску. Таксама яны ў літаральным сэнсе «перакладаюць» расейскамоўныя надпісы. Было «Лес — наше богатство», стала — «Лес — наша багацьце». Было «Лес — лёгкие планеты» — стала «Лес — лёгкія планеты». Робіцца гэта сярод белага дня. Сьведкі кажуць, што для маскаваньня рупліўцы Беларушчыны апранаюцца як дарожныя рабочыя — у аранжавыя камізэлькі.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«Атрымліваць пэнсію павінны тыя, каму яна сапраўды неабходная» Галоўны ідэоляг Алег Праляскоўскі на «Беларуськаліі», куды ён сьпешна прыехаў, пасьля таго як там адбыўся папераджальны страйк супраць адмены льготаў.**

**КАЛЯНДАР**

## Пазьняк: Калі бел-чырвона-белы сьцяг быў прыняты, я страціў прытомнасьць

19 верасьня 1991 году бел-чырвона-белы сьцяг і герб «Пагоня» былі абвешчаныя дзяржаўнымі. У той жа самы вечар сьцяг залунаў над Домам ураду, дзе на працягу дня вяліся спрэчкі паміж дэпутатамі. Тагачасны лідэр БНФ Зянон Пазьняк распавядае, што не хапала голасу-двух, і ён асабіста папрасіў дэпутата-камуніста падтрымаць нацыянальную сымболіку:

«Ён быў у вэтэранскай групе, якая заўсёды галасавала супраць. Я ўзяў яго за руку і папрасіў: «Прагаласуйце за сьцяг і герб дзеля нашай будучыні. Я вас прашу як беларус беларуса». І ён прагаласаваў».

Пазьняк прызнаўся, што калі нарэшце ўбачыў пераможны вынік галасаваньня, то ўпершыню ў жыцьці страціў прытомнасьць ад узрушэньня: «Калі выйшлі, ужо цямнела, але з плошчы не разыходзіліся. Сьпявалі, плакалі, абдымаліся… Пятро Садоўскі сьпяваў у мікрафон беларускія ваярскія песьні».

# Чашыце сушай

Эстонскія ўлады адмовілі ў пракладцы Паўночнаэўрапейскага газаправоду.

Урад Эстоніі адмовіў расейска-нямецкай кампаніі Nord Stream AG праводзіць дасьледаваньні, зьвязаныя з пабудовай Паўночнаэўрапейскага газаправоду, у эстонскай марской эканамічнай зоне. Эстонскі канал ТВ-2 з спасылкай на прэм’ер-міністра Андруса Ансыпа **(на фота)** паведаміў, што ўрад у гэтым аднадушны.

Без дасьледаваньняў няможна падрыхтаваць даклад аб уплыве праекту на прыроду. А без дакладу, згодна з эстонскім заканадаўствам, няможна будаваць.

Nord Stream AG прасіла Эстонію дазволіць дасьледаваньні ў эстонскай зоне Балтыйскага мора, а пасьля пракладку



там трубы, бо дно ў фінскай зоне аказалася няроўным і непрыдатным. Фінскі ўрад разглядае Расею сваім стратэгічным партнэрам і быў за раэлізацыю праекту, але фінскім эколягам удалося давесьці, што пракладка газавай трубы па няроўным дне можа спрычыніцца да гіганцкай катастрофы.

«Эстонія ня можа проста так сказаць «не» газаправоду», — далікатна тлумачыць міністар замежных справаў Эстоніі Урмас Паэт. Прэм’ер Ансып недвухсэнсоўна намякнуў, што сытуацыю ўскладніла леташняя санкцыі Масквы, уведзеныя пасьля пераносу помніка чырвонаармейцам з цэнтру Таліну на вайсковыя могілкі.

Тады Расея разгарнула шумную кампанію, а Ансыпа абвінавачвалі ў нэафашызьме.

«Расея сама настроіла грамадзкую думку супраць газаправоду, акрэсьліваючы Эстонію як краіну паразытарную, якая жыве з транзыту тавараў між Расеяй і Захадам, — заявіў Ансып, які тады заняў цьвёрдую пазыцыю, не саступіў націску Расеі і выслаў з краіны грамадзянаў Расеі, якія падбухторвалі маніфэстантаў. — Наша грамадзкасьць стваіцца да праекту газаправоду па дне мора вельмі адмоўна, але мы ня можам прымаць рашэньняў, кіруючыся толькі эмоцыямі. Мусім узважыць усе аспэкты справы, у тым ліку замежную палітыку і ахову навакольканага асяродзьдзя».

Польшча, Латвія, Літва, а ўскосна таксама Беларусь і Ўкраіна выступаюць у падтрымку адмоўнага рашэньня Эстоніі. Балтыйскія краіны і Польшча прапануюць, каб газапровад пайшоў сушай. Гэта пазбавіла б Расею і яе нямецкіх лабістаў інструмэнтаў энэргетычнага шантажу Цэнтральнай Эўропы. Калі «Газпром» спрабаваў адключыць газ Беларусі ці Ўкраіне, тыя ў адказ папросту перакрывалі транзытны паток, змушаючы расейскіх манапалістаў даваць задні ход.

**МБ**

# Выбраным курсам

Перастаноўкі ва ўрадзе Расеі ўзмацнілі пазыцыі лібэралаў—рыначнікаў і выразьнікаў інтарэсаў расейскага капіталу.

Заходняя прэса адзначае ўзмацненьне пазыцыяў лібэралаў у расейскім урадзе.

The Financial Times надрукавала артыкул пад назвай «Ад перастановак у расейскім урадзе выйгралі рэфарматары». Газэта піша: «Міністар фінансаў Аляксей Кудрын быў павышаны ў панядзелак да віцэ-прэм’ера, што варта разумець як узмацненьне пазыцыяў урадавых рэфарматараў».

Аб звальненьні з кабінэту кіраўніка МЭРТ Германа Грэфа FT піша, што, па-першае, «Грэф неаднаразова даваў зразумець, што зьбіраецца сысьці з ураду», і, па-другое, лічыць пазытыўным той факт, што месца міністра заняла ягоная намесьніца, кіраўнік Цэнтру стратэгічных распрацовак Эльвіра Набіуліна, якую газэта таксама залічвае да лібэралаў.

Агенцыя Bloomberg піша пра пераемнасьць курсу сыходзячага Германа Грэфа, называючы ягоную пераемніцу ва ўрадзе «лібэралам і здольным рэфарматарам». Выданьне падзяляе меркаваньне Грэфа пра тое, што эканамічны курс Расеі ня зьменіцца, пакуль пры ўладзе застаецца Пуцін.

Die Welt, наадварот, лічыць прызначэньне Эльвіры Набіулінай на пасаду кіраўніка Мінэканомразьвіцьця Расеі «недальнабачным», як і прызначэньне Тацяны Голікавай на пасаду міністра аховы здароўя і сацыяльнага разьвіцьця. Як адзначае нямецкая газэта Die Welt, абедзьве жанчыны непапулярныя сярод насельніцтва.

Месца Грэфа заняла кіраўнік Цэнтру стратэгічных



**Аляксей Кудрын.**

распрацовак Эльвіра Набіуліна. З 2000 да 2003 г яна працавала першым намесьнікам Грэфа, заўсёды лічылася ягонай правай рукой і суаўтаркай праектаў рэформаў.

Сам Грэф лічыць прызначэньне Набіулінай удалым кадравым рашэньнем. Набіуліна — чалавек «вельмі празрысты і выключна сумленны», — запэўніў Грэф. Камэнтуючы сваю адстаўку, былы міністар заявіў, што «чыноўнікі павінны час ад часу мяняцца. Восем гадоў для пасады кіраўніка МЭРТ – гэта значны тэрмін». Сам Грэф плянуе сысьці ў бізнэс.

**МБ**

# Манахі супраць генэралаў



М'янма: аранжавая рэвалюцыя ў «залатым Гулагу».

Здавалася, сьвет ужо зусім забыўся на гэтую краіну. За 45 год кіраўніцтва вайсковай хунты М'янма (былая Бірма)ператварылася ў «выспу стабільнасьці» ў цэнтры Паўднёва-Ўсходняй Азіі. Як і ў выніку зь Беларусьсю, заходнія мэдыі толькі зрэдку зьвярталі ўвагу на «залаты Гулаг» — неверагодна прыгожую краіну будысцкіх пагадаў, якой кіруе брутальны рэжым.

І вось, нечакана для ўсіх, у краіне выбухнула аранжавая рэвалюцыя. Яе фарба — гэта колер вопраткі будысцкіх манахаў, якія наважыліся распачаць шэсьці пратэсту. Колькасьць дэманстрантаў расьце ў геамэтрычнай прагрэсіі. У пачатку верасьня на вуліцы выходзілі дзясяткі чалавек, потым — сотні, пасьля — тысячы. У нядзелю мітынгавалі 10—20 тысячаў чалавек, праз дзень — ужо 50 тысячаў. Беларусь ды М'янма — вельмі розныя краіны, але падабенствы нашых праблемаў уражваюць. У Бірме таксама ўлада лічыць правільнымі для разьвіцьця краіны абмежаваньне свабодаў, здушэньне нацыянальных меншасьцяў і нагнятаньне варожасьці да Захаду.

## Маральная моц

У М'янме каля 400 000 будысцкіх манахаў. Практычна кожная сям'я мае роднага, які сышоў у будысцкі манастыр. Пашана да манахаў проста бязьмежная. Той факт, што манахі афіцыйна назвалі хунтыстаў ворагамі народу і заклікалі «назаўжды выгнаць вайсковую дыктатуру з краіны», мае вельмі вялікую маральную вагу.

Цалкам бяззбройныя, будысцкія манахі вельмі лёгка паказваюць вайскоўцам, хто насамрэч мае духоўную перавагу. Паводле канонаў будызму, манахі павінны кожную раніцу атрымаць свой хлеб на дзень празь міласьціну. Але яны адмаўляюцца браць яе ў вайскоўцаў і членаў іх сем'яў. Фактычна, хунту адлучылі ад рэлігіі. Галоўная мэта — зрабіць так, каб вайскоўцы ў малых чынах адвярнуліся ад свайго кіраўніцтва. Акрамя гэтага, манахі заклікалі бірманцаў штодня маліцца цягам 15 хвілінаў на ганках сваіх дамоў на знак салідарнасьці.

Жыхары краіны цішком кажуць, што хунта вызначаецца ня толькі сваім цынізмам, але і забабонамі. Галоўны з трох генэралаў, 74-гадовы Соў Монг, рэгулярна кансультуецца з астролягамі і нібыта пабойваецца крыўдзіць манахаў, каб не наклікаць на сябе гнеў нябёсаў.

## Незалежнасьць без свабоды

Будысцкія манахі ўжо былі каталізатарамі пратэстаў у каляніяльныя часы. У 1886—1948 гг. М'янма належала Вялікай Брытаніі. Каланізатары зьняважліва ставіліся да бірманскай культуры. Гэтак, брытанцы ўпарта адмаўляліся здымаць абутак пры ўваходзе ў будысцкія храмы. Менавіта манахі зрабіліся рухавіком змаганьня за незалежнасьць М'янмы, паказваючы прыклады патрыятызму, пакутніцтва і сілы волі. Калі зьняволеным за свае палітычныя погляды рэлігійным дзеячам забаранілі насіць сваю традыцыйную вопратку, манах У Вісара абвясьціў галадоўку і трымаў яе 163 дні — да сьмерці. Гісторыя пазьдзекавалася з брытанцаў: сумна вядомая турма Інсэйн, пабудаваная каланізатарамі для палітзьняволеных, выкарыстоўваецца ваеннай хунтай у тых самых мэтах. А Вялікая Брытанія сёньня — адна з тых краінаў, якія найбольш актыўна ціснуць на ўрад М'янмы, патрабуючы дэмакратызацыі.

У каляніяльныя часы М'янма была дужа багатым краем, найперш дзякуючы сваім плянтацыям рысу, дрэваапрацоўцы, здабычы каштоўных камянёў ды нафты. Атрымаўшы незалежнасьць у 1948 г., краіна згубіла дэмакратыю ў 1962 г., калі ў краіне адбыўся ваенны пераварот. М'янма збочыла на ўсеяны чалавечымі косткамі «бірманскі шлях да сацыялізму», які ўзбагаціў кіраўні-

**Адпачынак у дыктатуры**

М'янма зь яе залатымі пагадамі і цудоўным узьбярэжжам падаецца шыкоўнай краінай для турызму. Ці варта ехаць туды на адпачынак? Заходнія турыстычныя выданьні, у тым ліку «Lonely Planet», адна з самых знакамітых кнігаў-гідаў, адкрыта інфармуюць чытача пра ўсе асаблівасьці бірманскага рэжыму, і прапануюць турысту асэнсавана зрабіць выбар на карысьць ці супраць паездкі ў азіяцкую дыктатуру. Галоўны аргумэнт «супраць» — заклік Аунг Сан Су Чжы да турыстаў байкатаваць краіну. Галоўны аргумэнт «за» — трэба даваць жыхарам М'янмы зарабіць сабе на хлеб і несьці ім інфармацыю з-за мяжы, а па вяртаньні расказваць на радзіме праўду пра бірманскае жыцьцё. Для тых турыстаў, якія ўсё-такі вырашылі паехаць у М'янму, даюцца адмысловыя парады як выдаткоўваць грошы, каб яны не ішлі ў кішэню генэралаў (галоўная парада — карыстацца прыватнымі паслугамі і плаціць гатоўкай).

коў, а народ прывёў да галечы. Вайсковая дыктатура бязьлітасна задушыла дэмакратычныя пратэсты пры канцы 80-х, расстраляўшы каля трох тысячаў чалавек. Але ціск апазыцыі быў настолькі моцным, што ўрад мусіў правесьці ў 1990 г. першыя за амаль трыццаць гадоў сапраўды свабодныя выбары ў Народны Сход. Хунта пацярпела прыніжальную паразу — праўладная Партыя нацыянальнага адзінства атрымала вартыя жалю 2% месцаў у парлямэнце. 80% мандатаў заваявала Нацыянальная ліга за дэмакратыю, прагрэсіўная дэмакратычная партыя пад кіраўніцтвам дысідэнткі Аунг Сан Су Чжы, дачкі легендарнага барацьбіта за незалежнасьць краіны.

Хунта анулявала вынікі выбараў і склікала марыянэткавы парлямэнт. Большасьць дэмакратычных дэпутатаў пакінула краіну і сфармавала ўрад на выгнаньні. Аунг Сан Су Чжы пасадзілі пад хатні арышт, дзе яна знаходзіцца дагэтуль. У 1991 г. дысыдэнтка атрымала Нобэлеўскую прэмію міру. Абсалютная ізаляцыя ні на кроплю ня зьменшыла яе аўтарытэту ў краіне і за яе межамі.

## Сакрэт генэралаў

Бірманскія генэралы «праславіліся» ня толькі падаўленьнем дэмакратыі і расстрэламі апазыцыйных мітынгаў. Паводле зьвестак праваабарончых арганізацыяў, асаблівасьцю рэжыму зьяўляецца выкарыстаньне прымусовай працы (у тым ліку дзяцей), а таксама сэксуальныя злачынствы — сыстэматычныя згвалтаваньні і сэксуальнае рабства для абслугоўваньня вайсковага кіраўніцтва. Вайсковы рэжым запляміўся таксама этнічнымі чысткамі, стварэньнем ізаляваных лягераў-пасяленьняў для «непажаданых» нацменшасьцяў.

ЗША і ЭС наклалі на М'янму шматлікія эканамічныя санкцыі і эмбарга



Дысыдэнтка Аунг Сан Су Чжы доўгія гады пад хатнім арыштам.

> Найменшае зьмякчэньне рэжыму паслабляе путы на руках народу.

на гандаль зброяй. Яе, як і Беларусь, пазбавілі гандлёвых прэфэрэнцыяў ЭС. Часткова гэтая палітыка дае плён. Бірманскі рэжым усяляк заахвочвае замежныя інвэстыцыі ў краіну, аднак офісныя хмарачосы ў Янгоне стаяць напаўпустымі. Разам з тым, заходні бізнэс не цураецца брудных гешэфтаў, вынаходзячы складаныя схемы, каб абыходзіць абмежаваньні. Гэтак, францускі энэргаканцэрн Total S.A. зьяўляецца апэратарам газаправоду ў М'янме, на будаўніцтве якога выкарыстоўвалася рабская праца. Акрамя гэтага, адсутнасьць заходняй канкурэнцыі грае на карысьць «вялікім сябрам» М'янмы — Кітаю, Індыі ды Расеі, якія ахвотна інвэстуюць у эканоміку дыктатуры і абараняюць хунту на міжнародным узроўні. У 2006 г. Расея і Кітай наклалі вэта на праект рэзалюцыі Рады Бясьпекі ААН, у якім меркавалася заклікаць улады М'янмы зьмякчыць рэпрэсіі і вызваліць палітзьняволеных.

Аўтарытарныя Кітай ды Расея ўкладаюць грошы ў дыктатарскую М'янму яшчэ і з разьлікам, каб хунта мела сродкі на закуп зброі — у тых самых краінаў-інвэстараў. М'янма знаходзіцца ў першай пятнаццатцы краінаў сьвету паводле аб'ёмаў выдаткаў на войска. Пікантная акалічнасьць: паводле зьвестак Стакгольмскага міжнароднага інстытуту дасьледаваньня праблемаў міру, дэмакратычная Ўкраіна зьяўляецца адным з найбуйнейшых пастаўшчыкоў зброі ў М'янму. Атрымліваецца зачараванае кола «грошы — зброя — грошы», разарваць якое звонку практычна немагчыма.

## Пачатак канца дыктатуры

Тое, што цяпер адбываецца ў М'янме — клясычны пачатак канца дыктатуры. «Бірманскі шлях да сацыялізму» ператварыў М'янму ў адну з самых бедных краінаў у рэгіёне. Трацінa бірманскіх дзяцей недаядаюць. Гаспадарка ў стагнацыі. Зразумеўшы, што рынкавая гаспадарка працуе больш эфэктыўна за цэнтралізаваную, генэралы пачынаюць паступовую лібэралізацыю, заахвочваюць замежныя інвэстыцыі, спрабуюць разьвіваць турызм. Інвэставаць у дыктатуру ахвотнікаў вобмаль, таму робяцца сымбалічныя крокі да дэмакратызацыі — такія, як вызваленьне 40 палітвязьняў сёлета ў студзені. Здаецца —драбязa, але найменшае зьмякчэньне рэжыму паслабляе путы на руках народу. А калі да гэтага дадаецца яшчэ і рост цэнаў (цяперашнія пратэсты справакавала падаражэньне бэнзіну ўдвая, газу — у пяць разоў), то жаданьне скінуць кайданы робіцца невыносным. Людзям жыць робіцца цяжэй, а страх меншае. Вынік — выбух.

Як бы ні скончыліся сёлетнія пратэсты ў М'янме, яны паказваюць, наколькі важна для дэмакратычнага вызвольнага руху бачыць перад сабой абсалютныя маральныя аўтарытэты — такія, як будысцкія манахі ці дысыдэнтка Аунг Сан Су Чжы. Здавалася, нацыя зусім скарылася, але раптам зрывае нейкі кляпан — і мы бачым на вуліцах дзясяткі тысячаў людзей. Сапраўды, усе дыктатуры — блізьняты, бо лёгіка чалавечага імкненьня да свабоды і справядлівасьці ўнівэрсальная.

**Алесь Кудрыцкі**

### М'янма ці Бірма?

«М'янма» ды «Бірма» — гэта амаль як «Беларусь» ды «Белоруссия». На мове тамтэйшага народу назва краіны гучыць як «М'янма». Назоў «Бірма» прыжыўся за каляніяльным часам — так яго пачула ангельскае вуха. Як і многія іншыя дыктатарскія рэжымы, сутыкнуўшыся з эканамічнымі праблемамі, хунта з сацыялізму кінулася ў нацыяналізм, запатрабаваўшы ў 1989 г. называць краіну ня Бірмай, а М'янмай, а сталіцу краіны — не Рангонам, а Янгонам (падобна да таго, каб Лукашэнка пераназваў Мінск у Менск). Многія англамоўныя мэдыі, аднак, дагэтуль называюць краіну Бірмай, не жадаючы мяняць свае звычкі.

# Пакараньне дыктатара

Перад судом — Фухіморы. Ён быў насуперак канстытуцыі абраны на трэці тэрмін, але скончыць свае дні ў турме. Піша **Сяргей Богдан.**

У пятніцу Чылі пастанавіла выдаць Пэру колішняга аўтарытарнага кіраўніка гэтай краіны Альбэрта Фухіморы. Пэруанскае правасудзьдзе абвінавачвае яго ў парушэньнях правоў чалавека і карупцыі падчас знаходжаньня на прэзыдэнцкай пасадзе ў 1990—2000 гг.

Рашэньне чылійскага суду пра выдачу Фухіморы будзе мець сур’ёзныя, сапраўды глябальныя наступствы. Ва ўсім сьвеце былыя кіраўнікі дзяржаваў дагэтуль зазвычай пазьбягалі выдачы на радзіму, нават калі паміж адпаведнымі краінамі існавала дамова аб экстрадыцыі. У скрайнім выпадку іх судзілі спэцыяльнымі трыбуналамі, звычайна пасьля папярэдніх палітычных перамоваў паміж урадамі. Выключным ёсьць ужо сам факт таго, што чылійскі суд усур’ёз паставіўся да звароту пэруанскага боку, і чылійскія судзьдзі разглядалі справу былога прэзыдэнта суседняй Пэру як справу любога паспалітага грамадзяніна.

### Японскі прэзыдэнт Пэру

Сын японскіх імігрантаў, Альбэрта Фухіморы (гэта гішпанскі варыянт яго прозьвішча, па-японску яно гучыць як Фудзіморы) ёсьць супярэчлівай фігурай у пэруанскай палітыцы, што мае як зацятых праціўнікаў, так і палкіх прыхільнікаў. Калі ён нечакана выйграў прэзыдэнцкія выбары 1990 году, атрымаўшы перамогу над вядомым пісьменьнікам Марыё Варгасам Льёсам, ніхто ў Пэру ня ведаў, чаго чакаць ад гэтага чалавека, якому далі мянушку «кітаец».

Аграном і матэматык з адукацыі, Фухіморы заставаўся малавядомай фігурай яшчэ за колькі тыдняў да галасаваньня, а галоўныя яго дасягненьні палягалі ў кіраваньні ўнівэрсытэтам ды кар’еры вядучага тэлешоў.

Ён атрымаў у спадчыну краіну на мяжы эканамічнага каляпсу, якую скаланала партызанская вайна бедных супраць багатых.

Фухіморы ажыцьцявіў радыкальную праграму рынкавых рэформаў, касуючы субсыдыі, татальна прыватызуючы дзяржаўныя кампаніі і зьмяншаючы ролю дзяржавы амаль ва ўсіх сфэрах эканомікі. Гэтая «шокавая тэрапія» ўдарыла па пэруанцах, але паклала канец гіпэрінфляцыі і стварыла грунт для ўстойлівага эканамічнага росту ў другой палове 1990-х.

Фухіморы ўзяўся таксама за левых партызанаў, бо ў выніку грамадзянскай вайны краіна апынулася на мяжы хаосу. Цьвердзячы, што заканадаўчая і судовая галіны ўлады перашкаджаюць спэцслужбам змагацца з партызанамі і наркамафіяй, ён пачаў пашыраць свае паўнамоцтвы. Яго апанэнты тлумачылі гэта спробамі прэзыдэнта пазьбегнуць любых дэмакратычных абмежаваньняў сваёй уладзе, бо пасьля прыходу да ўлады Фухіморы апазыцыйныя партыі захавалі большасьць у парлямэнце.

Таму ў красавіку 1992 году Фухіморы ўчыняе «самапераварот» — скідае ўласны ўрад, каб атрымаць дыктатарскія паўнамоцтвы, распусьціўшы парлямэнт і суды.

На новых выбарах у лістападзе 1992 г. Фухіморы забясьпечвае большасьць для створанай ім партыі. Усталёўваецца аўтарытарны рэжым, замацаваны праз прыняцьце ў кастрычніку 1993 году на рэфэрэндуме новай канстытуцыі, што значна пашырала ўладу прэзыдэнта.

Захапіць уладу ва ўмовах пачатага прэзыдэнтам канстытуцыйнага крызісу рыхтаваліся і вайскоўцы, але капітан дзяржбясьпекі Ўладзімера Мантэсінас перасьцярог Фухіморы, і той схаваўся ў японскім пасольстве.

Фухіморы прызначыў свайго выратавальніка кіраваць службамі бясьпекі, а ягоны рэжым надалей ужо немагчыма ўявіць бязь іх тандэму.

Неўзабаве Фухіморы рэабілітаваўся ў вачах грамадзтва, бо ўрадавыя сілы захапілі прафэсара Гусмана, правадыра галоўнай паўстанцкай арганізацыі — «Прамяністы шлях», па-гішпанску «Сэндэра люміноса». Нягледзячы на міжнароднае асуджэньне ўзурпацыі ўлады прэзыдэнтам Пэру, ягоны рэйтынг у гэтыя гады сягаў 73%, а ў 1995 г. Фухіморы быў пераабраны пераважнай большасьцю галасоў на другі тэрмін, атрымаўшы перамогу над паважным супернікам — колішнім генэральным сакратаром ААН Пэрэсам дэ Куэльярам.

Краіна была ўражаная ягонымі перамогамі над партызанамі, вынікамі бліцкрыгу супраць Эквадору ды ўтаймаваньнем гіпэрінфляцыі.

Сёньня ён з гонарам кажа: «Я кіраваў Пэру цягам 10 гадоў, у адзін з найгоршых пэрыядаў яе гісторыі, ды вырашыў большасьць з праблемаў, што сталі перад краінай, у прыватнасьці, тэрарызму і гіпэрінфляцыі».

### Пэруанская каляровая рэвалюцыя

Ды з часам усё больш пэруанцаў разумела, што брутальныя мэтады спэцслужбаў выкарыстоўваюцца ня толькі супраць паўстанцаў, але і супраць зусім мірных дэмакратычных апанэнтаў сэньёра прэзыдэнта. Грамадзтва абуралася кантролем над СМІ і судамі, а таксама выкарыстаньнем урадавых рэсурсаў для правядзеньня ўласных палітычных кампаніяў Фухіморы.

Ганьбай для прэзыдэнта стаў гучны развод з жонкай, якая пазьней выступіла супраць яго ў палітыцы. Крытыка дзеяньняў Фухіморы асабліва ўзмацнілася пасьля таго, як пэруанскі кіраўнік абвесьціў пра намер выставіць сваю кандыдатуру на недазволены Канстытуцыяй трэці запар прэзыдэнцкі тэрмін у 2000 годзе.

Фухіморы загадзя дамагаецца прыняцьця ў 1996 годзе закону «Аб сапраўднай інтэрпрэтацыі канстытуцыі», што дазваляў пераабрацца на трэці тэрмін,




Альбэрта Фухіморы.

бо, маўляў, прыняцьце новай Канстытуцыі абнуліла тэрміны, і трэці будзе толькі другім. Абы гарантаваць сабе перамогу, ён ідзе на масавыя парушэньні падчас выбараў траўня 2000 году. Адзіны яго супернік на тых выбарах зьняў сваю кандыдатуру, патлумачыўшы гэта тым, што судовая ўлада ніяк не рэагуе на адкрытыя парушэньні выбарчага працэсу. Фухіморы быў абвешчаны пераможцам безальтэрнатыўных выбараў. Апазыцыя не прызнала выбары і пачала ладзіць пратэсты.

Канчаткова ягоныя пляны захаваць уладу разбурыў прыватны тэлеканал «Canal N», што паказаў у верасьні 2000 году відэазапіс перадачы Мантэсінасам апазыцыйнаму дэпутату хабару за пераход у партыю Фухіморы «Пэру-2000».

У выніку скандалу ўсплылі і іншыя самыя розныя цёмныя справы рэжыму — ад сувязі Мантэсінаса з наркамафіяй да ўчыненай за часы Фухіморы стэрылізацыі многіх тысячаў пэруанцаў. У выніку скандалу апазыцыя здолела ўпершыню за восем гадоў апанаваць парлямэнт.

Пэруанскі дыктатар мусіў бегчы з краіны, падаўся на гістарычную радзіму — у Японію. Адтуль ён па факсе падаў у адстаўку, але апазыцыйны кангрэс яе не прыняў дый зьняў Фухіморы з пасады на падставе «маральнага банкруцтва». Пэруанскія падзеі сталі прадвесьнікам пазьнейшых «каляровых рэвалюцыяў».

## Цень дыктатара над Лімай

На гістарычнай радзіме, каб пазьбегнуць выдачы Пэру, ён зноў стаў Фудзіморы дый атрымаў у дадатак да пэруанскага яшчэ і японскае грамадзянства. Аднак праз пяць гадоў раптам прыехаў у Чылі, каб паспрабаваць адтуль узяць удзел у пэруанскіх прэзыдэнцкіх выбарах 2006 году. Гэта было рэальна, бо пэруанская палітыка яшчэ не стабілізавалася, а галоўнай вартасьцю Алехандра Таледа, што зьмяніў Фухіморы на пасадзе кіраўніка дзяржавы, было хіба яго індзейскае паходжаньне ды роўны Фухімораваму папулізм.

Фухіморы ж і цяпер папулярны сярод многіх пэруанцаў, якія кажуць, што цяперашні прэзыдэнт Алан Гарсія зруйнаваў эканоміку за часы свайго першага прэзыдэнцкага тэрміну, а вось «кітаёза» навёў парадак.

Тады ў 2005-м фухімарысты пасьпелі нават стварыць у Пэру сваю партыю, а дзеля фінансаваньня прэзыдэнцкай кампаніі ўзяліся прадаваць адмысловы напой з красамоўнай назвай Fuji-Cola. Аднак неўзабаве па прыезьдзе ў Чылі Фухіморы быў арыштаваны, бо пэруанскія ўлады запатрабавалі ягонае выдачы.

Седзячы пад арыштам у Чылі былы ўладар краіны інкаў не марнаваў часу і ў другі раз ажаніўся з даўняй каханкай, багатай японкай, уладальніцай гатэльнага бізнэсу, дый, абвесьціўшы сябе «апошнім самураем», прапанаваў японцам вырашыць іх праблемы пры дапамозе свайго пэруанскага досьведу. Дзеля таго ён заклікаў іх абраць сябе ў японскі парлямэнт, але не сабраў дастаткова галасоў.

Увесь гэты час былы пэруанскі дыктатар мусіў таксама адбівацца ад спробаў выдаць яго Пэру. Праўда, сёньня ён аптымістычна абвяшчае, што выдача дазволіць яму ачысьціць сваё імя. І сапраўды, цяперашняя экстрадыцыя ня толькі фармальна ставіць крыж на амбіцыях Фухіморы вярнуцца да ўлады, але і вяртае на палітычнае поле краіны надзвычай небясьпечную фігуру.

## Вяртаньне дыктатара

«Для мяне гэта магчымасьць вярнуцца», — цьвердзіў былы 69-гадовы дыктатар у камэнтарах для пэруанскага радыё, даведаўшыся пра сваю выдачу, «бо маёй мэтай ёсьць узьяднаньне з народам». Праўда, на пэруанскай зямлі ён спачатку ўзьяднаецца за кратамі з Мантэсінасам, які адседжвае немалы тэрмін за карупцыю і парушэньні правоў чалавека.

У Фухіморы засталіся адданыя прыхільнікі ў Пэру, ачольваныя пакуль што ягонай дачкой, што засталася ня з маці, а з бацькам. Нават сёньня ўрад Аляна Гарсія абапіраецца на галасы пра-фухімораўскіх дэпутатаў падчас прыняцьця заканадаўства, і заявы былога дыктатара з-за кратаў могуць уплываць на пэруанскую палітыку. «Гэта — ня лепшы сцэнар для Алана Гарсіі, бо Фухіморы амаль несумненна будзе гнаць хвалі», — зазначыў на старонках «Нью-Ёрк Таймз» Хасэ Ўгас, колішні спэцыяльны пракурор Пэру, што займаўся расьследаваньнем дзейнасьці Фухіморы і Мантэсінаса. «Але гэта выразная перамога ў барацьбе супраць карупцыі і беспакаранасьці». Паводле ягоных ацэнак, Фухіморы атрымаў недзе каля паўсотні мільёнаў даляраў ад нацыянальнай службы выведкі цягам 1992 — 2000 гадоў, дый арганізаваў перадачу 15 мільёнаў даляраў дзяржаўных сродкаў Мантэсінасу незадоўга перад падзеньнем свайго ўраду.

Пэруанскія пракуроры маюць доказы ўсяго па пяці абвінавачаньнях у карупцыі, сярод якіх фігуруюць, апрача названых вышэй пунктаў, таксама хабары чальцам кангрэсу і незаконнае праслухоўваньне. Але найбольшы, 30-гадовы тэрмін Фухіморы можа атрымаць па справах пра два масавыя забойствы апанэнтаў улады «шwадронамі сьмерці», датычна якіх існуюць цьвёрдыя доказы.

У 1991 годзе падчас сямейных урачыстасьцяў былі забітыя 15 чалавек, у тым ліку васьмігадовы хлопчык, у бедным квартале Барыёс Альто пэруанскай сталіцы Лімы. У 1992 годзе з інтэрнату ўнівэрсытэту Ля Кантута ў прадмесьці Лімы былі скрадзеныя і забітыя дзевяць студэнтаў і іх выкладчык. Іх рэшткі будуць знойдзеныя толькі пазь-

Працяг на старонцы 16.

# Пакараньне дыктатара

Працяг са старонкі 15.

ней. Гэтыя злачынствы былі ўчыненыя ў час вайны З партызанамі «Прамяністага шляху» і «Тупак-Амару», што спрабавалі ўзьняць супраць ураду кечуа- і аймарамоўных беднякоў-індзейцаў.

Агулам таемная група «Каліна» ў складзе афіцэраў вайсковай выведкі зьдзейсьніла больш за дваццаць пазасудовых забойстваў на пачатку 1990-х. Фухіморы адмаўляе гэтыя абвінавачаньні, нягледзячы на відэадоказы, у якіх кіраўнік групы сьцьвярджае, што Фухіморы выразна падтрымаў стварэньне паліцыяй швадрону сьмерці.

Усяму ж сьвету Фухіморы запомніўся брутальным вызваленьнем закладнікаў, захопленых партызанамі «Тупак-Амару» ў рэзыдэнцыі японскага пасла ў Ліме ў 1997 годзе. Амаль усе 72 закладнікі былі вызваленыя, а ўсе 14 партызанаў застрэленыя на месцы. Створаная ў выніку карцінка, дзе прэзыдэнт з зброяй у руках спрабаваў згуляць у Рэмба, была ня лепшым іміджам рэжыму Фухіморы.

## Жах дыктатараў

Чылійскае рашэньне выдаць дыктатара суседняй краіны асабліва важнае, бо раней суды Чылі пазьбягалі выдаваць нават фашыстоўскіх злачынцаў, а цяжкая спадчына Пінагэтаўскай дыктатуры дагэтуль ціснe на краіну. «Гэта — пераломны момант у разьвіцьці міжнароднага права», — заявіў на старонках «Нью-Ёрк Таймз» Альфрэда Эчбэры, што прадстаўляў чылійскі ўрад у працэсе аб выдачы Фухіморы. — Упершыню Чылі ідзе на выдачу былога кіраўніка дзяржавы праз экстрадыцыю ў тую краіну, у якой ён расшукваецца».

Дагэтуль ня толькі Чылі, але і іншыя краіны, неахвотна рабілі нешта падобнае. Прыкладам, былы парагвайскі дыктатар Строснэр спакойна жыў у бразыльскім выгнаньні з 1989 году да сваёй сьмерці летась. Нягледзячы на існаваньне адпаведнай дамовы паміж Бразыліяй і Парагваем, і тое, што ён абвінавачваўся ў забойствах, парагвайскі ўрад не рабіў сур'ёзных спробаў дамагчыся выдачы Строснэра.

У іншых нядаўніх выпадках былыя кіраўнікі дзяржаваў перадаваліся міжнародным трыбуналам. Сэрбія выдала Мілошавіча Міжнароднаму крымінальнаму трыбуналу па былой Югаславіі, а Нігерыя выдала былога лібэрыйскага дыктатара Чарлза Тэйлара Спэцыяльнаму суду па Сіера-Леонэ.

Чылійскае рашэньне моцна адрозьніваецца ад гэтых прыкладаў, бо менавіта нацыянальны суд, а не выканаўчая ўлада, дамаўляючыся зь іншым урадам і прымаў рашэньні пра выдачу былога кіраўніка дзяржавы. Хасэ Мігель Віванка, дырэктар «Human Rights Watch» па Амэрыцы, мяркуе, што гэтае рашэньне адпавядае тэндэнцыі, што абазначылася пасьля таго, як брытанская Палата лёрдаў пастанавіла выдаць генэрала Пінагэта Гішпаніі па абвінавачаньнях у катаваньнях. «Гэта значнае гістарычнае рашэньне… яно мела месца дзякуючы працы ўнутрынацыянальных установаў, а не палітычным перамовам паміж урадамі». Зрэшты, у выпадку зь Пінагэтам, брытанскія суды пазьней адхілілі гішпанскі запыт аб экстрадыцыі, і дазволілі генэралу вярнуцца ў Чылі, спаслаўшыся на ягонае слабае здароўе.

Таму так важна тое, што сёньня з Фухіморам абыходзяцца як зь любым пасналітым грамадзянінам, што прысабечыў грошы ці некага змардаваў і тым самым ламаецца пэўнае табу. Гэта — чарговы важны крок да разуменьня таго, што ніхто не павінен пазьбегнуць пакараньня за злачынствы, якую б пасаду ён ні займаў.

# Эўра ва Ўсходняй Эўропе

Польшча можа адпавядаць фінанса-ва-эканамічным крытэрам для пераходу на адзіную эўрапейскую валюту — эўра — у 2009 годзе, аднак рэальна гэты крок можа адбыцца ў 2012–2013 гадох. Такая выснова напрошваецца з выказваньняў прызначанага на пачатку году старшыні Банку Польшчы Славаміра Скрыпека. У інтэрвію лёнданскай газэце «Файнэншл таймс» ён назваў менавіта гэтыя даты ў якасьці, верагодна, самага блізкага моманту адмовы ад нацыянальнай валюты дзеля эўра.

«Я хацеў бы атрымаць поўную справаздачу на гэтую тэму, якая абмяркоўваецца ў Польшчы, — сказаў ён. — Трэба паспрабаваць разгледзець усе аспэкты гэтага пытаньня і знайсьці магчымасьць прымірыць супрацьлеглыя пункты гледжаньня». Славамір Скрыпек таксама выказаўся за тое, каб пытаньне аб пераходзе на эўра вырашалася на агульнанацыянальным рэфэрэндуме, паколькі «народ зьяўляецца апошняй інстанцыяй».

Насамрэч старшыня банку адлюстроўвае пазыцыю ўраду, які выказваецца за рэфэрэндум, паколькі падазрона глядзіць на пэрспэктыву перадачы Эўрапейскаму цэнтральнаму банку ў Франкфурце-на-Майне рычагоў кіраваньня валютнай палітыкай. Да гэтага трэба дадаць, што ў новапрыбылых у ЭС краінах, у палітычных колах і сярод насельніцтва распаўсюджанае меркаваньне, паводле якога адзіная эўрапейская валюта можа замарудзіць хуткія тэмпы росту эканомікі, прыток замежных капіталаўкладаньняў, абярнуцца ростам цэнаў. Лічыцца, што большасьць насельніцтва, напалоханае пагрозай росту цэнаў, можа не ўлічыць пэрспэктываў адзінай валюты з краінамі ЭС і прагаласаваць супраць. Сам Скрыпек фармулюе сваю пазыцыю так: «Польшча павінна ўвайсьці ў Эўразону, калі ёй гэта будзе найбольш выгадна».

Насельніцтва часьцяком мала інфармаванае аб перавагах эўра. Адзіны рынак з адзінай валютай больш эфэктыўны, чым гандаль на розных рынках. Зьмяншаюцца выдаткі спажыўцоў і прадпрыемстваў, ствараюцца спрыяльныя ўмовы для інвэставаньня. Адзіная валюта забясьпечвае эканамічную стабільнасьць краіны, спрашчае ажыцьцяўленьне камэрцыйных апэрацыяў і зьяўляецца таксама палітычным рычагом. Эўрапейскія лідэры маюць намер садзейнічаць аб'яднаньню Эўропы пасьля стагодзьдзя канфліктаў — гэта частка пабудовы эўрапейскай ідэнтычнасьці.

«Эўра сам па сабе ня служыць натхняльнай мэтай, — прызнаўся ў інтэрвію эканамічнай газэце «Ўол-стрыт джорнэл» галоўны эканаміст Эўрапейскага банку рэканструкцыі і разьвіцьця (ЭБРР) Эрык Бэрглоф. — Рэч у тым, што пэрспэктыва эўра становіцца больш далёкай, і таму менш важнай для палітыкаў. Эўропа павінна прапанаваць гэтым краінам штосьці, здольнае натхніць гэтыя народы на дадзеным этапе».

Са свайго боку, Міжнародны валютны фонд у адным з сваіх дакумэнтаў канстатуе: «Стомленасьць ад рэформаў абярнулася зьніжэньнем палітычнай падтрымкі ідэі пераходу на эўра».

Згода на ўваходжаньне ў зону эўра была зафіксаваная пры прыёме новых краінаў-чальцоў у ЭС 1 траўня 2004 году. Аднак цяпер пра канкрэтныя тэрміны гэтага ў многіх зь іх ня кажацца, адбылася затрымка з падключэньнем нават да папярэдніх этапаў гэтага працэсу. Толькі Славенія ўжо ўступіла ў зону эўра.

Напрыклад, Вугоршчына, Польшча і Чэхія, ня кажучы пра навічкоў Баўгарыю і Румынію, нават не далучыліся да Эўрапейскага абменнага мэханізму, які рэгулюе абменную палітыку паміж краінамі Эўразоны і тымі краінамі ЭС, якія ў яе не ўваходзяць. Баўгарыя папярэдне зьбіраецца ўвайсьці ў Эўразону ў 2010 годзе, у 2011 годзе — Эстонія, у 2011 — 2013 гадох — Латвія, у 2014 годзе — Румынія. Што тычыцца астатніх, яны яшчэ не акрэсьлілі канкрэтныя часавыя рамкі.

**Насельніцтва часьцяком мала інфармаванае аб перавагах эўра.**

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўразьвязу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭЗ.
Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

# Жалезьнічэнка на волі



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Гісторыя трэцякурсьніка Гомельскага дзяржунівэрсытэту Зьмітра Жалезьнічэнкі **(на фота)** сугучная з выключэньнем з Акадэміі кіраваньня Юрася Алейніка.

Жалезьнічэнка адвучыўся на «выдатна» чатыры сэмэстры. Праблемаў з дысцыплінай таксама не было. Зьміцер вядомы ў Гомелі актыўнай грамадзянскай пазыцыяй, ён сябра Партыі БНФ, маршалак гомельскай моладзевай краязнаўчай арганізацыі «Талака».

Улетку суд пакараў Зьмітра 10 б.в. штрафу за правядзеньне ў горадзе бардаўскага фэсту. Жалезьнічэнку вінавацілі ў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці: нібы падчас канцэрту гледачы кідалі грошы ў скрынку.

Адміністрацыйнае пакараньне і унівэрсытэцкае спагнаньне ад лістапада мінулага году (за пропуск 20 гадзінаў заняткаў) сталі галоўнымі прычынамі выключэньня з ВНУ. Пра тое, што 7 верасьня дэкан факультэту Сяргей Жогаль падпісаў дакумэнты аб выключэньні, Зьміцер даведаўся толькі 12 верасьня.

18 верасьня Жалезьнічэнку ў Гомелі затрымалі міліцыянты: сказалі, што ён падобны да чалавека, які згвалтаваў дзяўчыну. Не пацьвердзілася, але хлопца адвезьлі ў пастарунак, склалі пратаколы за лаянку і супраціў міліцыі. Судзьдзя Дамненка дала Зьмітру восем сутак арышту. Хлопец мяркуе — каб прыглушыць справу з выключэньнем.

На сутках Жэлезьнічэнка сядзеў разам з Андрэем Цянютам, якога пакаралі тыднем арышту за распаўсюд улётак у падтрымку Зьмітра. На волю хлопцы выйшлі ў аўторак 25 верасьня. «Падчас гэтага зьняволеньня я пачуў лаянкі столькі, колькі ня чуў за ўсё жыцьцё», — адзначае хлопец.

Жалезьнічэнка будзе абскарджваць рашэньне аб выключэньні праз суд. Яго натхняе прыклад Юрася Алейніка, які ўсё яшчэ працягвае судзіцца з Акадэміяй кіраваньня. «Справа з маім выключэньнем настолькі сфабрыкаваная, што надзею на аднаўленьне я не згубіў», — кажа Зьміцер.

**Зьміцер Панкавец**

## 17 верасьня

### Не дазваляюць рэфэрэндуму

Гарадзенскі гарвыканкам адмовіў у правядзеньні мясцовага **рэфэрэндуму па пытаньнях рэканструкцыі гораду**. Гэта вынікае з афіцыйнага адказу на зварот ініцыятыўнай групы. Адмова абгрунтоўваецца дапушчанымі «парушэньнямі Выбарчага кодэксу ды іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь».

### Ізноў Азарка

У Нясьвіжы міліцыянты затрымалі **Насту Азарку** за расклейваньне налепак да Эўрапейскага маршу. На дзяўчыну склалі пратакол.

### Шосты дзень народзінаў за кратамі

Свой дзень народзінаў **Андрэй Клімаў** сустрэў у камэры сьледчага ізалятару. 1 жніўня палітык быў асуджаны на два гады зьняволеньня за артыкул у Інтэрнэце, які ўлады палічылі абразай Аляксандра Лукашэнкі і заклікам да зьвяржэньня дзяржаўнага ладу. Клімаў шосты раз сустракае дзень народзінаў за кратамі.

## 18 верасьня

### Выслалі з Рэчыцы

Рэчыцкі праваабаронца, кіраўнік рэгіянальнай структуры Партыі БНФ **Валер Пуціцкі** атрымаў распараджэньне кіраўніцтва Беларускай чыгункі, дзе працуе майстрам па капітальным рамонце, паехаць у камандзіроўку з 19 па 24 верасьня ў г. Жыткавічы Гомельскай вобласьці. У камандзіроўкі таксама адправілі двух сябраў Партыі БНФ — **Аляксандра Ганчарэнку**, супрацоўніка Беларускай чыгункі, і **Кастуся Кузьняцова**, лекара-рэаніматолята.

### Ператрус і допыт у Жлобіне

Супрацоўнікі КДБ **маёр Глянцэвіч** і **старшыя лейтэнанты Колас** і **Вавілаў** зладзілі ператрус на кватэры непаўнагадовага актывіста незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» **Кірылы Атаманчыка** ў Жлобіне. У хлопца сканфіскавалі сыстэмны блёк кампутара, шэсьць бел-чырвона-белых сьцягоў, балёнчыкі з фарбай і значкі. Потым Кірылу выклікалі на допыт у КДБ. Сьледчага цікавіла прыналежнасьць маладога чалавека, да «МФ».

### Лябедзьку папярэдзілі

Генэральная пракуратура Беларусі вынесла **Анатолю Лябедзьку** «неафіцыйнае папярэджаньне». Намесьніка начальніка аддзелу Генпракуратуры Паўла Радзіёнава зацікавілі камэнтары лідэра АГП наконт спыненьня дзейнасьці ПКБ, апублікаваныя ў інтэрнэце. А. Лябедзька публічна назваў рашэньне Вярхоўнага суду па гэтай справе палітычна матываваным.

## 19 верасьня

### Арыштавалі перад Дажынкамі

У Рэчыцы затрымалі грамадзкага актывіста, прадпрымальніка **Леаніда Невара**.

Пазьней судзьдзя Рэчыцкага раённага суду **Стрэльчанка** пакараў яго 6 суткамі арышту нібыта за абразу начальніка ідэалягічнага аддзелу райвыканкаму **Туміловіча**.

### Школьніц затрымалі за налепкі

Няпоўнагадовых актывістак **Кацярыну Радзікульцаву** і **Дар'ю Клінаву** затрымалі ўвечары за расклейваньне налепак да «Эўрапейскага маршу». У Ленінскім РУУСе ў дзяўчат праверылі дакумэнты і правялі асабісты надгляд рэчаў. А 12-й гадзіне ночы затрыманых адпусьцілі разам з бацькамі.

## 20 верасьня

### Мілінкевічу ізноў адмовілі

Вярхоўны Суд адмовіў пакуль не зарэгістраванаму **руху «За Свабоду»** ў скарзе на дзеяньні Мін'юсту. Нагадаем, раней Міністэрства юстыцыі адмовіла РПГА «Рух «За Свабоду» ў рэгістрацыі на той падставе, што «асобныя палажэньні статуту не адпавядаюць закону», а дзяржмыта аплачанае не ў рэспубліканскі, а ў мясцовы бюджэт. Вярхоўны Суд «пацьвердзіў законнасьць рашэньня Мін'юсту аб адмове ў рэгістрацыі».

### Неспакойна ў Нясьвіжы

Выдавец нясьвіскай незалежнай газэты «Брама» **Алесь Язьвінскі** падаў скаргу ў раённую пракуратуру на дзеяньні мясцовых міліцыянтаў. 19 верасьня яго затрымалі ў Гарадзеі і сканфіскавалі некалькі дзясяткаў асобнікаў газэты. Потым да яго на кватэру некалькі разоў наведваліся сьледчыя, якія шукалі рэшту накладу «Брамы» і спрабавалі канфіскаваць кампутар.

## 22 верасьня

### З «Дажынак» у рэанімацыю

**Васіля Сіліверста**, чарнобыльскага ліквідатара, затрымалі каля рэчыцкага райвыканкаму. Ахоўнікі са службы бясьпекі Лукашэнкі закруцілі яму рукі і павалілі на зямлю. Побач знаходзіліся супрацоўнікі міліцыі з крымінальнага вышуку Гомеля, а таксама мясцовыя супрацоўнікі КДБ. У выніку гвалтоўнага затрыманьня сп. Сіліверсту стала млосна. Ахоўнікі выклікалі «хуткую». У шпіталі затрыманага з дыягназам гіпэртанічны крызіс паклалі ў рэанімацыю.

**СП**

# Парад камбайнёраў, рыцары ды R-n-B

Сьвята ўраджаю адзначылі з размахам у стэрыльна-ідэалягічнай атмасфэры: з адрэстаўраванай на мільёны даляраў Рэчыцы павыдалялі актывістаў апазыцыі. Народу прапанавалі шэсьце аграрнікаў ды патрыятычнае кіно з шашлыкамі і рыцарамі. Піша **Сямён Печанко.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ
Пераможцы.

## 100 мільёнаў на Дажынкі

Адзінаццатыя па ліку «Дажынкі» каштавалі беларусам амаль 200 млрд рублёў. Менавіта столькі бюджэтных ды спонсарскіх сродкаў выдаткавалі на падрыхтоўку Рэчыцы да сьвята. На гэтыя грошы тут правялі капітальны рамонт жыльлёвага сэктару, збудавалі летні амфітэатар на беразе Дняпра, а чыгуначны вакзал, гатэль, школу-інтэрнат, больніцу і раённую паліклініку рэканструявалі. Рыхтаваліся ня толькі ў горадзе. У пятніцу раніцай у навакольных вёсках можна было пабачыць людзей у памаранчавых камізэльках, што ўздоўж дарог высаджвалі кветкі на клюмбах ды мылі плітку каля афіцыйных установаў. Дзе-нідзе яшчэ клалі асфальт.

Ля кожнай дарогі, што прымыкае да галоўнай трасы стаялі супрацоўнікі лясгасаў у парадней форме. На ўезьдзе ў горад, пад расьцяжкамі «Вітаем працаўнікоў сяла!» разгарнуўся сьвяточны гандаль.

## Панаехала гасьцей

Рэчыца сустрэла ДАІшнікамі, сьвяточнымі транспарантамі, якія ўслаўлялі хлебаробаў, пахам шашлыкоў ды савецкімі шлягерамі, што выконваліся творчымі калектывамі пасярод вуліцы. Найбольшы рух назіраўся на Савецкай вуліцы, якой павінна была прайсьці ўрачыстая калёна абласных дэлегацыяў пераможцаў жніва. Уздоўж вуліцы гледачам мясцовыя чыноўніцы раздавалі чырвона-зялёныя сьцяжкі. На пытаньне, што зь імі рабіць, строгія жанчыны адказвалі коратка: «Махаць!»

«Крамбамбуля», якая не змагла прасьпяваць ў Рэчыцы жыўцом, усё ж прагучала тут — побач зь яткай «Віно-тытунь гандаль» з калёнак разносілася «ту-ту-турысты». Пра гурт нагадалі і дзьве заклапочаныя жанчыны з бэджамі «арганізатар»: «Панаехала гасьцей, а нам пасьля сьмецьце прыбірай!» Гасьцей жа насамрэч было ня вельмі шмат, асабліва ў першы дзень. Тым не менш, паглядзець на калёну апранутых у строгія гарнітуры мэханізатараў прыйшло нямала месьцічаў, шмат каго зь якіх, паводле іх словаў, выправілі сюды з працы.

## Зачыстка апазыцыі

Рыхтуючыся да «Дажынак», рэчыцкае начальства ўлічыла бабруйскі досьвед з настаўнікам і дэпутатам Алесем Чыгіром. Той у часе мінулага сьвяткаваньня прыкуў сябе да агароджы, пратэстуючы супраць звальненьня з працы. У Рэчыцы сёлета задзейнічалі прэвэнтыўныя меры: «ненадзейных» загадзя выслалі ў камандзіроўкі ў іншыя раёны, а грамадзкага актывіста Леаніда Невара асудзілі на 6 сутак нібыта за абразу на адрас мясцовага ідэоляга.

Вызваленае месца заняў усюдыісны БРСМ. Ягоныя лёзунгі ўпрыгожвалі канцэртныя пляцоўкі, а вакол галоўнай сцэны перад адкрыцьцём фэстывалю павыстройваліся шэрагі школьнікаў з сымболікай арганізацыі. Падлеткі, не выбіраючы выразаў, пыталіся адзін у аднаго, колькі часу ім давядзецца тут пратырчаць.

У аздабленьні гандлёвых намётаў пераважалі ідэалягічна выверaныя спалучэньні колераў, бел-чырвона-белыя зьвязкі балёнікаў, а то й сувэнірная «Пагоня» на выставе ў «Горадзе майстроў», успрымаліся амаль як рэвалюцыя. Горад быў напоўнены міліцыянтамі. Пасярод урачыстай калёны пераможцаў жніва можна было заўважыць групу байцоў службы бясьпекі прэзыдэнта ў цывільным. «А гэта што за дэлегацыя?» — дзівіліся людзі таму, што моцныя і добра апранутыя дзецюкі ня несьлі перад сабой шыльды з назвай вобласьці. «Гэтыя хлопцы ня езьдзяць на камбайнах» — зазначыў абазнаны мужчына.

## Сьвята раз на год

Афіцыйная частка пачалася з паўгадзінным спазьненьнем. Адкрыў «Дажынкі-2007» віцэ-прэм’ер Іван Бамбіза. Дыктар АНТ Аверкаў і нязьменная вядучая Славянскага базару Алена Сьпірыдовіч вялі праграму па-беларуску. Да агароджанай сцэны пускалі толькі ўладальнікаў пропускаў. Потым ахова пачала пускаць на



СЯМЁН ПЕЧАНКО
Да дажынак выпусьцілі спэцыяльнае шампанскае.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

За бясьпекай чыноўнікаў на сцэне сачылі са стрэхаў снайпэры.



NAVINY.BY

вольныя месцы ўсіх ахвотных. Пайшлі ня ўсе. «Хадзем на шашлыкі, што нам гэтыя даклады», — кажа сталы мужчына свайму суседу. — «Успамінаюць нас раз на год, як хлеб убяром». Каля сцэны ўзрушаны дырэктар агракамбінату «Ждановічы» на камэру БТ завочна абверг невядомага пэсыміста: «У нашай краіне, як нідзе ў сьвеце, шануецца праца вяскоўцаў».

Людзей цікавіла, калі прыедзе Лукашэнка. Шмат хто ня верыў, што яго ня будзе на адкрыцьці сьвята, пакуль тое адкрыцьцё не пачалося.

## Накормім Расею ды Эўропу

Прэзыдэнт зьявіўся ў Рэчыцы ў суботу. Ён падзякаваў Богу, што сёлетні багаты ўраджай ня змусіць беларусаў стаць на калені, паабяцаў працягваць праграму падтрымкі вёскі, аднак загадаў пры гэтым лічыць кожную капейчыну. Лукашэнка зьлітасьціўіся з навукоўцаў, якіх ганіў улетку за палеглую збажыну, а таксама пахваліў былога кіраўніка параможнай Менскай вобласьці Мікалая Дамашкевіча, якога не без скандалу нядаўна зьняў з пасады.

Паводле Лукашэнкі, сельская гаспадарка Беларусі мае неблагі экспартны патэнцыял, асабліва ў такія неспрыяльныя гады, як сёлета: «Сёньня ў чарзе стаяць расейцы, купляюць за вялікую цану малочныя і мясныя прадукты. Эўрапейскія краіны гатовыя набываць у агромністых колькасьцях масла, рэалізацыя якога яшчэ некалькі год таму была праблемай».

Расею прэзыдэнт Беларусі ўзгадаў таксама, адказваючы на пытаньне, ці не давядзецца ізноў падпісваць газавую дамову пад звон курантаў. Ён ня выключыў такой магчымасьці, адзначыўшы, што ўжо цяпер для беларусаў расейскі газ каштуе, як для немцаў. Віна за гэта была ўскладзеная на расейскае кіраўніцтва.

## Рыцары, R-n-B party і патрыятычнае кіно

Ходзяць чуткі, што гэтыя «Дажынкі» маглі быць апошнімі. Нібыта сам прынцып сьвяткаваньня ў верасьні, тады як канчатковы падлік памераў і кошту ураджаю магчымы толькі ў студзені наступнага году, сябе зжыў. Але, які б лёс ні чакаў фэстываль, жыхарам Рэчцы застанецца адрэстаўраваны горад, амфітэатар і памяць пра дзіўнаватае сьвята з рыцарамі, патрыятычнымі фільмамі і R-n-B party.

**Сямён Печанко,**
**Менск—Рэчыца**

# У Луцку ўсё па-людзку

Музычныя рок-фэстывалі за межамі Беларусі ўжо ня рэдкасьць. Штогод у Гарадку на Беласточчыне праходзіць «Басовішча», сёлета ў мястэчку Нарвілішкі на Віленшчыне быў фэст «Be2gether». Але, напэўна, упершыню ахвотныя трапіць на рок-фэст за межы Беларусі сутыкнуліся з такімі праблемамі і прыгодамі, як на гэтых выходных падчас паездкі ў Луцк, дзе мусіў прайсьці канцэрт «Права быць свабодным».



АРСЕНЬ ПАХОМАЎ

Я дабіраўся ў галоўны горад Валыні разам з музыкамі, наш аўтобус выехаў зь Менску недзе а другой гадзіне дня ў пятніцу. Плянавалася, што яшчэ да ночы мы будзем на месцы.

Прыгоды пачаліся на мяжы. Да кантрольна-прапускнога пункту Макраны мы пад'ехалі дзесьці а 19-й і акурат патрапілі на пераэьменку ў памежнікаў, якая заняла каля гадзіны. Праэь некаторы час памежнікі забралі ў нас пашпарты для праверкі. Здавалася, вось-вось і дарога будзе працягнутая. Аднак праз пару гадзінаў чаканьня аптымізму істотна паменела.

Тым часам пачалі прыходзіць трывожныя навіны зь Менску. А 22-й ад Акадэміі навук у Луцк мусілі выехаць яшчэ два аўтобусы. Першы аўтобус затрымалі ля Дзяржынску і ў суправаджэньні АМАПу накіравалі на менскі чыгуначны вакзал. Другі аўтобус даехаў амаль да Стоўпцаў. Схема тая ж: пост ДАІ, пастарунак, праверка дакумэнтаў, «аўтобус ня можа далей ісьці, бо яму патрэбен рамонт» і адпусканьне без пратаколаў. 15 чалавек з другога аўтобусу ўсё ж дабраліся да фэсту.

Былі падазрэньні, што могуць затрымаць і наш аўтобус. Апоўначы памежнікі аддалі пашпарты зь пячаткамі, аднак нас чакала яшчэ адна цікавая працэдура — надгляд рэчаў... А чацьвертай раніцы наш аўтобус пад'ехаў да луцкага гатэлю з прыгожай міцкевічаўскай назвай «Сьвіцязянка».

## Луцк перадвыбарны

Склалася ўражаньне, што ў Луцку мала хто ведаў, што ў горадзе мусіць прайсьці фэст беларускіх гуртоў. Толькі дзенідзе на слупах віселі плякаты з рэклямай, аднак яны былі непрыкметнымі сярод вялізнай колькасьці выбарнага агітацыйнага матэрыялу — праз тыдзень ва Ўкраіне мусяць прайсьці парлямэнцкія выбары. Напярэдадні ў горадзе праходзіў канцэрт у падтрымку партыі «Наша Ўкраіна». Таму і «Права быць свабодным» часткай месьцічаў магло ўспрымацца, як перадвыбарны канцэрт малавядомага блёку ці партыі. Што да агітацыі, то здалося, што ў Луцку яе найбольш плённа праводзіць блёк Юліі Цімашэнкі, іхнымі біг-бордамі быў завешаны ўвесь горад.

На цэнтральнай плошчы Луцку мірна стаяць шэсьць намётаў, якія распаўсюджваюць агітматэрыялы сваіх выбарных штабаў. З аднаго боку намёты «Нашай Ўкраіны», БЮТу, партыі зялёных і аб'яднаньня «Свабода», зь іншага — Партыя рэгіёнаў і блёк нейкай Людмілы Супрун. Нейкае малое цягне бабулі ўлётку з выявай Цімашэнкі, тая бярэ і рве паперчыну са словамі: «Брахучка твая Юля. Ня буду за яе галасаваць, я за Януковіча». Усё гэта гаворыцца на цудоўнай украінскай мове.

Расейскай мовы ў Луцку не чуваць нідзе, украінскай паслугоўваецца і стары, і малы. Усе шыльды па-ўкраінску. Сустрэў адну і па-беларуску. У праваслаўнай царкве сьвятой Тройцы. Назва храму дубляваласяя яшчэ і па-польску.

Мясцовыя кажуць, што горад хутка разьвіваецца, заробкі растуць. Гэта можна заўважыць па вялікай колькасьці новых крамаў, кавярняў, дарагіх машынаў. Разам з тым, у цэнтры лёгка натыкнуцца на руіны, альбо ўжо ў пяцістах мэтрах ад цэнтральнага праспэкту Волі могуць раптоўна скончыцца ходнікі, а ў трохзоркавай «Сьвіцязянцы» ня будзе гарачай вады.

## «А «Ляпіс» будзе?»

Канцэрт «Права быць свабодным» праходзіў у самым цэнтры гораду ў парку імя Лэсі Ўкраінкі. Парк — месца адпачынку мясцовай моладзі. Шмат хто зьдзіўлена пытаўся: што за мерапрыемства? Дасьведчаныя тлумачылі, што гэта альтэрнатыўныя беларускія музыкі, якім не дае на радзіме выступаць рэжым Лукашэнкі. «А «Ляпіс Трубяцкой» з «Сашам і Сірожам» прыедуць?» — з надзеяй пыталі дзяўчаты.

Але ўсё ж першыя выступоўцы — берасьцейцы зь «Сьцяны», бярозаўцы БН і ўкраінскі гурт «Тінь Сонця» — выступалі перад паўпустой пляцоўкай. Беларусаў змагло дабрацца каля двухсот чалавек, а ўкраінцы яшчэ не пасьпелі падысьці.

Троху весялей стала, калі пачаў сьпяваць гурт «Індыга». Украінская нефармальная моладзь была проста ў захапленьні ад «Зьніча». «Таварыш Маўзэр» песьняй «Гітлер капут» выклікаў фурор.

Выступаў не-музыкаў на сцэне было вобмаль. Запомніўся дэпутат Валынскага абласнога савету Ігар Гудзь, які зьяўляецца ў Беларусі пэрсонай нон-грата. Ён выйшаў на сцэну ў саколцы «Маладога фронту». Яшчэ быў выступ прадстаўніка аб'яднаньня «Свабода» (іх сьцягоў на пляцоўцы было прыкладна столькі ж, як бел-чырвона-белых), які паспрабаваў скарыстаць канцэрт у сваіх выбарчых мэтах.

Пры канцы ля сцэны была тысяча чалавек. На ўзроўні выступілі «Крама» і «Уліс». Кулінковіч пасьпеў прасьпяваць толькі некалькі сваіх гітоў: фэст скончыўся апоўначы. .

Дарога дадому была нялёгкай. Аўтобус прастаяў на мяжы каля пяці гадзінаў. Адбываўся пільны надгляд рэчаў. Памежнікаў цікавілі друкаваныя выданьні, правяраліся дыскі, флэшкі, фотаапараты. Нічога не канфіскавалі. А дванаццатай дня мы былі ўжо ў Менску.

Арганізатар фэстывалю — Швэдзкі Хельсынскі камітэт — абяцае ладзіць нешта падобнае штогод. Няма яшчэ пэўнасьці з дакладным месцам і фарматам. Мо гэта будзе Луцк, а, магчыма, нейкі іншы ўкраінскі горад. Усе спадзяюцца, што налета гэты фэст стане больш масавым.

**Зьміцер Панкавец,**
**Луцк — Менск**

пытайцеся ў распаўсюднікаў новы нумар




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

## Амок на вуліцы Кедышкі

У сталіцы крымінальнік захапіў закладніцу і забіў 28-гадовага хлопца.

Вечарам у мінулую суботу ў адной са сталічных кватэраў па вуліцы Кедышкі 30-гадовы гамяльчук учыніў сапраўдную бойню. Ягонай ахвярай стаў 28-гадовы мянчук, яшчэ дваіх ён парэзаў.

Беспрацоўны гамяльчук і раней быў судзімы за забойства, разбой і супраціў міліцыі. А на гэты раз яго панесла зь перапою. Пад’юдзіла рэўнасьць: ён схапіў нож і нанёс сьмяротны ўдар чалавеку, якога палічыў супернікам. Гэтым справа ня скончылася: азьвярэлы злачынца пырнуў у грудзі яшчэ 23-гадовага вяскоўца з Пухавіцкага раёну і парэзаў руку 28-гадовай гаспадыні кватэры.

Заўважыўшы нарад міліцыі, ужо на бульвары Талбухіна, асатанелы крымінальнік выхапіў нож і схапіў у закладніцы 18-гадовую студэнтку першага курсу БДУ. Праўда, на гэты раз супрацоўнікам міліцыі ўдалося не дапусьціць праліцьця крыві: дзяўчыну вызвалілі, яна не пацярпела, а злачынцу затрымалі.

## Маці пагражае турма за тое, што яе дачку загрыз сабака

На мінулым тыдні на вуліцы Каліноўскага ў сталіцы адбылася трагедыя — маці пакінула пяцімесячную дзяўчынку ў вазку і пайшла ў краму. А стафардшырскі тэр’ер накінуўся на немаўля і загрыз яго.

Супраць маці ўзбуджана крымінальная справа паводле арт.159 Крымінальнага кодэксу «Пакіданьне ў небясьпецы», які прадугледжвае тры гады зьняволеньня ці штраф і грамадзкія работы.

А сабака знаходзіцца ў ізалятары вэтслужбы. Сабака стары — яму 14 год.

## Ад інстытуту ядзерных выпрабаваньняў у Соснах вывезьлі 256 снарадаў

У пасёлку Сосны каля Аб’яднанага інстытуту энэргетычных і ядзерных дасьледаваньняў знайшлі склад чорных капачоў з боепрыпасамі Другой сусьветнай вайны. Небясьпечную знаходку падарвалі проста на полі.

## У чарзе па польскія візы 4 тысячы чалавек

Кантакты між Беларусьсю і Польшчай растуць, а консульскія магутнасьці — не. Чарга ў польскі кансулят у Менску складае 4 тысячы чалавек. Усе, хто жадае атрымаць візы ў Польшчу, мусяць запісвацца, рэгулярна зьяўляцца на пераклічкі паводле свайго нумару ў сьпісе, дзяжурыць начамі.

## Вышаградзкія краіны зробяць візы бясплатнымі?

Прэзыдэнты Польшчы, Чэхіі, Славаччыны, Вугоршчыны на сустрэчы абвесьцілі пра свой намер зрабіць візы для беларусаў бясплатнымі. Гэты жэст добрае волі мае палегчыць беларусам кантакты з суседзямі па Цэнтральнай Эўропе.

## Расоны пастарэлі на 500 гадоў

Гэтаму паспрыяла сэнсацыйная знаходка археолягаў на чале з Маратм Клімавым, якія знайшлі новы гістарычны цэнтар гэтага мястэчка ў Віцебскай вобласці, а ў ім — фрагмэнты керамікі другой паловы першага тысячагодзьдзя.

Расоншчына, нагадаем, — радзіма Яна Баршчэўскага, Пятра Машэрава і Генадзя Бураўкіна.

## Усяго літар на 100 км

«Фальксваген» да 2011 году распачне выпуск супэрэканамічнага аўтамабіля, які будзе браць усяго літар бэнзіну на 100 км. Працоўная назва мадэлі — «L1». Машына разьлічана ўсяго на два чалавекі. Пасажырскае крэсла будзе зьмешчана за плячыма кіроўцы. Рама «L1» мае быць з магнію, а кузаў — з вуглевадароднага валакна. Сабекошт «L1» складзе каля пяці тысячаў эўра.

**МБ; «Звязда», радыё «Рацыя», «Народная газета», «Эўрапейскае радыё для Беларусі»**

**Як высьветліла «Комсомольская правда в Беларуси», маладая сьпявачка Юліяна, якая сёлета падчас трансьляцыі «Эўрабачаньня» аб’яўляла балы ад Беларусі — дачка Алега Праляскоўскага, кіраўніка ідэалягічнага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта.**



JULIANASTAR.COM

# Берасьцейшчыну апанавалі буйныя матылі



Жыхары Берасьцейшчыны назіраюць масавы лёт буйных матылёў — звычайных языканаў і бярозкавых бражнікаў.

Як распавёў навуковы супрацоўнік Інстытуту заалёгіі Нацыянальнай акадэміі навук Анатоль Кулак, гэта рэдкая для Беларусі зьява. Звычайна такія віды сустракаюцца ў адзінкавых выпадках. А іх масавае зьяўленьне ў нашай краіне можна патлумачыць сьпякотным летам.

Звычайныя языканы і бярозкавыя бражнікі прылятаюць у Беларусь з паўднёвых краінаў для размнажэньня. Найбольшая іх колькасьць сустракаецца ў паўднёвай частцы рэспублікі. У цэлым у Беларусі можна ўбачыць каля 18 розных відаў бражнікаў.

Буйных матылёў часта блытаюць з самай маленькай на Зямлі птушкай — калібры. Каляровая афарбоўка некаторых бражнікаў падобная да афарбоўкі калібры, а хуткасьць работы крыламі ў матылёў настолькі высокая, што дэталёва разгледзець іх часам вельмі складана. «Жыхары Беларусі пэрыядычна паведамляюць навукоўцам аб «знаходцы» самага маленькага віду птушак, аднак ім тлумачаць, што зафіксаваны «цуд» зьяўляецца ня птушкай, а жамярой», — адзначыў А.Кулак.

Языкан звычайны — бражнік з размахам крылаў 40—50 мм. Гэты від распаўсюджаны ў Эўропе, Паўночнай Афрыцы, Паўднёвай Індыі і ў сярэдняй паласе Азіі. Харчуецца нэктарам, які здабывае, завісаючы над кветкамі.

Бярозкавы бражнік — адзін зь відаў самых буйных эўрапейскіх матылёў зь цёмна-сінімі крыламі, на якіх разьмешчаныя сьветлыя палосы. Размах крылаў дасягае 120 мм, даўжыня хобату — 100 мм. Гэты від актыўны ў вечаровы і начны час сутак, падчас палёту гучна бзыкае.

**БЕЛТА**

# Малы грыцук паставіў новы рэкорд бесьперасадачнага пералёту



Малы грыцук (Limosa lapponica) з умоўным імем E7, які стаўся знакамітым дзякуючы свайму вясноваму рэкорднаму беспасадачнаму пералёту, нядаўна пабіў свой жа рэкорд! У гэты раз — падчас міграцыі зь месцаў гнездаваньня на Алясцы ў Новую Зэляндыю на месцы зімоўкі. Рэкорд засьведчаны спадарожнікавай тэлемэтрыяй.

На працягу сямі месяцаў гэты малы грыцук праляцеў 29 000 км — вяртаючыся зь зімоўкі ў Новай Зэляндыі, праз Кітай на Аляску, а цяпер назад у Новую Зэляндыю.



Новы рэкордны беспасадачны пералёт адбываўся на працягу 8 дзён, церазь Ціхі акіян на адлегласьць у 11.600 км!

«Грыцукі робяцца дарослымі ў 3—4 гады і многія жывуць больш за 20 гадоў. Калі мы прымем, што для малых грыцукоў 29.000 км гэта сярэдняя адлегласьць, якую яны пралятаюць на працягу году, атрымліваецца, што за ўсё жыцьцё птушкі пралятаюць каля 500.000 км» — гаворыцца ў прымеркаванай да гэтай падзеі заяве Службы геалягічнай выведкі ЗША.

Атрыманыя вынікі паказваюць важнасьць дасьледаваньняў, зробленых з дапамогай спадарожнікавых перадатчыкаў для аховы прыроды.

Пералётныя птушкі прыпыняюцца ў некалькіх месцах на сваім шляху, каб узнавіць свае сілы, адпачыць, падсілкавацца. Але такія месцы зьнікаюць або забудоўваюцца, і тады многія птушкі пачынаюць выміраць.

Дасьледаваньне малых грыцукоў з дапамогай спадарожнікавых перадатчыкаў — частка праекту «Міграцыі ціхаакіянскіх прыбярэжных птушак», у якім удзельнічаюць навукоўцы з розных краінаў.

**Дзьмітры Вінчэўскі (Ахова птушак Беларусі)**

# Плян «Новага Места»

Цяпер там завод «Крышталь» і прэзыдэнцкія гаражы. А што было дзьвесьце гадоў таму? Пра невядомую раней мапу Менску піша гісторык **Алег Дзярновіч**.

Удачай стала знаходка новага пляну паўднёвых прадмесьцяў Менску 1804 г. Але, апроч той інфармацыі, што ўтрымлівае плян, цікавай і павучальнай зьяўляецца ягоная архіўная гісторыя. У нашы дні плян Менску захоўваецца ў варшаўскім Галоўным архіве старажытных актаў у фондзе Менскага Кола Варшаўскага таварыства апекі над помнікамі мінуўшчыны. І тут варта спыніцца на гісторыі гэтага таварыства.

### Менскае Кола

Арганізацыя, якая атрымала назву «Менскае Кола», узьнікла ў 1916 г. у мэтах захаваньня і кансэрвацыі помнікаў гісторыі. Але галоўнай задачай Менскага Кола стала ратаваньне ад вывазу ў глыб Расеі культурных каштоўнасьцяў, якія былі, з пункту гледжаньня заснавальнікаў таварыства, важнымі для польскай дзяржаўнасьці. Пагрозу ўяўляла пасьпешлівая эвакуацыя расейскіх установаў, інстытуцыяў і архіваў з абшараў заходніх губэрняў Расеі ў выніку паступовага наступу нямецкіх войскаў.

Менскае Кола ўтварылася як філія Варшаўскага таварыства апекі над помнікамі мінуўшчыны, што паўстала ў 1906 г. і праіснавала да 1939 г. Фактычна, Менскае Кола замяніла сабою раней дзейсны на Меншчыне Аддзел Помнікаў пры Цэнтральным грамадзянскім камітэце, створаным для апекі над польскімі ўцекачамі. Сярод іншых, у склад Управы Кола ўвайшлі такія вядомыя ў Менску людзі, як Станіслаў Няканда-Трэпка, Ян Віткевіч, Станіслаў Дангель, Тадэвуш Корзан, Ян Ельскі. У рамках таварыства існавала, у тым ліку, сэкцыя Старога Менску.

Сябры таварыства з поўным усьведамленьнем важнасьці сваёй дзейнасьці дзеля захаваньня польскасьці з імпэтам займаліся інвэнтарызацыяй прадметаў, якія былі вывезеныя ці згубленыя на чыгунцы; падрыхтоўвалі сьпісы каштоўных матэрыялаў на правінцыі; зьбіралі экспанаты ды захоўвалі іх на спэцыяльных складах. Да 1918 г. Менскае Кола накіравала на абшары Менскай губэрні 50 ратавальных і інвэнтарызацыйных экспэдыцыяў, наладзіла дзьве мастацкія выс-

Працяг на старонцы 44.



# Дзякуй

**Галіне Г.** з Барысава.
**Вользе Ж., Яну Б.** з Гарадзенскага раёну.
**Аляксандру Н.** са Слуцкага раёну.
**Ірыне Ш.** з Браславу.
**Леакадзіі Н.** з Ракава.
**М.** са Жлобінскага раёну.
**Сяргею А., Крысьціне М., Сяргею К., Людміле М., Аляксею П., Галіне Л., Івану А., Ларысе Ц., Іне С., Аляксандру С.** з Горадні.
**Алене Дз.** з Навагрудку.
**Юр'ю Н.** з Барані.
**Адзе Р.** з Шаркоўчынскага раёну.
**Віталю Г.** з Чачэрскага раёну.
**Зьмітру К., П.Г.** з Мастоў.
**Уладзімеру Л.** са Смургоняў.
**Яўгену С., Н.А.** зь Пінску.
**Ігару Б.** з Глыбоцкага раёну.
**Уладзімеру Ц., Натальлі Т.** з Салігорску.
**Антону Б.** зь Верхнядзьвінску.
**Паліне Ю.** зь Верхнядзьвінскага раёну.
**Віталю Ц.** са Жлобіна.
**Аляксандру Ш.** з Жодзіна.
**Юр'ю Б.** з Кобрынскага раёну.
**Караліне К.** зь Мядзельскага раёну.
**Васілю К., Леаніду Д., Аляксандру Л.** зь Віцебску.
**Яўгену Л.** зь Лідзкага раёну.
**Галіне Ч.** з Рэчыцы.
**Іне П., Л.Я.** з Пухавіцкага раёну.
**Міколу В.** зь Белаазёрску.
**Уладзіславу М.** з Калінкавіцкага раёну.
**Ларысе Р.** з Калінкавічаў.
**Міхаілу М.** са Стоўпцаў.
**Вользе Б.** са Століну.
**Вячаславу С., Валеру П., А.А.** з Баранавічаў.
**Мікалаю К.** з Івянцу.
**Ігару Б.** зь Бярозы.
**Алегу Ш.** з Шаркоўшчынскага раёну.
**І.М., Міхаілу Т.** са Слуцку.
**Івану П., Пятру Б.** зь Берасьцейскага раёну.
**Андрэю Г., Уладзімеру Ш., Стэфану Н., Міхаілу А., Мікалаю Ч.** з Наваполацку.
**Юрасю Ч., Анатолю С.** з Мазыру.
**А.М., Алене П., Алегу М.** з Гомелю.
**Аляксандру Д.** з Карэліцкага раёну.
**Леанарду М., Веры С., Ігару Б., Ліліі В.** зь Берасьця.
**Мікалаю В.** з Пружанскага раёну.
**Аляксандру М.** з Астравецкага раёну.
**Анатолю Б., Тадэвушу Ш., Вячаславу В., Уладзімеру М.** з Маладэчна.
**Уладзімеру Ш., А.Г., С.М., Н.Б., В.Б., Андрэю Ф., П.Д., В.П., Д.К., В.Г., Сяргею Ш., А.Ш., Алесю Л., Міколу А., Л.Г., Вользе К., С.П., Пятру Р., Але К., Тэрэсе Р., Ю.В., Іраідзе З., Яўгену Ш., Анатолю М., Міхаілу Ш., Аляксандру К., Міхаілу Ш., Ніне Ш., У.Л., Анастасьсі Ж., Багуславу Я., Аляксею К., Сямёну Л., Уладзімеру З., У.К., Канстанціну Г., Уладзімеру Г., Сяргею Я., Мікалаю К., Вользе Г., Ганьне К., Андрэю Л., Натальлі М., Л.І., Марыне З., Надзеі М., Ігару Г., Уладзімеру М., Г.Б., Андрусю Дз., Валянціне Дз., Станіславу Ш., Анатолю С., Марыне П., Віктару М., П.І., Аляксею П., А.Д., Э.С., Анатолю Г., І.З., В.Я., А.А., Ігару Б., А.Н., Рэгіне Б., Уладзімеру Б., Элеаноры Б., Андрэю Б., Валянціне Г., Віталю Р., Таісе Ж., Вользе Ш., А.Л., Раману М., Але Г., Яўгену І., Аляксандру Б., Паўлу Ч., Веры С., Вячаславу Р., Леаніду Г., Н.А., Мікалаю С., Валянціну Ш., В.І., І.З., В.С., Г.С., Ю.Б., А.Б., Канстанціну Л., Эле С., Ільлі А., Уладзімеру С., І.С.** зь Менску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** — Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3012 206 280 014** — Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перэказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

## Беларуская Смаленшчына ўжо ў сеціве!

**Беласточчына, Віленшчына, Дзьвіншчына, Пскоўшчына, Браншчына, Севершчына і Смаленшчына — гэта тое, што ўжо ніколі ня будзе беларускім паводле прыкметы дзяржаўнай ці адміністратыўнай.** Аднак ці будзе там Беларусь культурная і нацыянальная, залежыць ад нас.

Праект «Беларуская Смаленшчына» зьяўляецца спробай пакуль што аднаго чалавека прыцягнуць увагу грамадзкасьці да пытаньня беларускага насельніцтва сучаснай Смаленскай вобласьці — тэрытарыяльна-адміністратыўнай адзінкі Расейскай Фэдэрацыі.

Асноўныя мэты праекту: папулярызоўваць гісторыю і культуру Беларускай (Заходняй) Смаленшчыны; прапагандаваць беларускую самасьвядомасьць сярод смаленскіх беларусаў; асьвятляць усе апошнія навіны, якія тычацца беларускага элемэнту Смаленшчыны.

Этнолягі, гісторыкі, літаратары і ўсе зацікаўленыя Беларускай Смаленшчынай могуць адсылаць на электронную скрыню faberrashed@gmail.com свае тэксты, інфармацыю, фатаздымкі, пытаньні, заўвагі і прапановы.

**Farid Berrashed**

## Унівэрсытэт не для чужых вачэй

**Зь мінулага тыдня на ўваходзе ў галоўны корпус Берасьцейскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту адбываецца кантроль за наведнікамі.**

Кожны студэнт ці супрацоўнік унівэрсытэту павінен паказаць студэнцкі білет ці пасьведчаньне супрацоўніка, толькі яны даюць права ўвайсьці ва ўнівэрсытэт. Колькі будзе дзейнічаць гэты загад рэктара — невядома.

Перад унівэрсытэтам пастаянна трымаецца натоўп, студэнты і выкладчыкі капаюцца ў сваіх торбах у пошуках дакумэнтаў, альбо моляць ахоўцу хуценька прапусьціць, бо спазьняюцца на пары.

Што цікава, такая праверка наладжана толькі ў галоўным, адным з чатырох корпусаў унівэрсытэту, і толькі ў адной навучальнай установе, і ўжо ня ў першы раз. Перад прэзыдэнцкімі выбарамі ці іншымі палітычнымі кампаніямі зьяўляецца перад уваходам ахоўнік, які пільна вядзе праверку.

**Студыёзус**

## Па-беларуску — значыць белая варона!

**Вучань 9 клясы Станіслаў С. спытаў у настаўніцы гісторыі: «А чаму падручнік па гісторыі Беларусі выдалі на расейскай мове?»**

Настаўніца адказала: «Школа расейскамоўная, і кляса таксама расейскамоўная , таму й такія падручнікі!»

Станіслава не задаволіў адказ, і ён зноў запытаўся: «Дык чаму тады падручнік па беларускай літаратуры выдадзены на беларускай мове? Чаму не на расейскай?»

Выкладчыца ўсклікнула : «Ну, гэта ж беларуская літаратура!»—«А калі нават я вучуся ў расейскамоўнай школе й расейскамоўнай клясе, ці магу я вывучаць гісторыю Беларусі па-беларуску?» — пацікавіўся Стась.

«Ну калі ты, значыць, патрыёт, тады можаш узяць падручнік у школьнай бібліятэцы, але пры гэтым толькі ты адзін будзеш распавядаць хатняе заданьне на беларускай мове! Табе ўсе зразумела?!» — гучна і зьдзекліва пракрычала настаўніца.

У папярэднія гады ў маладой выкладчыцы гісторыі праблемаў зь беларускай мовай не ўзьнікала. Аб мінулым нашай краіны яна свабодна распавядала дзецям па-беларуску.

На перапынку Станіслаў узяў падручнік па гісторыі Беларусі на роднай мове, каб працягваць вучыць прадмет па-беларуску, няхай сабе і адзін з цэлае клясы.

Хлопцу вельмі не спадабалася тое, што зрабіла беларускае Міністэрства адукацыі ў дачыненьні да гісторыі, мовы і культуры ўласнае краіны.

«Якіх грамадзянаў выхаваюць падручнікі па гісторыі не на нашай спрадвечнай мове? Хто нас вучыць? Ці будуць большымі патрыётамі сваёй Радзімы спрэс расейскамоўныя людзі? — хочацца запытацца хлапцу ў нашых чыноўнікаў, настаўнікаў і ўсіх беларусаў.

**АЛ, Менск**

## Імёны свабоды

**З задавальненьнем прыняў запрашэньне Ўладзімера Арлова наведаць сталіцу і прысутнічаць на прэзэнтацыі новай кнігі пісьменьніка.** Разам з старэйшым сынам Антосем імчым у Менск. Шлях нязблізкі. Амаль 300 кілямэтраў аддзяляюць Менск ад Багданаўкі — палескай вёскі, што паміж Пінскам і Лунінцом.

Пасьпелі, і нават занялі свабодныя месцы. Бо потым ня тое што сядзець — стаяць не было дзе. Сын быў уражаны колькасьцю гасьцей. Пабачыў наяве славутых беларускіх літаратараў, навукоўцаў, палітыкаў. Будзе пра што распавесьці сябрам, а таксама ў школе на ўроку літаратуры...

Шмат хто з выступоўцаў адзначаў, што Ўладзімера Арлова ведаюць у Эўропе. Але я хачу адзначыць і тое, што Арлова ведаюць у самай глыбінцы беларускага Палесься, у маёй роднай вёсцы Багданаўка. Вяскоўцы ведаюць гэтае імя, памятаюць сустрэчу зь ім.

Прыемна адзначыць і тое, што ў вёсцы слухаюць «Свабоду». І ня проста слухаюць. Люд удзельнічае ў розных праектах, конкурсах, людзі пішуць допісы на радыё. Назіраецца пэўная актыўнасьць простых людзей і гэта надае аптымізму.

Удзячнасьць Уладзімеру Арлову і радыё «Свабода» за цудоўную кніжку і за вельмі патрэбны праект пад назвай «Імёны свабоды». Спадзяюся, што ён будзе доўжыцца і беларусы будуць ведаць пра сваіх славутых землякоў, змагароў за свабоду Радзімы.

**Мікола Ільлючык, Багданаўка**

## Беларускі Калегіюм

Прапануе **дадатковае навучаньне** па спэцыялізацыях:

— журналістыка

— найноўшая гісторыя

— філязофія/літаратура

Запрашаюцца **студэнты старэйшых курсаў** альбо **асобы з вышэйшай адукацыяй**. У выключных выпадках прымаюцца студэнты малодшых курсаў. Навучэнцамі БК могуць быць тыя, хто пастаянна альбо на час навучаньня пражывае ў Менску.

**Навучальныя праграмы** БК арыентаваныя на выкладаньне найноўшых фрагмэнтаў сучаснай веды і не дублююць існуючыя праграмы дзяржаўных і недзяржаўных унівэрсытэтаў.

Сэртыфікат Калегіюму **не замяняе** дыплём аб вышэйшай адукацыі.

Навучаньне ў БК — **бясплатнае.**

Пачатак заняткаў з **1 кастрычніка 2007 г.**

Запіс на сумоўе па 26 верасьня б.г.

**Дадатковую інфармацыю** можна атрымаць праз тэл. **(017) 267 66 27**, **(029) 705 46 66**, **(029) 679 26 82 з 14.00 да 18.00** (акрамя суботы і нядзелі), на ***http://bk.baj.ru*** ці праз ***kalehium@gmail.com.***

## Бяз пашпарту нікуды

**Хачу вам распавесьці адну сытуацыю, якая адбываецца са мною даволі часта ў розных месцах пры розных абставінах, але заўсёды мае аднолькавы зьмест.** Цёплым восеньскім днём з такім жа настроем зайшла я ў офіс МТС, каб памяняць любімы нумар. Чую незадаволенае: «Дзе падключаліся?» Спрабую ўспомніць, бо прайшоў ужо ня год і ня два. Ага, жыла ў Менску, але штогод мяняла прапіску. Не жывеш у інтэрнаце — выпісвайся, шукай іншы прытулак. Успомніла і радасна гавару. У адказ чую, што калі ў мяне зьмянілася прапіска, то перад тым, як мяняць любімы нумар, я мушу напісаць заяву аб зьмене дадзеных у пашпарце. Атрымліваю блянк па-расейску, запаўняю на роднай мове. Гэтакіх выкрунтасаў апэратарка сьцярпець не магла, маўляў, блянкі прымаюцца толькі запоўненыя «правільна». Я спакойна адказваю, што, калі б жыла ў Расеі, запаўняла б па-расейску, у Англіі — па-ангельску, а ў Беларусі запаўняю па-беларуску. Дзяўчына злуецца не на жарт: «Ня хочаце запаўняць так, як трэба, тады і нумар я мяняць вам ня буду, ня маю права».

Запаўняла я яшчэ не адзін блянк, пасьля чаго дзяўчына сказала мне, што паслуга будзе актывізаваная праз суткі, але гэта яшчэ трэба будзе зайсьці і ўдакладніць. А між тым у кожнай краіне Эўропы набыць сім-карту можна ў любым кіёску, і нікому нават у галаву ня прыйдзе перапісваць пашпартныя дадзеныя. Каго ж мы баімся?

**Іна Кебікава, Клецак**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Будучыня клясычнага правапісу

Карыстацца клясычным правапісам у інтэрнэце ніхто не перашкодзіць. Піша **Сяргей Богдан.**

Ідэя Сяргея Дубаўца пра неабходнасьць правапіснага аб’яднаньня мае дзьве заганы — яна абстрактная і не зважае на наяўныя зыходныя ўмовы, на «дадзенае», кажучы мовай дакладных навукаў. Апрача таго, яна настолькі розьніцца ад лініі, праводжанай сп.Дубаўцом дагэтуль, што сапраўды шакуе. Калі пераход да адзінага правапісу як сродак выратаваньня папяровай «Нашай Нівы» яшчэ можа быць зразуметы, дык прапанова гуртам перайсьці ўсім на адзіны правапіс, навязваны дзяржавай, выглядае слаба абгрунтаванай.

## Аб’яднаньне з пустэчай

Дубавец прапануе аб’яднацца, але не тлумачыць, як будзе выглядаць аб’яднаньне і яго мэханізм. Другі бок дэманструе, мякка кажучы, адсутнасьць усялякай цікавасьці да інакшае думкі і жаданьня яднацца. Адзіна рэальным мэханізмам аб’яднаньня ёсьць толькі наша капітуляцыя. На што, зрэшты, часам некаторыя ў гісторыі пагаджаліся.

Камізм у тым, што няма зь кім аб’ядноўвацца. Тэарэтычна мусіць быць другі белмоўны бок, правапіс якога мы пагаджаемся, дзеля нацыянальнага адзінства, прыняць, каб зажыць у згодзе. Аднак «з таго боку» ёсьць толькі рэпрэсіўная дзяржава і забітае асыміляванае насельніцтва. І ў гэтай дзяржавы няма прычынаў пра нешта з намі дамаўляцца, яе чыноўнікі ўпэўненыя, што могуць і так усё вырашыць, бяз нас. Мы для яе — ніхто. Нам прапаноўваецца толькі падпарадкавацца або быць змолатымі на муку.

Улічваючы такі падыход з боку рэжыму, варта і нам заняць рэальна-палітычную пазыцыю. Адпаведна, любыя пляны аб’яднаньня і супрацы з рэжымам павінны мець рэальна-палітычны характар і грунтавацца на цьвёрдых разьліках, інакш скончацца катастрофай. Колькі адсоткаў дзяржаўных пасадаў, колькі адсоткаў субсыдыяў і колькі адсоткаў этэрнага часу атрымае нацыянал-дэмакратычны рух за тыя ці іншыя саступкі? І колькі прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі будуць запрошаныя пасьля Вашага, сп.Дубавец, аб’яднаньня да ўдзелу ў працэсе фармаваньня культурнай палітыкі, ці хаця б яе моўнага кампанэнту? Давайце назавем канкрэтныя ўмовы, паглядзім, што нам можа даць аб’яднаньне шляхам адмовы ад адной з ідэяў.

Калі ж адмова гэтая адбываецца, маўляў, дзеля таго, што ідэя аджыла, дык гэта проста не стасуецца з нашымі ранейшымі дэклярацыямі і патыхае канфармізмам. Вы прапануеце нам выбар — украінскі (аб’яднаньне) ці ірляндзкі (захаваньне цяперашняй сытуацыі) варыянт. Аднак забываецеся на кантэкст — украінскі варыянт магчымы пры наяўнасьці ва Ўкраіне адноснага палітычнага плюралізму. Гэта вырашыла лёс моўнай палітыкі ў краіне. Гэтых умоваў у Беларусі няма і ўкраінскі варыянт тут з гэтых прычынаў немагчымы.

Праблема беларускага руху палягае ў яго бясконцай гатовасьці саступаць. Саступка — гэта не кампраміс і нават не адступленьне пад націскам сілы. Калі трэба ратаваць «НН» ад гэтага моўнага закону, дык ня трэба здымаць сьцяга, трэба гучна абвесьціць пра тое, што правапіснае адступленьне вымушана адбываецца перад націскам нападнікаў дый перанесьці сьцяг на іншую пазыцыю — у той самы інтэрнэт. Гэта захавае гонар нацыянальнага руху.

Сёньняшнія пляны ўладаў нагадваюць пляны расейскай імпэрскай адміністрацыі перавесьці летувісаў на кірыліцу. Тут жа, здаецца, і розьніца шчэ меншая — якімі літарамі пісаць па-летувіску. Але не паддаліся летувісы і гінулі пад кулямі памежнікаў кнiганошы друкаваных «ня тымі» літарамі кніжак з Усходняй Прусіі. Будаваньне нацыі пачынаецца не з дамоваў аб аб’яднаньні-капітуляцыі, а з вымаўленага разам слова «Не!» на тое, што мы не прымаем.

## Без фарысэяў не было б жыдоў

Цяпер па сутнасьці. Сапраўды, ці так важнае напісаньне мяккіх знакаў і іншыя рэшткі фанэтычнага прынцыпу напісаньня? Пасьпяхова існуюць мовы, у якіх фанэтыка і правапіс моцна адрозьніваюцца — ад ангельскай да арабскай.

Гэта сапраўды дапушчальна ў выпадку добра разьвітых і пашыраных моваў, носьбіты якіх маюць цьвёрдае ўяўленьне, як гучыць тое ці іншае слова і здольныя яго распазнаць нават па няпоўным і недасканалым графічным адлюстраваньні літарамі, дый вымавіць слушна.

Але зь меншымі мовамі ці мовамі пад пагрозай зьнікненьня сытуацыя цалкам адваротная. Іх носьбіты, што жывуць ва ўмовах панаваньня іншае мовы, ужо маюць праблемы з распазнаньнем фанэтычнага адпаведніка графічнае формы. Прасьцей кажучы, ня ведаюць, як чытаць слова, напісанае недасканалым з пункту гледжаньня фанэтыкі іх роднае мовы альфабэтам.

**Працяг на старонцы 28.**

## Ні кроку назад

**Пераход на наркамаўку быў бы крокам назад, да 1933 году.** Наркамаўка стваралася як мост паміж беларускай і расейскімі мовамі. Каб за сьветлым часам камунізму ўліцца ў сапраўдную «вялікую» мову. Таму, калі мы не жадаем ісьці на іншы бераг нахалеры нам уваходзіць і на той мост?

Клясычны правапіс — адзін з традыцыйных складнікаў беларускасьці: мова, Пагоня, бел-чырвона-белы сьцяг. На гэтым трыадзінстве трымаецца і будзе трымацца беларускі дух.

Ужо позна нешта мяняць і вырашаць. Любыя крокі назад будуць успрынятыя людзьмі як параза.

Калі мы адмовімся ад клясычнага правапісу, дык тады ўжо можам дайсьці і да адмовы ад Пагоні са сьцягам. Бо карыстаньне імі цяпер таксама прыводзіць да падзелу нацыі. А нашчадкі пасьля, калі Беларусь пасталее і замацуецца, гадкоў праз 50, разьбяруцца і са шчырым сэрцам прымуць Пагоню, узьдымуць бела-чырвона-белы сьцяг і пяройдуць спрэс на тарашкевіцу...

Цікава, што канфлікт наркамаўкі й клясычнага правапісу сёлета ўжо адбыўся ў Сусьветным сеціве, на старонках Вікіпэдыі. Тамака без абмеркаваньняў, ды ўлікаў грамадзкай думкі ўсе артыкулы на тарашкевіцы былі проста перанесеныя ў архіў. Засталіся каля 2000 артыкулаў на афіцыйнай мове. (Дарэчы, калі б аўтары больш за 10000 артыкулаў на клясычным правапісе, паспросту ў адзін дзень вярнулі б свае тэксты на беларускую Вікіпэдыю, ніякі б адміністратар ня здолеў бы нічога зрабіць).

Наркамаўка адверне найперш сапраўдных, шчырых патрыётаў. Тых, для каго мова — сапраўды жыцьцё, хто заўжды размаўляе на роднай мове.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

# Будучыня клясычнага правапісу

Працяг са старонкі 27.

Яны прачытаюць яго паводле гучаньня, якое навязвае ім дамінантная навокал мова — на якой яны вучыліся, якую чуюць штодня. Таму і абэцэды для такіх моваў ствараюцца **фанэтычныя** — зірнеце хаця б на новапісьменныя каўкаскія мовы ці бліжэйшую кашубскую. Каб іх носьбіты дакладна ведалі, **што і як чытаць**.

Слушна чытаць беларускі наркамаўскі тэкст, вядома, можна. У двух выпадках — а) калі вы вельмі ўпэўнена валодаеце беларускай мовай і б) калі вы вывучылі адпаведныя разьдзелы акадэмічных граматыкаў па артаэпіі і фанэтыцы. Людзей катэгорыі А няшмат, нават многія белмоўныя маюць ужо праблемы з фанэтыкай праз асыміляцыю. Трэба быць навукоўцам ці апантаным чалавекам, каб трапіць у катэгорыю Б.

Таму ў прынцыпе адмова ад тарашкевіцы вядзе нас да разбурэньня падставаў нашае мовы ў сфэры яе фанэтыкі, і нават адмова толькі ад мяккага знаку моцна зьменіць нашу мову ў сёньняшніх умовах.

Той-сёй параўноўвае тарашкевістаў з эвангельскімі кніжнікамі-фарысэямі. У гэтым граматычным выпадку з гонарам прымаю гэтае параўнаньне. Фарысэі — кепскія людзі для хрысьціянаў, бо не прынялі Хрыста. Для габрэяў фарысэі як і золаты — гэта людзі, якія выратавалі габрэйскую нацыю. Першыя — сваёй зацятасьцю да літаральнае кніжнае мудрасьці, а другія — упартасьцю і фанатызмам. Бо яна была б асыміляваная, калі б прыняла Хрыста, як гэта сумна ні гучыць для хрысьціянскага вуха.

Працягну жыдоўскія паралелі. Габрэі ратаваліся праз кнігі, празь літаральнае аднаўленьне пісанага і друкаванага. Яны маўчалі па-жыдоўску, але чыталі, старанна адтвараючы сваю традыцыю з пакаленьня ў пакаленьне. Сёньняшнія беларускія адраджэнцы таксама збольшага маўчаць па-беларуску, але чытаюць і пішуць. Таму тарашкевіца — гэта ня проста пытаньне мяккага знаку, гэта пытаньне, ці захаваем мы **сваю** мову, ці атрымаем у дадатак да крэольскае культуры БССР-РБ яшчэ і яе лінгвістычны кампанэнт — крэольскую мову. Так склалася, што для беларускае культуры мова мае большае значэньне, чым для іншых. На сёньняшнім этапе гэта збольшага пісьмовая, а ня вусная мова. Таму мы так зацята баронім яе форму. Бо пакуль апроч мовы мы не дафармавалі сваёй выразнай ідэнтычнасьці ў іншых сфэрах, дый на мове больш **пішам** і **чытаем**, чым гаворым.

Дзіўна, сп. Дубавец, было ацэньваць некалі правапісы, як «рэпрэсіўныя», у рамках этычнага канфлікту. Відаць, лепш было ўсё-ткі іх паводле практычнасьці ацэньваць. Але важны іншы аспэкт — умяшаньне дзяржавы ў сфэру, якая ёй ня мусіць падпарадкоўвацца — навуку і культуру. Нават ня так істотна, што расейскамоўная дзяржава піша драконаўскія законы белмоўным грамадзянам. Пасьлядоўна і цынічна дзяржава парушае істотны прынцып калектыўнага сужыцьця — ня лезь, куды ня трэба.

Дзяржава бессаромна займаецца моўнай інжынэрыяй, і нездарма дэп. Здановіч спасылаецца на маляйзійскі прыклад штрафаў за моўную чысьціню. Вельмі цешыць заўсёдная гатовасьць людзей з савецкай адукацыяй чыста савецкім мэтадам выцягваць патрэбныя ім спасылкі, «забываючыся» патлумачыць кантэкст. Здановіч маўчыць пра тое, што Маляйзія проста мэтаскіравана аддзяляе свой варыянт адзінай малайскай мовы ад інданэзійскага варыянту тае самае мовы — вобразна кажучы, штрафуе за наркамаўку! Маляйзійцам ідзецца не пра захаваньне, але пра сэлекцыю.

Багаты ілюстрацыйны матэрыял і аргумэнты падбіраюцца прыхільнікамі новага закону з усяго сьвету, апрача Беларусі. Тут для іх не існуе апанэнтаў, яны іх «ня бачаць», а бачаць толькі хаос — скланяючы зь інтэрвію ў інтэрвію няшчасны «парлямэнт-парлямант».

## Адзіны правапіс ёсьць

Абсалютны нігілізм адраджэнцаў не дазваляе і ім пабачыць аўтарытэты. Прыклад таму — закіды наконт уяўнай неўнармаванасьці клясычнага правапісу. Ілюстрацыі да таго маюць у крытыкаў тарашкевіцы анэкдатычны, а не навуковы характар, на ўзроўні: быў у мяне знаёмы рэдактар, дык ня ведаў, як пісаць тое ці іншае слова. Даруйце, можна знайсьці мноства адукаваных людзей, якія ня будуць ведаць, як пісаць тое ці іншае расейскае слова, але ж гэта ня будзе азначаць неўнармаванасьці расейскае мовы. Давайце ня будзем пераносіць заганы адукацыі пэўных асобаў на мову. Як чалавек, што актыўна карыстаецца ім усё сьвядомае

## Мяккі знак — сьцяг нязгоды

**Дзякуй шаноўнаму В.Тарасу за тое, што не стамляецца ставіць вострыя пытаньні. Мне, аднак, праблема бачыцца пад іншым вуглом.**

Небясьпека — «у самым існаваньні двух узаконеных», але не варыянтаў мовы, а дзяржаўных моваў! Беларускую мову не пачуеш ні ад аднаго высокага чыноўніка, дэпутата ці афіцэра, а міністры ад адукацыі не крычаць аб пагрозе для мовы, а робяць (мёртваму прыпаркі) нейкія новаўводзіны ў правапіс.

Крывадушнікі! У іх пагоны тырчаць з-пад вопраткі!

Сёньня абываталь, паўсюдна бачачы толькі *расейскую* мову, не адрозьнівае «тарашкевіцу» ад «наркамаўкі». А той, хто адрозьнівае, хутчэй за ўсё рэгулярна чытае, піша па-беларуску. А значыцца, ня мае нічога супраць беларускай мовы. Такім людзям, думаю, можна растлумачыць і прыгажосьць і неабходнасьць клясычнага правапісу.

Мяккі знак клясычнага правапісу — гэта сьцяг! Гэта сьцяг нязгоды з разбурэньнем беларускай культуры!

Жыве Беларусь!

**Яўген, Бярозаўка**

## Мае бацька і маці...

**Мае бацька з маці нарадзіліся ў Расеі і ў Менск пераехалі ўжо пасьля вайны. Па крыві я напалову расейка, напалову габрэйка.** Нарадзіўшыся ў Менску і пражыўшы ў ім вось ужо сорак з гакам гадоў я ніколі ня ведала і не «вывучала» беларускую мову. Больш за тое, лічыла яе непрыгожай і непрыемнай, а беларускую культуру, за выняткам хіба што Караткевіча зь Міцкевічам, неіснуючай. Лічыла да 19 сакавіка 2006 году. У той дзень мне пашчасьціла пачуць сапраўдную беларускую мову.

Сьпярша, як галодны воўк накідваецца на хлеб, я зачаравана слухала канцэрты і дыскі беларускіх музыкаў і ўчытвалася ў старонкі «Нашай Нівы». Потым узьнікла жаданьне загаварыць на гэтай прыгожай мове, але катастрафічна бракавала слоўнікавага запасу. Каб яго папоўніць, вырашыла паспрабаваць пракласьці з ангельскай на беларускую аповесьць любімай ірляндзкай пісьменьніцы. Абклалася слоўнікамі, пачала пераклад, але атрымлівалася відавочнае ня тое. Калі я паспрабавала вымаўляць напісанае, у галаве гучалі галасы Вольскага і Сасноўскага, «вымаўляўшыя» іншыя гукі, ды і пасьля чытаньня «Нашай Нівы» на пісьмо прасіліся ня тыя літары, што прапаноўваў слоўнік. Знайшоўся чалавек, які патлумачыў, што «Наша Ніва» выходзіць «клясычным правапісам» у адрозьненьне ад агульнапрынятай «наркамаўкі». Ён жа дапамог знайсьці ў інтэрнэце добры падручнік і праграму праверкі артаграфіі, якая падтрымлівае «клясычны правапіс». Знайшліся і папяровыя падручнікі.

І я не ўяўляю сабе іншага правапісу, чым цяперашні нашаніўскі.

**Вольга В., Менск**

жыцьцё, сьведчу: клясычны варыянт белмовы ўнармаваны дастаткова, каб ім ільга было карыстацца без асаблівых праблемаў.

Пры ўсіх заганах нашаніўскай мовы газэта ўжо каторы год выходзіць менавіта гэтым правапісам і фактычна (побач з «ARCHE» ды іншымі выданьнямі, накшталт ранейшай «Свабоды») стварыла канон, якога можна сьмела трымацца адукаванаму чалавеку. Канчаткова гэты канон замацаваны групай **белмоўных навукоўцаў** (адцемце абодва словы) на чале зь Зьм.Саўкам. Сур'ёзных, навукова абгрунтаваных заўвагаў да яго выказана не было. Прыватныя крыўды на аўтара і адрозьненьні густаў ня ўлічваюцца. На гэтым пытаньне правапісу для беларусаў можна лічыць вырашаным.

## Клясычны правапіс для новае тэхналягічнае эры

Нават пры прыняцьці новага закону і жорсткіх перасьледах за клясычны правапіс улада нічога ня зможа зь ім зрабіць, калі грамада нашых нацыянальных аўтарытэтаў прыме канчатковае рашэньне застацца з тарашкевіцай. Бо нават зьнікненьне тарашкевічных папяровых «НН» і «ARCHE», ці іх пераход на наркамаўку не паўплывае на сытуацыю з аднае прычыны — інтэрнэту.

Спыніць карыстаньне ім ужо амаль немагчыма і фільтру на мяккія знакі не паставіш. У той самы час усё больш людзей, асабліва новага пакаленьня, чытае не папяровае, а электроннае. За імі будучыня — за тымі, хто карыстаецца новымі тэхналёгіямі, непадкантрольнымі дзяржаўнаму рэгуляваньню ў прынцыпе.

Пісаць на клясычным правапісе ў інтэрнэце ніхто не перашкодзіць. І з кожным днём гэтым займаецца ўсё больш людзей. Тэндэнцыі цешаць. Каб жа толькі нашы цяперашнія капітулянцкія дыскусіі ня зьбілі іх з панталыку. Таму трэба чым хутчэй спыніць спрэчкі пра абы-што, перавесьці пры патрэбе папяровыя выданьні на той правапіс, якім іх дазволяць друкаваць, і, зразумеўшы, што будучыня — не за паперай, разьвіваць нармалёвыя выданьні ў той сфэры, якая амаль непадкантрольная ўладзе — у нэце і на электронных носьбітах.

Што да разуменьня тарашкевіцы народам, ёсьць даўні прыклад тарашкевічнай «Свабоды» зь яе фантастычным як на сёньня накладам пачатку 1990-х. І мноства прыкладаў мутанцкіх наркамаўскіх ці ўвогуле дзьвюхмоўных выданьняў, якія ня маюць чытача. Які сэнс арыентавацца на стандарт Мінадукацыі, якое вучыць беларускіх школьнікаў мове, калі белмова Мінадукацыі ў жыцьці выкарыстоўваецца збольшага толькі ў шапках канцылярскіх блянкаў?

## Асаблівасьці нацыянальнай граматыкі

У кожнай мовы ёсьць свае асаблівасьці, і ня трэба імкнуцца адпавядаць канонам чужых моваў — маўляў, вось, у вялікіх моваў — францускай, ангельскай, расейскай ды іншых — усё адзінае. Існуюць жа і прыклады, калі мовы маюць паралельныя графічныя варыянты, як то сэрбская, якая пасьпяхова існуе на лацінцы і кірыліцы.

Праўдападобна, што спробы гвалтоўнае моўнае інжынэрыі і спрычыненыя імі пераломы ніколі нельга выправіць цалкам. І нярэдка яны сканчваюцца падвоенасьцю. Пасьля камуністычнай рэформы кітайшчыны зьявілася два варыянты і ў вялікай кітайскай мовы — кантынэнтальны КНР і іншы, клясычны. Два правапісы застануцца існаваць у белмове і пераадолець гэта будзе цяжка. Бо ідзецца пра розныя прынцыпы, розныя бачаньні жыцьця, гісторыі і розныя міталёгіі. Можна бачыць у гэтым і нашу бяду, і наш набытак.

* * *

Такая яна — Беларусь. Зь дзьвюма душамі ў веры, гісторыі, псыхіцы. А цяпер яшчэ і ў правапісе. Яднае нас талеранцыя. Нашае адзінства — гэта талерантнае задзіночаньне розных. І ніхто не павінен навязваць сваё як адзінае правільнае. А дзяржава цяпер спрабуе зрабіць акурат гэта. Адказаць ёй трэба адзінай абаронай нашай талерантнай разнастайнасьці, а ня спробамі дамовіцца з нападнікамі.

*Маладэчна*

## Згодны з Тарасам

**Наконт артыкулу В.Тараса «Ці прычакаем белага дыму?» («НН», №32) і мне карціць уткнуць свой грош, бо з асноўнымі думкамі Тараса я згодны.**

Сапраўды, «існаваньне двух узаконеных варыянтаў мовы» вядзе да разбурэньня стандартнай яе формы, што адбіваецца на пісьменнасьці карыстальнікаў, асабліва вучняў, і можа адштурхоўваць ад беларускай прэсы, каб ня сеяла ў галовах блытаніны, не зьніжала пасьпяховасьці ў навучаньні. Думаю, што і некаторыя абаронцы «тарашкевіцы» думалі найперш пра свае амбіцыі. Бо інакш яны б разгледзелі, што амаль усе зьмены, якія яны прапагандавалі, — гэта драбяза. Толькі перадача асыміляцыйнага зьмякчэньня зычных («ь») вартая таго, каб за яе спрачацца. Але ж і яна не абавязковая для дасканаласьці правапісу. Успомніце, як апантана ніхто іншы як сам Я.Лёсік выступаў (гл. яго даклад на акадэмічнай канфэрэнцыі 1926 г.) за адмену гэтай нормы. Выступаць то ён выступаў, але сам на практыцы нормы не парушаў! Ён не парушаў *запавету* вялікага свайго папярэдніка Б.Тарашкевіча, які «сам цяпер бачыць дужа выразна цэлую чараду яшчэ спрэчных пытаньняў..., але не бярэцца праводзіць якія колечы паважнейшыя зьмены *такім індывідуальна-партызанскім спосабам... Гэта павяло б толькі да шкоднага хаосу*» (Б.Тарашкевіч. Беларуская граматыка для школ. Вільня, 1929. Прамова).

Плакаць па валасах (нават па адным валосіку — «ь») ня час, калі над шыяй завісла сякера. Барацьба за павышэньне грамадзкага статусу мовы — толькі за гэта сёньня трэба змагацца, а не разьядноўвацца з-за «ь».

**І.Крамко, Менск**

# «Тарашкевіца» — уцёкі ад канкурэнцыі

Па-мойму, сп. Богдан «загаварыў праблему», бо ўсе ягоныя высновы маюць дыскусійны характар і адводзяць у бок ад галоўнага. Таму я спынюся толькі на адной выснове-пытаньні. З кім яднацца?

Найперш, са школай. Базавыя моўныя веды пасьля школы не пераглядаюцца абсалютнай бальшынёй нашых суайчыньнікаў і ўсё, што напісана «няправільна», або патрабуе тлумачэньняў, або — што часьцей — застаецца адкінутым.

Па-другое, яднацца з абсалютнай бальшынёй актыўных у справе беларускай асьветы, навукі і літаратуры людзей. Чаму не карыстаюцца клясычным правапісам Генадзь Сагановіч, Міхась Казлоўскі, часопіс «Наша вера», газэта «Наш час», беластоцкая «Ніва», бальшасьць рэгіянальных выданьняў асьветнага й краязнаўчага характару? Гэта пытаньне да іх, для мяне — так ёсьць. Па-трэцяе, яднацца з абсалютнай бальшынёй беларускамоўнай кніжнай ды іншай друкаванай прадукцыі. Давайце глядзець праўдзе ў вочы. Клясычным

**Працяг на старонцы 30.**

# «Тарашкевіца» — уцёкі ад канкурэнцыі

Працяг са старонкі 29.

правапісам сёньня пасьлядоўна карыстаецца столькі друкаваных пэрыёдыкаў, колькі можна пералічыць на пальцах адной рукі. І гэта выключна т. зв. элітарныя выданьні. Усё, што разьлічвае на водгук у шырокім народзе, карыстаецца афіцыйным правапісам.

Заўважце, я ні разу не сказаў пра яднаньне з «расейскамоўным рэжымам», якому мы павінны складаць канкурэнцыю. «Тарашкевіца» сёньня — гэта ўцёкі ад такой канкурэнцыі ў свой паралельны сьвет. Нас ува ўсёй гэтай справе мусіла б клапаціць будучыня мовы і найбольш мэтазгодныя для яе крокі й захады. У 1990-я гады такім крокам было пашырэньне клясычнага правапісу, асабліва сярод моладзі. Сёньня мэтазгодна вярнуцца да афіцыйнага. Заўтра, магчыма, будзе сэнс у чарговым наступе клясыкі. Але давайце не губляць адчуваньня гэтае мэтазгоднасьці дзеля будучыні мовы.

**Сяргей Дубавец**

# Калі майсеі сыходзяць

З нагоды артыкулаў Сяргея Дубаўца й Віталя Тараса ў «НН» (аб неабходнасьці і своечасовасьці пераходу на адзіны правапіс).

І вадзіў Майсей народ свой па пустэльні сорак гадоў, і прытаміўся ён, і зьвярнуўся да народу свайго ды сказаў: «Усё, хлопцы, досыць, вяртаемся назад у Эгіпет, да фараона». І прыступіўся да яго народ ды пытае: «Чаго ж так?» І адказаў ім Майсей: «Хадзілі мы сорак гадоў, а бальшыня народу нашага так і не пайшла за намі, засталася ў няволі эгіпецкай». І сказалі людзі: «То як жа цяпер наконт зямлі абяцанай?» І адказаў ім Майсей: «Ня гэтым разам, мальцы, ня гэтым разам... Заблудзіўся я».

*Біблія паводле С. Дубаўца.*
*Частка «Зыход і вяртаньне». Разьдзел 3 (апошні?)*

Пачаткова мне хацелася напісаць пра здраду, пра паражэнства й капітулянцтва, пра нож у сьпіну й стрэл у плечы, пра стому й зьнявераньне, пра хаваньне ўласнага *я* за безаблічна-абагульненым *мы*. Аднак сканцэнтруюся на некаторых цьверджаньнях, якімі апэруе сп. Дубавец.

*С.Д.: Неўзабаве новыя правілы стануць законам.*

Яшчэ 25 жніўня 2006 году БелТА, а за ёю ўсе, каму яшчэ дазволена *вяшчаць*, абвясьцілі: праз 2 тыдні прэзыдэнт падпіша адпаведны дакумэнт. Два тыдні цягнуцца ўжо больш за год, а паводле старшыня камісіі ПП У.Здановіча, «закон должен вступить в силу 1.09.2010» («КПвБ». 8.08.2007). Ды праз 3 гады, як гаворыцца ва ўсходнай прыпавесьці, мо ці шах памрэ, ці асёл здохне... А Сяргей заклікае бегчы паперадзе паравозу.

*С.Д.: Візуальна гэта будзе мадэрнізаваная «наркамаўка». За тым выключэньнем, што ў нас, прыхільнікаў*



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

*«тарашкевіцы», больш няма падставаў для этычнага канфлікту.*

Гэта будзе ня толькі візуальна, але й па сутнасьці «наркамаўка».

*С.Д.: Новыя правілы дадуць нам падставу гаварыць пра адну беларускую мову на постсавецкім этапе яе разьвіцьця.*

Беларуская мова й так адна. Сяргей сьвядома ці несьвядома блытае мову ў цэласьці і адзін зь яе разьдзелаў — артаграфію. І не адзін ён, — гэта характэрна ці не для паловы дыскутантаў. У нас няма праблемы, зь якою жывуць, напрыклад, грэкі (суіснаваньне старагрэцкай і навагрэцкай моваў) або кітайцы (яны размаўляюць на сямі розных мовах, аднак герагліфіка дазваляе ім карыстацца адзінаю пісьмоваю сыстэмаю). І ня варта гэтую праблему выдумляць.

*С. Д.: агульнанацыянальны моўны працэс.*

Яго няма. Навуковыя канфэрэнцыіператварыліся ў кваліфікацыйныя паседжаньні. Часам у канфэрэнцыйнай залі сядзяць толькі кандыдаты ў кандыдаты: самі сабе прачыталі свае тэзы, самі сабе не задалі ніводнага пытаньня па сутнасьці агучанага, самі скінуліся па $10 на зборнік тэзаў — бінго, ёсьць па яшчэ адной пазыцыі ў сьпіс публікацыяў да дысэртацыі.

Інстытут мовазнаўства жыве пад штодзённаю пагрозаю быць пераведзеным на балянс аднаго з унівэрсытэтаў, што дэ-факта азначала б зьнішчэньне інстытуту (так фактычна зьнік Скарынаўскі цэнтар, перададзены БДПУ). Унівэрсытэцкая ж навука (прынамсі ў галіне мовазнаўства) ледзь ліпіць.

*С. Д.: Што замінае нам прыняць новыя правілы ў якасьці адзіных?*

1. **Іх недасканаласьць і супярэчлівасьць**. Толькі пару прыкладаў зь Міністэрскага праекту: у § 15.3 знаходзім напісаньне *Нью-Ёрк*, затое ў § 18.1 — *Нью-**Й**орк*, а ў § 22.23 зноў — *нью-**ё**ркскі*. У § 17.4 — *пяцьдз**я**сят, шэсцьдз**я**сят*, але ўжо ў § 60.1 — *пяцьдз**е**сят, шэсцьдз**е**сят.* І такога бязладзьдзя там поўна. Дык зь якім напісаньнем кансалідавацца?

2. **Факт іх «новасьці»** — артаграфічныя правілы ня можна безупынна перараблаць і падграблёўваць.

3. **Кулюарны характар іх выпрацоўваньня**. Нават Інстытут мовазнаўства адсунуты ад рыхтаваньня дакумэнту.

4. **Карны кампанэнт** будучага закону. Ні сталінская пастанова 1933 г., якая паклала пачатак артаграфічнаму расколу, ні хрушчоўская пастанова 1957 г. ня ўтрымлівалі разьдзелу аб пакараньні за парушэньне нормы.

5. **Насьцярожанасьць** у дачыненьні беларускай мовы **з боку ўладаў** («А, гэта ўсё бээнэфаўцы!»).

6. **Абыякавасьць пераважнай часткі грамадзтва** да праблемы мовы.

* * *

Рана ці позна майсеі сыходзяць — фізычна ці духова. А народ працягвае ісьці да зямлі абяцанай.

(скарочана)

**А што Вы думаеце пра гэта? Пішэце нам.**
**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Мова школы, мова асьветы

Няхай будзе так, прызнаю сваю здраду, капітуляцыю і нават Майсея твайго вешаю на сябе. Але зусім не мая сьціплая пэрсона прадмет гэтай дыскусіі. Што? Скажу крыху пазьней. Спачатку колькі словаў пра саму дыскусію. Яе ўдзельнікі падзяліліся на два лягеры, два спосабы размаўляць. Фігуральна кажучы, адныя гавораць кропкамі (як ты, Зьміцер), другія — коскамі (з чаго я й пачаў). Мяне цікавіла ня тое, кім, якім чынам і што там дзе распрацоўваецца. Не пра тое гаворка. Аўтару кожнай «кропачнай» тырады мне хочацца задаць пытаньне: «А што ты прапануеш?» І паколькі я адказ даўно ведаю (не чапаць! — што значыць, — нічога), дык вось жа і ўзяўся за пяро. Ніякай відзежы моўнае будучыні ты, Зьміцер, не прапануеш. Год не прапануеш, два гады, пяць гадоў… А я, апроч заняпаду агульнае сытуацыі, нічога іншага ня бачу. І тут пераходжу да прадмету дыскусіі.

Дзесяць, пятнаццаць, дваццаць гадоў таму ў Беларусі стварылася рэальная сытуацыя правапіснага распадзелу, які адыгрываў зусім не мовазнаўчую ролю. У часы рэальнае пагрозы незалежнасьці краіны мы мусілі ўсімі сіламі мацаваць беларускую адрознасьць ад расейшчыны, каб новае пакаленьне візуальна адчула, што беларус — ня «тоже русский», як пра тое казала афіцыйная прапаганда. Сёньня яна гаворыць пра «незалежную Беларусь» — фальшыва, вядома, але сам панятак беларускай незалежнасьці замацаваўся ў розумах нацыі. Наступны крок — напоўніць гэты панятак беларускім зьместам, навучыць адрозьніваць усё беларускае ад усяго расейскага. Вось чаму калі 10 гадоў таму «тарашкевіца» ў якасьці альтэрнатывы афіцыёзу адыгрывала цалкам пазытыўную ролю, дык сёньня яна — у той самай ролі — стала раскольніцкай і разбуральнай. Інтэнцыя беларушчыны ў розумах усяго народу сёньня настолькі слабая, што «грэцкі» або іншы падвойны варыянт проста не «загрузіцца», кажучы па-кампутарнаму, у галовы. Што мы й бачым. Паміж моваю школы і мовай асьветніцкае літаратуры не павінна быць розьніцы. Нельга ад усяго народу чакаць высілкаў элітарнага характару. Асабіста мне ў задзіночаньні мовы школы і асьветы бачыцца найбольш плённы для беларушчыны шлях. Можа быць, ты бачыш нейкі іншы шлях, Зьміцер?

І, вяртаючыся да Майсея, хачу ўдакладніць параўнаньне. Рэч у тым, Зьміцер, што гэта не Майсей у нас павёў народ у зямлю абяцаную, а два дзясяткі майсеяў, аддзяліўшыся ад народу, самі сабою рушылі ў паход. Некаторыя й сёньня ўспрымаюць сваю «тарашкевіцу» як подзьвіг, як змагарны чын, хоць гэта ўсяго толькі рабочае пытаньне, і думаць варта было б пра заўтрашні дзень. Што да мяне, дык я проста ня бачу сэнсу ў сваім перабываньні сярод майсеяў, а бачу толькі шкоду для агульнае справы.

Ня думаю, што ў мовазнаўчай дыскусіі ў нас з табой, Зьміцер, было б шмат разыходжаньняў. Але я паставіў тут зусім не мовазнаўчыя пытаньні. Падобна, што сродкамі мовазнаўства на іх адказаць немагчыма.

**Сяргей Дубавец**

# Некалькі заўваг да дыскусіі аб пераходзе на адзіны правапіс

Піша **Андрэй Дынько.**

Гаворка сёньня мусіць ісьці не пра тое, які правапіс далейшы ад расейскага, ці ў якім менш непасьлядоўнасьцяў, ці які больш палітычна правільны, ці які бліжэйшы да існых дыялектаў. Такі падыход толькі сварыў бы беларусаў між сабою. Гаворка сёньня хай ідзе выключна аб сфэры ўжытку таго ці іншага правапісу. Правапіс — гэта інструмэнт мовы.

Выступаю тут як выдавец, як працаўнік адзінага на сёньня выдавецтва («Наша Ніва»/«ARCHE»), якое пасьлядоўна выкарыстоўвае клясычны правапіс.

Так, за 20 гадоў абсяг ужытку клясычнага правапісу ня стаў вялікім. Цікава, што нават часопіс «Спадчына», намесьнікам рэдактара якога працуе кадыфікатар клясычнага правапісу Вінцук Вячорка, перайшоў на афіцыйны правапіс (па чым ціха прыпыніў сваё існаваньне). Затое ў інтэрнэце клясычны выкарыстоўваюць два самыя папулярныя сайты на беларускай мове — радыё «Свабода» і nn.by, а агульная колькасьць тэксту клясычным правапісам у нэце перавышае колькасьць тэксту афіцыйным. Каб пераканацца ў гэтым, досыць увесьці ў пашукавік, напрыклад, «сёньня» і «сёння».

І хоць гэта ад таго, што пакуль толькі некалькі працэнтаў насельніцтва карыстаецца інтэрнэтам, што чытач «Звязды» і «Настаўніцкай газеты» яшчэ ня выйшаў у нэт, гэта яскрава паказвае, да якога правапісу хіліцца актыўны беларускамоўны чалавек у сытуацыі свабоднага выбару.

Так, клясычны правапіс ня стаў прыняты ў якасьці ўсеагульнага, кансэнсуснага прынцыпу Беларушчыны. Мова, бел-чырвона-белы сьцяг, «Пагоня» прыняліся, а правапіс застаецца адным з найменш засвоеных. Не прыжыўся «этэр», ня звыкся «валянтэр», рэдка хто піша «філёляг».

Ёсьць віна пратаганістаў праекту: правілы перапрацоўваліся 15 гадоў, слоўніка пад яго ня маем дагэтуль, граматыкі ня маем, і гэта стварае пэўныя цяжкасьці ў нашай выдавецкай дзейнасьці. Сярод іншага, у будучыні гэта будзе ствараць ускладненьні ў знаходжаньні беларускага тэксту пашукавікамі.

Як выдаўцы, мы зацікаўленыя ў пасьлядоўнасьці культурных стратэгій незалежнага грамадзтва і ў адкрытасьці беларускай культуры. Беларушчына будзе нармальна разьвівацца тады і толькі тады, калі на ёй будуць стварацца вартыя ўзоры высокай культуры, як пісаў В. Булгакаў. Калі мы паставім пытаньне так: які інструмэнт спрыяе таму, каб такія высокія кшталты культуры ствараліся, «наркамаўка» ці «тарашкевіца»? Мой адказ будзе: бяз розьніцы.

Зараз некалькі заўваг на палях тэксту Сяргея Богдана.

«*Калі пераход да адзінага правапісу як сродак выратаваньня папяровай «Нашай Нівы», відаць, яшчэ можа быць зразуметы, дык прапанова цалкам перайсьці ўсім на адзіны правапіс, навязваны дзяржавай, у прынцыпе выглядае слаба абгрунтаванай*», — піша Сяргей Богдан.

Не пагаджуся. Пераход на адзіны правапіс можа быць абгрунтаваны толькі стратэгічнымі задачамі — палепшыць камунікацыю інтэлігенцыі з шырокім грамадзтвам, адолець расколы і адкінуць інструмэнты беларускай культуры, якія не прыжыліся. Калі гэта трэба — тады можна гаварыць пра пераход на адзіны правапіс. Аднак у тактычных мэтах, дзеля ціску ўладаў (якога пакуль няма) ці іншых кароткатэрміновых задачаў пакідаць традыцыю няможна.

Калі мы лічым, што пераход на адзіны правапіс палегчыць камунікацыю інтэлігенцыі з грамадзтвам (сёньня сем зь дзесяці сумленных інтэлектуалаў аддаюць перавагу клясычнаму правапісу, але толькі для дваіх з сотні беларусаў чытаньне клясычным правапісам не ўяўляе складанасьці), калі мы лічым магчымым пашырэньне ўплыву беларускага незалежнага грамадзтва ў пэрспэктыве бліжэйшых 15—20 гадоў, трэба пераходзіць на адзіны. Калі мы не спадзяемся пашырыць уплыву ў бліжэйшыя дзесяцігодзьдзі, калі галоўнае на сёньня не пашырэньне ўплыву, а захаваньне чысьціні ідэі, тады трэба заставацца пры клясычным правапісе як прынцыпе, хоць яго ўжытак будзе абмяжоўваць выкарыстаньне тэкстаў у паўсядзённай практыцы.

Гаворка ў любым разе пра выбар інструмэнта, і ня больш.

«*Колькі адсоткаў дзяржаўных пасадаў, колькі адсоткаў субсыдыяў і колькі адсоткаў этэрнага часу атрымае нацыянал-дэмакратычны рух за тыя ці іншыя саступкі?*» — пытаецца Сяргей Богдан.

Гэта няправільнае разуменьне пазыцыі С. Дубаўца. Ён заклікае не да аб'яднаньня з рэжымам, а да таго, каб эфэктыўней змагацца з лукашэнкаўцамі за ўплыў на грамадзтва.

«*Сёньняшнія пляны ўладаў нагадваюць пляны расейскай імпэрскай адміністрацыі перавесьці летувісаў на кірыліцу. Але там не было носьбітаў кірыліцы, а ўсе пісьменныя людзі карысталіся літоўскай лацініцай*».

Істотная памылка, калі падыходы стогадовай даўніны некрытычна пераносяцца на сёньняшні дзень. Тады сялянскія масы былі неасьвечанымі і пазбаўленымі нацыянальнай ідэнтычнасьці, сяляне былі данацыянальнай, у сваёй большасьці, супольнасьцю. Цяпер людзі валодаюць ня толькі пэўным правапісам, але і пэўнай ідэнтычнасьцю, і гэта іншая сытуацыя. Прытым варта нагадаць, што і ў 1911 годзе «Наша Ніва» шляхам апытаньня чытачоў выбрала адзіны правапіс — кірыліцу, адмовіўшыся ад лацінкі.

«*Што да разуменьня тарашкевіцы народам, ёсьць даўні прыклад*

*тарашкевічнай «Свабоды» зь яе фантастычным як на сёньня накладам пачатку 1990-х*».

Тут мушу разьвеяць адзін устойлівы міт. Фантастычны наклад «Свабоды» («агульны наклад 90 000, першы завод 43 000» — пісалася ў выходных зьвестках газэты) быў піяр-крокам геніяльнага рэдактара І. Герменчука. Рэальна наклад «Свабоды» ніколі ня быў вышэйшы за 43 тысячы, гэта значыць 6% ад накладу тагачаснай «Народнай газэты» і 21% ад накладу «Звязды» — тады час быў такі, што газэты чыталі масава, і па-беларуску чыталі масава.

Дарэчы, украінцы таксама маюць сваю тарашкевіцу. У іх яна называлася «скрыпнікаўка». Аднак ад 80-х у масавых СМІ і ў масавай палітычнай агітацыі яны выкарыстоўвалі толькі школьны правапіс і не саромеліся гэтага. Напэўна, у Беларусі сталася іначай ад таго, што беларускі нацыянальна-дэмакратычны рух меў вузейшую сацыяльную базу, і літаратары і філёлягі складалі сярод ягоных лідэраў у канцы 80-х большы адсотак. Ва ўкраінцаў дагэтуль клясычным правапісам выходзяць толькі некалькі інтэлектуальных часопісаў і дыяспарных газэтаў.

А вось беларусы на клясычны перайшлі, і традыцыя ўтварылася, стала фактам.

«*Таму трэба чым хутчэй спыніць спрэчкі пра абы-што, перавесьці пры патрэбе папяровыя выданьні на той правапіс, якім іх дазволяць друкаваць*».

Незалежнае грамадзтва ня можа дазволіць сабе гуляць на ўмовах праціўніка. Калі пераходзіць ці не пераходзіць — дык у апошнюю чаргу таму, што хтосьці дазволіць ці не дазволіць, а ў першую чаргу з думкаю пра тое, у чым мы бачым больш карысьці, больш шанцаў для беларускай культуры. Хай цісьнуць — цьвярдзейшымі будзем. Аднак калі мы бачым у нечым больш шанец для разьвіцьця нашай культуры, яе пашырэньня — тое і мусім выбіраць.




**Тарашкевіца ці наркамаўка?**

Варта яшчэ зазначыць, што гаворка тут і цяпер ідзе не пра адмову ад традыцыі ці нейкі іншы пераварот, а, відаць, толькі аб правапісе двух найбуйнейшых, разьлічаных на масавую аўдыторыю беларускамоўных рэсурсаў — «Нашай Нівы» і радыё «Свабода», аб правапісе кніг, разьлічаных на школьную аўдыторыю, і правапісе палітычнай агітацыі.

Такія рашэньні можна прымаць толькі ў залежнасьці ад выбару чытачоў «Нашай Нівы», nn.by і svaboda.org, а таксама аўтарытэтаў, да якіх сёньня мы адносім найперш былых і цяперашніх палітвязьняў, і, самае галоўнае, такія рашэньні трэба прымаць згодна з сытуацыяй. Без дагматызму, але і без тармасы, бяз кіданьняў зьлева ўправа.

**Андрэй Дынько**

## Пётра Рудкоўскі: Нацыянальная культура ўжо ніколі ня будзе маналітнай

З камэнтароў на сайце «НН» да артыкулу Андрэя Дынька «Некалькі заўваг да дыскусіі аб пераходзе на адзіны правапіс».

Час вялікіх нарацыяў прайшоў. Што гэта значыць? Значыць, што сёньняшні чалавечак, магчыма, лепей і ўтульней пачуваецца ў субкультуры, чым у прасторы мэга-культуры. А што гэта яшчэ значыць? Па-мойму тое, што будаваньне нацыянальнай культуры адбываецца праз культываваньне субкультурных традыцыяў. Візія ўніфікаванай культуры — гэта, баюся, утапійная візія.

Калі гаварыць пра падзелы і расколы ў грамадзтве, дык я глыбока перакананы, што раскол на лініі «тарашкевіца»—«наркамаўка» — адзін з найбольш лагодных расколаў. Людзям цяжка паразумецца зь іншых прычынаў. Старэйшае пакаленьне — маладое, карыстальнікі інтэрнэтам і слухачы радыёкропак, веруючыя — няверуючыя, праваслаўныя — каталікі, лукашэнкаўцы — апазыцыянэры, пазьнякоўцы — лібэральныя нацыяналісты — вось няпоўны сьпіс больш-менш рэальных расколаў. І ўсялякія цяжкасьці ўва ўзаемапаразуменьні маюць, так бы мовіць, «няграматычны» характар.

Нацыянальная культура ўжо ня будзе маналітна-манатонна-манагеннай бытнасьцю. Ну, скасуем мы «граматычны» раскол... І пабачым, што на ступень паяднанасьці ў грамадзтве гэта ніяк не паўплывала, а тыя, хто нас дагэтуль не разумелі, надалей не разумеюць. А цана, якая за гэта плаціцца — занядбаньне вельмі важнай культурнай традыцыі, якая, як Вы самі прызнаеце, рэальна запатрабаваная многімі беларусамі.

# Прэзыдэнт у рэйтынгавай пастцы

«Сытуацыя стала горшаю, тэндэнцыя — лепшаю». Гэты жартоўны афарызм Юр'я Дракахруста прэтэндуе на эпіграф канфэрэнцыі «Да новага бачаньня Беларусі», што адбылася ў Кіеве 10—12 верасьня. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Гэту сустрэчу арганізаваў у Кіеве (здагадайцеся з трох разоў, чаму ня ў Менску) Беларускі інстытут стратэгічных дасьледаваньняў.

Бадай, для ўсіх экспэртаў (і неэкспэртаў таксама:) ёсьць відавочным, што сытуацыя ў нас, і найперш у зьвязку з энэргетычным канфліктам, зрушылася. Пытаньне у тым, які кірунак працэсаў.

Палітоляг Валер Карбалевіч не выключае аўтарытарнай мадэрнізацыі паводле кітайскай схемы.

Эканаміст Павал Данэйка лічыць: патрабаваньні інвэстараў трансфармаваць эканамічную сыстэму ў рэшце рэштаў падштурхнуць і палітычныя зьмены.

Сацыёлягі — дык тыя і ўвогуле мяркуюць, што прэзыдэнт загнаны ў «рэйтынгавую пастку». Каб ня страціць папулярнасьць, трэба няспынна падвышаць дабрабыт. А ён, у сваю чаргу, фармуе іншую каштоўнасную гіерархію: патрэбы ў паўнавартаснай інфармацыі, самарэалізацыі і г.д.

Зрэшты, ставала на канфэрэнцыі і пэсымістычных нотак: маўляў, рэжым здольны толькі закручваць шрубы, і гэнае шчасьце нам — надоўга. Хтосьці заклікаў калегаўмысьляроў пакінуць барыкады ды генэраваць канцэпцыі ў вежы са слановай косткі. Хтосьці традыцыйна хвастаў палітычную апазыцыю: ня ловіць мышэй, старым лідэрам час на звалку і ўсё такое.

У сваю чаргу, Юры Дракахруст (вядомы многім як аўтар «Праскага акцэнту» на «Свабодзе») сфармуляваў тэзу не зусім паліталягічна, але выразна: «Развагі беларускіх інтэлектуалаў пра шматлікія памылкі апазыцыі зьяўляюцца пераважна ня чым іншым, як кіданьнем пантоў». Зь ягоных словаў, у Беларусі за апошнія гады перабралі практычна ўсе магчымыя канцэпты барацьбы за перамены — нічога не працуе.

«Ад якасьці апазыцыі, — робіць выснову аналітык, — не залежыць, калі адбудзецца зьмена рэжыму. Ад гэтай якасьці залежаць формы, у якіх адбудзецца зьмена: чым ніжэйшая якасьць — тым большая імавернасьць крывавага пераходу. А самае галоўнае — ад якасьці апазыцыі залежыць тое, што будзе пасьля зьмены. Нават калі яна, сёньняшняя апазыцыя, і ня будзе адыгрываць тады галоўнае ролі».

А ў тым, што ніводная рэвалюцыя, нават аранжавая, ня робіць усіх задаволенымі, можна было лёгка пераканацца, выйшаўшы на Храшчацік. Насупраць мэрыі — намёты пікетоўнікаў. Чалавек з мэгафонам кляймуе ўлады за тое, што зачышчаюць пераходы мэтро ад дробных прадпрымальнікаў. Побач змагаюцца за свае правы нейкія сабакаводы разам з сабакамі:) Бясспрэчны прагрэс у тым, што ніхто не дастае дручком па сьпіне: пікеты пад вокнамі бацькоў гораду — дазволеныя.

Увогуле ж паводле многіх парамэтраў — нам бы іхныя праблемы.

**Што гаварылі ў Кіеве:**

**Эканаміст Павал Данэйка:** Беларускі бізнэс баіцца лібэралізацыі, бо, мяркуе ён, пры ёй можа прыйсьці расейскі капітал і ўсё апанаваць.

Раней мы былі за незалежнасьць. А цяпер за што? Ранейшая плятформа апазыцыі вычарпала сябе, бо зрэалізавалася. Грамадзтва чакае ад апазыцыі новых канкрэтных прапановаў.

Беларусь чакае падзеньне канкурэнтаздольнасьці прадукцыі ў выніку таго, што Расея імкліва мадэрнізуе ўласныя вытворчасьці. Гэта ўжо адбылося ў харчовай прамысловасьці і неўзабаве адбудзецца таксама ў машынабудаваньні. Гэтак, у Расеі неўзабаве адкрыюцца заводы «Рэно» і «Вольва».

**Сацыёляг Андрэй Вардамацкі:** Ад пачатку 2007-га рэйтынг Лукашэнкі зьмяншаецца. Рэйтынг Лукашэнкі адгэтуль носіць не харызматычны, а прагматычны характар і паступова набывае рысы інэрцыйнага.

**Сацыёляг Надзея Яфімава:** Аўдыторыя «Камсамолкі» абагнала аўдыторыю «Советской Белоруссии». З тэлеканалаў найпапулярнейшы — АНТ, з навінных праграмаў — «Наши новости». З радыёканалаў безумоўны лідэр — Першы канал і яго ранішнія праграмы. З ФМ-станцыяў лідэр — «Радыюс ФМ», за ім ідуць «Сталіца», «Русское» і «Рокс».

**Эканаміст Аляксандар Чубрык:** 40% беларускага экспарту ў 2006-м складалі нафта і нафтапрадукты.

За першы квартал 2007 г. замежная запазычанасьць вырасла на мільярд даляраў (за цэлы 2006-ы — на 1,7 млрд).

Дэфіцыт энэргетычнага гандлю мае вырасьці з 1,5 млрд у 2007 годзе да 4,5 млрд у 2011 годзе.

Гэта дазваляе меркаваць, што Лукашэнка будзе схільны правесьці выбары ў 2010 годзе.

Найбольш імаверны сцэнар — урад будзе кампэнсаваць дэфіцыт бягучых рахункаў за кошт далейшых замежных запазычаньняў.

Пры пазытыўным сцэнары разьвіцьця эканомікі сярэдні заробак дасягне ў 2010 годзе 480 даляраў, пры нэгатыўным — 400 даляраў.

**Украінскі палітоляг Алег Соскін:** Малаімаверна, што Лукашэнка выканае абяцаньне і аддасьць 50% «Белтрансгазу» Расеі

**Часовы паверaны Славаччыны ў Беларусі Любамір Рэгак:** Прыехалі мы з амбасадарам Бэнэтам у Магілёў да Фінькевіча. Прыйшоў палітрук,

# Пра Дабравольскага і Фядуту

Крытыканства надакучыла, піша **Барыс Тумар**.

Кіеўская канфэрэнцыя Беларускага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў стала вядомай, дзякуючы bon mot Аляксандра Фядуты, які на ёй назваў апазыцыйных палітыкаў «трупамі шматразовага выкарыстаньня». Заля пацяшалася, і завязаўся інтэлектуальны бой усіх супраць усіх.

Гэта разьняволіла ўдзельнікаў, але не адмяніла наступных фактаў.

Пераважная большасьць інтэлектуалаў гаварыла нашмат даўжэй за адведзены рэглямэнт. Прынамсі палова зь іх не пасаромелася выступіць з тымі самымі дакладамі, якія я ад іх чуў год таму.

Мякка кажучы, не рэалістычнымі падаваліся мне многія разважаньні, напрыклад, што адстаўкай Канаплёва Лукашэнка пачаў рыхтаваць пераемніка (Фядута), што Расея і Францыя не дазволяць Беларусі будаваць АЭС (Коктыш), ці рэкамэндацыі Дэмакратычным сілам: «Важнай задачай кампаніі [выбараў у палату прадстаўнікоў] ёсьць перамога хоць бы ў некалькіх выбарных акругах» і «На кожнай выбарнай акрузе вылучыць да пачатку кампаніі адзінага кандыдата ад АДС, а таксама мець дублёра на выпадак ягонага зьняцьця ўладаю» (Чарноў).

Аналітыкі працягвалі захоплена займацца дразьдазнаўствам. У часе сустрэчы восем разоў абсмоктвалася адстаўка Канаплёва і ні разу ніхто не згадаў аб працэсах Маладога Фронту.

Адказы палітыкаў на выпады ў свой адрас гучалі, прынамсі, інтэлігентна. Дабравольскі — якому Фядута папомніў усё: і забытыя праграмы, і няўдалыя байкоты — перакanaўча гаварыў пра разрыў між палітыкамі і аналітыкамі, пра неабходнасьць будзённай працы на месцах, якую нічым не заменіш. Раманчук гарачыўся, даказваючы, што ў Аб'яднаных дэмакратычных сілах няма сілаў прарасейскіх.

Палітыкі выглядалі больш канструктыўнымі (мо таму, што іх было меней?), хоць і Дабравольскі тройчы ўжыў слова «парадыгма».

У адзін дзень з канфэрэнцыяй БІСД Пуцін зьняў Фрадкова. Тут жа дзясяткі расейскіх аналітыкаў прадказалі прызначэньне Іванова. Каб праз тры гадзіны, пачуўшы прозьвішча Зубкоў, пачаць думаць пра Зубкова. Пуцін усім нагадаў: аналітыкі мяркуюць, а палітыкі выракуюць.

Ад канфэрэнцыі засталося пажаданьне, каб у Беларусі стала болей палітыкаў і меней аналітыкаў.

Хоць каму хочацца?.. Занятак сапраўднага палітыка-дысыдэнта — якімі ў нацыянальным маштабе ёсьць, напрыклад, Севярынец ці Мілінкевіч, а на мясцовым узроўні — Салаш або Пудаўкін — сёньня і рызыкоўны, і няўдзячны. Ён няўдзячны ўвогуле, а ў цяперашняй Беларусі ўдвая. Можна нарвацца, можна сарвацца ці, яшчэ горш, апраставалосіцца. Аналітыкам у гэтым сэнсе прасьцей: ніхто з тых, хто прадказваў прэм'ерства Іванова, ні рэпутацыі, ні пасады ня страціў.

Ня мае права называцца аналітыкам, хто ўмее толькі таптаць. Гэта як з мужам: жанчына мае такога мужа, якога заслугоўвае, якога сама выхавала.

У кожным разе, крытыканства надакучыла.

**Беларускі інстытут стратэгічных дасьледаваньняў**

быў заснаваны ў Вільні ў 2007. Аб'яднаў беларускіх навукоўцаў і інтэлектуалаў з розных асяродкаў і мае на мэце падтрымку палітычных і эканамічных дасьледаваньняў Беларусі. Зарэгістраваны ў Літве праз немагчымасьць дабіцца рэгістрацыі якойсьці прабеларускай незалежнай установы ў Беларусі. Дырэктарам інстытуту стаў доктар палітычных навук Віталь Сіліцкі.

**Якія найбольшыя дасягненьні незалежнага грамадзтва ў 2006-2007-м (па выбарах)?**

**Жанна Літвіна, старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў:** адзіны лідэр, прызнаны Эўропай

**Алесь Анціпенка, дырэктар Беларускага Калегіюму:** дасягненьне больш рэалістычнага бачаньня будучыні.

**Аляксандар Сасноў, сацыёляг:** зьмена ў грамадзкай думцы, калі большасьць стала выказвацца супраць саюзу з Расеяй

**Ірына Віданава, выдаўніца:** вырасла салідарнасьць (прыклад — акцыі падтрымкі каля судоў).

выгнаў. «Желаю вам почувствовать, что такое свобода», — кажа яму Бэнэт. — «Моя свобода был СССР», — выгукнуў палітрук.

Лукашэнка найлепшы агітатар за Эўропу. Бо паўсюль патрабуе эўрапейскай якасьці, эўрапейскіх стандартаў. Вось і гатэль назваў «Эўропа». Не «Каракас» і не «Масква». І нават глядзячы «Тур дэ Франс», бачыў не раварыстаў, а калосьсе. Яно ў нас чамусьці ляжыць, а ў Эўропе стаіць.

**Аляксандар Дабравольскі, АГП:** Сілаў адной апазыцыі замала для перамогі. Патрэбныя саюзьнікі.

**Марцін Бутара, чэскі сацыёляг і пісьменьнік, былы пасол Славаччыны ў ЗША:**
У аўтарытарных краінах ёсьць інтэлектуальная абсэсія на тэмы таго, што немагчыма. Усе кажуць: нішто немагчыма. І ёсьць іншая тэматычная абсэсія: дыктатар. Усе ў апазыцыі разважаюць пра дыктатара, аналітыкі занятыя бясконцым аналізам найменшых ягоных выказваньняў... Гэтыя абсэсіі контрапрадуктыўныя.

**Ганс-Георг Вік, дыпламат у адстаўцы:**
Над Беларусьсю павеяў вецер зьменаў, пачулі мы. Але ў які бок?

**Віталь Сіліцкі, палітоляг:**
Цяперашняя Беларусь нагадвае франкісцкую Гішпанію.

**Райнэр Ліндనэр, гісторык і палітоляг:**
Беларусь знаходзіцца на трэцім этапе трансфармацыі, які яна пачала з Лукашэнкам, а скончыць ужо без Лукашэнкі.

# Віталь Сіліцкі: «Задачы незалежнай супольнасьці шырэйшыя за зьмену рэжыму»

Напрыклад, у пытаньнях энэргетычнай бясьпекі неабходна мысьліць шырэй за лёгіку супрацьстаяньня «ўлада — апазыцыя». З адказаў палітоляга Віталя Сіліцкага, дырэктара Беларускага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў (БІСД), на онляйн-канфэрэнцыі радыё «Свабода», паводле вынікаў кіеўскай канфэрэнцыі БІСД.

## Пра Віктара Лукашэнку

Узмацненьне пазыцый Віктара Лукашэнкі цягам часу падаецца прадказальным і лягічным. Але варыянт пераемніка можа сапраўды «завіснуць» таму, што адмовіцца ад улады дзейны прэзыдэнт захоча яшчэ ня хутка.

## Пра пэрспэктывы Руху За Свабоду

Калі рух За Свабоду — гэта замаскаваная кампанія «Мілінкевіч 2011», то ў мяне вялікія сумненьні, што гэтую грамадзкую функцыю ён выканае. Тады гэта проста пятая партыя ў АДС.

## Пра рост дабрабыту

Будзе цікава паглядзець, ці зможа ўлада стрымаць паўстаньне грамадзянскай супольнасьці (сапраўднай, а не ў НДА-шным разуменьні), калі сярэдні заробак перасягне 500 даляраў, калі сярэдні спажывец будзе выціснуты з кухні ў публічную сфэру, калі адпачынак за мяжой стане нормай, а сучасныя камунікацыі будуць дасяжнымі для кожнага.

## Пра носьбітаў зьменаў

Сапраўдныя патэнцыйныя актары зьменаў — гэта тыя, хто пажынае плады адноснага дабрабыту. Спадзяваньні, што апазыцыю да ўлады прывядуць пакрыўджаныя адменай ільготаў пэнсіянэры, марныя.

## Пра Эўрапейскі марш

Пайду безумоўна. Ужо таму, што гэты марш аб'яўлены, а я чалавек праэўрапейскіх памкненьняў.

## Пра Зубкова

У Расеі вызначыўся пэўны кансэнсус што да Беларусі, і таму чакаць нейкіх радыкальных зьменаў у палітыцы ў залежнасьці ад асобы не выпадае.



## Пра АДС і Мілінкевіча

Я думаю, казаць можна пра пэрспэктывы дэмакратычнага руху ў Беларусі. Калі мы яго разьбіваем на складнікі, пэрспэктыва зьнікае па азначэньні. Калісьці Бэнджамін Франклін сказаў трапна — ці трымаемся разам, ці вісім паасобку.

## Пра дапамогу эмігрантам зь Беларусі

Ратаваньне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў. Набярыцеся мужнасьці, як Севярынец ці Дашкевіч. У вас у вольным сьвеце абараніць сябе магчымасьцяў нашмат больш, чым у тых патрыётаў, якія засталіся ў Беларусі.

## Пра Беларускі інстытут стратэгічных дасьледаваньняў

Доўгі час беларуская палітычная супольнасьць бачыла экспэртную выключна ў якасьці паліттэхнолягаў, калі хочаце, прарабаў, якія мусілі выканаць пэўную працу ў межах вызначанага праекту.

Мне здаецца, і ў апазыцыйных палітыкаў, і ў аналітыкаў ёсьць адна галоўная праблема — дэфіцыт адэкватнага бачаньня краіны, кірунку яе разьвіцьця. Такі дэфіцыт лепш за ўсё праяўляецца ў бясконцым чаканьні нейкага крызысу ці каляпсу. І калі старыя прагнозы не апраўдваюцца, заўжды можна намаляваць больш жудасную карціну апакаліпсісу, які мае адбыцца. Падчас нафтагазавага канфлікту ўзімку, здаецца, нават Настрадамус адпачываў.

Складваецца ўражаньне існаваньня сацыяльнай замовы на падобныя мантры, якую папросту старанна і адэкватна абслугоўваюць. Я пэрсанальна сутыкаўся з нараканьнямі, калі пісаў пра тую ці іншую тэорыю змовы ў атачэньні Лукашэнкі ці ставіў пад сумнеў чарговае прадказаньне эканамічнага каляпсу. Дык вось, мне акурат так і казалі, што я пазбаўляю людзей апошняй надзеі!

Яшчэ адно ўражаньне ад першай канфэрэнцыі БІСД — калі робіцца спроба перавесьці дыскусію з простага канстатаваньня ці тлумачэньня фактаў (напрыклад, чаму грамадзтва дагэтуль падтрымлівае Лукашэнку), ці з традыцыйнай крытыкі экспэртамі апазыцыйных палітыкаў, і перайсьці да пытаньня, а чым жа экспэрты дакладна могуць дапамагчы апазыцыі — то справа пераходзіць да размоваў, што «такой апазыцыі дапамагчы ўжо няма чым» або што «сытуацыя склалася так, што, якія б захады ні рабіла б апазыцыя, вынік будзе адным і тым жа і ад яе нічога не залежыць». І калі

першая лінія паводзінаў нагадвала жаданьне застацца «белым і пушыстым», то другая падштурхнула да больш грунтоўных роздумаў.

## Пра «барахтаньне» апазыцыі

Менавіта ваш пакорлівы слуга год таму абвясьціў пра непазьбежнасьць дысыдэнцкага пэрыяду ў палітычным жыцьці краіны, што акурат азначае, што цягам яго ад палітычнай апазыцыі і, больш шырока, ад палітычнай дзейнасьці шмат чакаць не вымагае не з прычыны неэфэктыўнасьці апазыцыі, а праз тое, што не існуе палітычнага працэсу як такога. На канфэрэнцыі гэтую тэзу разгарнуў Юры Дракахруст. Вось цытата зь ягонай прэзэнтацыі: «Спрэчкі пра тое, якія дзеяньні апазыцыі правільныя, а якія — памылковыя, па вялікім рахунку, ня маюць сэнсу. Дастаткова таго, што апазыцыя неяк варушыцца, барахтаецца, брыкаецца — гэта візуальны вобраз існаваньня альтэрнатывы. Гэта мінімум , але і максымум адначасна». І далей, «ад якасьці апазыцыі не залежыць, калі адбудзецца зьмена рэжыму. Ад гэтай якасьці залежаць формы, у якіх адбудзецца зьмена (чым ніжэйшая якасьць — тым большая імавернасьць крывавага пераходу), а самае галоўнае — ад якасьці апазыцыі залежыць тое, што будзе пасьля зьмены.» Іншымі словамі, і палітыкі і аналітыкі — гэта дзьве часткі таго ж самага дысыдэнцкага асяродку, які мала на што ўплывае, але ў варушэньні і брыканьні якога ёсьць нейкая самадастатковая каштоўнасьць — можна сказаць, акурат яна стварае нейкі абшар свабоды ў несвабодным грамадзтве, выпрацоўвае ідэалёгію зьменаў, якія невядома калі адбудуцца.

Такая пазыцыя зручная як для экспэртаў так і для палітыкаў. Першых гэта вызваляе ад адказнасьці, другім дае нагоду, скажам так, адмахнуцца ад крытыкі. Магчыма, мінімум — гэта сапраўды штодзённая дысыдэнцкая (асьветніцкая, праваабарончая і г.д.) дзейнасьць, якая ня ставіць мэтай дасягненьне нейкага палітычнага выніку. Але ці максымум гэта? Ці не залежыць тое, «што будзе пасьля зьмены» і нават калі яна будзе, ад таго, якім чынам апазыцыя «варушыцца, барахтаецца, брыкаецца?» Бо ва ўмовах адсутнасьці моцнай і інтэлектуальна падмацаванай апазыцыі ўлада здольная перажыць не адзін і ня два крызысы, на якія апазыцыйная супольнасьць так спадзявалася ўсе астатнія гады. Да таго ж, мы жывем у XXI стагодзьдзі, зь іншымі тэхналягічнымі і інфармацыйнымі магчымасьцямі, з нашмат больш шырэйшай ступеньню свабоды, чым была дадзена ўсходнеэўрапейскім дысыдэнтам 20—30 гадоў таму, і перадусім — з нашмат большымі чаканьнямі ад апазыцыі, якія сфармаваліся досьведам дэмакратычных прарываў у наваколльлі.

## Пра тое, чаму была Плошча

Калі казаць пра тое, як могуць экспэрты дапамагчы тым, хто яшчэ «барахтаецца», то тут трэба памятаць, што новы палітычны кантэкст, новыя надзеі, новая якасьць апазыцыі, калі яна і дасягалася, то дасягалася хутчэй не паліттэхналягічнымі распрацоўкамі, а мужнасьцю і самаадданасьцю тых людзей, якія выходзілі на плошчы, працавалі на вуліцах, лезьлі, як кажуць, напралом. На мой погляд, такі фэномэн як Плошча Каліноўскага стаў магчымы дзякуючы ўзьнікненьню новых формаў самаарганізацыі ў беларускім грамадзтве, паўстаньню нейкага архіпэлягу субкультураў, дзе людзі самі сабе літаральна выдзёўбваюць прастору свабоды, а значыць і ствараюць прастору для нейкай альтэрнатыўнай дзейнасьці.

## Пра тое, чаму не збываюцца прагнозы

Альтэрнатыўнай супольнасьці цяпер не хапае ведаў пра тое, што насамрэч уяўляе нашае грамадзтва, у які бок яно мяняецца, як адбываецца трансфармацыя сьветапогляду і каштоўнасьцяў і г.д. Іншымі словамі, наладжваньне камунікацыі з грамадзтвам немагчыма без разуменьня і вывучэньня сацыяльных кантрактаў, якія склаліся паміж уладай і насельніцтвам, з аднаго боку, і без высьвятленьня, тых групаў, якія могуць стаць фактарамі зьменаў, зь іншага.

Прывяду некалькі прыкладаў. Напрыклад, цягам прэзыдэнцкай кампаніі 2006 году прыватны бізнэс не падтрымаў заклік апазыцыі да эканамічнай лібэралізацыі. Таму што яна ўспрымалася як адкрыцьцё шлюзаў для расейскага капіталу, які б беларускі бізнэс проста зруйнаваў бы.

Другі прыклад — гэта гісторыя з адменай ільготаў у гэтым годзе, ад чаго шмат хто ў Беларусі чакаў сацыяльнага выбуху. На дзіва, грамадзтва на выразна непапулярныя меры амаль не адрэагавала, з той простай прычыны, што яны закранулі толькі адну ці дзьве сацыяльныя групы.

## Пра задачы незалежнай супольнасьці

Ад апазыцыйнай супольнасьці традыцыйна чакаюць выпрацаваньня «пазытыўных альтэрнатываў». Наконт гэтага пункту існуе багата мітаў, адзін зь якіх — што як толькі апазыцыя прадставіць грамадзтву тое, што апошняму спадабаецца, справы ў апазыцыі пайдуць угару. Скажу можа нават і насуперак таму, што сам часьцяком казаў і пісаў: пазытыўных альтэрнатываў за апошнія пятнаццаць год апазыцыя выпрацавала хоць адбаўляй. Праблема для яе ў тым, што значную частку ўлады проста пераймаюць і прадстаўляюць у якасьці ўласнага ноў-хаў, што вельмі лёгка зрабіць, калі каналы камунікацыі паміж апазыцыяй і грамадзтвам парушаныя і прад’явіць прэтэнзіі на аўтарства вельмі лёгка. Так Лукашэнка ў нас стаў галоўным барацьбітом за незалежнасьць, а зорку героя за макраэканамічную стабілізацыю, аб неабходнасьці якой прафэсар Багданкевіч так упарта гаварыў, атрымаў спадар Пракаповіч. І такіх прыкладаў можна прывесьці яшчэ шмат. Улада адчувае болевыя кропкі ў сваёй канструкцыі і робіць захады, каб іх ліквідаваць. Такім чынам, час ад часу атрымліваецца, што незалежная экспэртная супольнасьць працуе (і яшчэ будзе працаваць) на мадэрнізацыю ў рамках дзейнай сыстэмы. У выніку задаволеныя ўлады, задаволена грамадзтва, кепска толькі апазыцыі. Добра гэта ці кепска? З пункту гледжаньня традыцыйнай схемы каляпсу — безумоўна, кепска. Але трэба памятаць, што перад незалежнай супольнасьцю стаяць задачы, на мой погляд, нашмат шырэйшыя за пазбаўленьне ад рэжыму. Беларуская незалежнасьць яшчэ не да канца скансалідаваная, працэсы ў дачыненьнях з Расеяй не набылі незваротнага характару. І калі справа даходзіць пра пытаньні энэргетычнай бясьпекі, то проста неабходна мысьліць шырэй за лёгіку супрацьстаяньня «ўлада — апазыцыя».

# «Наша сумленьне сёньня

## Гутарка Сьвятланы Алексіевіч і Валянціна Тараса.

Невялікая публікацыя **Сьвятланы Алексіевіч** у «БелГазете» ўзрушыла вэтэрана беларускай літаратуры **Валянціна Тараса** так, што ён памкнуўся напісаць у «НН» адказ — гнеўны. Рэдакцыя прапанавала іншае — каб С.Алексіевіч і В.Тарас сустрэліся і пагутарылі. Запісвала гутарку **Наталка Бабіна**.

### «У нас ёсьць жывая думка і жывая творчасьць»

**Віталь Тарас:** Наш час наклаў на ўсіх адбітак неакрэсьленасьці, падвешанасьці. Людзі дакладна не разумеюць, чаго яны хочуць. Мяне па-сапраўднаму радуе, што ў гэтай постсавецкай дурноце выкрышталізавалася моладзь, якая дакладна ведае, да чаго імкнуцца. Яны найперш хочуць, каб была Беларусь — ня рай, не эдэм, але каб была НАША Беларусь. Канечне, беларуская мова адышла ў літаратуру. Яе няма на ТБ, на радыё, у грамадзкім жыцьці. Але калі чытаеш літаратуру, то бачыш, што мова — па-ранейшаму акіян, і з часам ён выплесьнецца і за межы літаратуры. Вось Барадулін — якія магутныя рэчы ён робіць! Ці Пашкевіч: яго дакумэнталістыка таленавітая. Ці Севярын Квяткоўскі: быў незаўважны хлопчык, а вось выдаў кніжку «Фрашкі ды пляшкі» — і я і рагатаў, і сьмяяўся, і плакаў, настолькі добра гэта напісана. Існуе, існуе сапраўдная літаратура. У «Маладосьці» яе шукаць ня варта. Яны па-за літаратурай. Літаратура пайшла адтуль у «Дзеяслоў», прыватныя выдавецтвы, інтэрнэт. Літаратура — гэта пераламленьне нашага часу. Я мала ўдзельнічаю ў грамадзкім жыцьці — і праз узрост, і праз тое, што, шчыра кажучы, мяне раздражняе цяперашняя апазыцыя, якая дванаццаць год топчацца на месцы. Але Плошча мяне натхніла. І натхнілі, як ні дзіўна, паходы потым на Акрэсьціна, каб перадаць перадачу ўнуку: гэта, з аднаго боку, нагадвала, канечне, 37-ы год, але, з другога боку, колькі годнасьці было ў гэтых людзях на Плошчы і на Акрэсьціна!

Якая ў нас моладзь! Паглядзіце на Насту Палажанку! Колькі годнасьці ў



Паўле Севярынцу! Можна не пагаджацца з тым, што ён узяў клерыкальны ўхіл. Па-мойму, гэта кепска і нават небясьпечна для будучыні. Але яго адвага, яго апантанасьць, яго ідэйнасьць ня можа ня выклікаць захапленьня. Яго, канечне, хочуць выціснуць з краіны, бо бачаць у ім выразнага лідэра.

І вось тут я хачу перакінуць мосьцік да Сьвятланы Аляксандраўны, да яе апошняга інтэрвію «Беларускай газеце», якое мяне ўзрушыла і засмуціла. Яна, падаецца, ня бачыць гэтага боку нашага жыцьця, гэтага боку нашай літаратуры. Нельга ставіць ў віну Сьвятлане тое, што жывучы за межамі Беларусі, яна крышачку адарвалася ад нашых рэаліяў, таму ёй парой падаецца, што тут ўжо нічога няма: ні літаратуры, ні філязофіі, ні гуманітарнай думкі... Але яны ёсьць. Трэба толькі акунуцца ў гэтае жыцьцё. З Парыжу ці Рыму вы ня можаце пабачыць усяго.

### «Пара скончаць з нацыянальным рамантызмам!»

**Сьвятлана Алексіевіч:** Адразу пра публікацыю у «БГ», якая так узрушыла Валянціна Яфімавіча. Я нават ня ведаю, ці гэта проста непрафэсіяналізм, ці такая маладая неахайнасьць, якая троху падобная на правакацыю, але я сама зьдзівавалася, што мяне так зразумеў малады карэспандэнт, калі прачытала нібыта свае словы на газэтнай паласе. Я ўсё ж укладала ў іх іншы сэнс. Але мне нават ня хочацца пра гэта цяпер гаварыць.

Аднак мне хацелася б адказаць Валянціну Яфімавічу. Я зусім ня думаю, што тут, у Беларусі, нейкая чорная дзірка і наогул нічога няма. Гэта зусім ня так. Гаворка пра другое: немагчыма захаваць ранейшы рамантызм нават ў нацыянальным, калі мы выкінутыя у сьвет. Я бачу ўсе рэчы як бы ў двух вымярэньнях: чалавек у нашым канкрэтным часе (які ўсе баяцца назваць капіталізмам, а ў нас — капіталізмам з дамешкам калгаснага сацыялізму) і вечны чалавек. Я бачу гэта вачыма сьвету і адначасова вачыма чалавека, які адсюль ніколі ня зьедзе. Таму ўсё, што выклікае такое чыстае захапленьне Валянціна Яфімавіча, мне таксама сымпатычнае. І падаецца вартым павагі. Але я бачу, што час зьмяняецца. І гэты час нам навырост. У нас занадта многа сілаў ідзе на барацьбу, і гэта наша катастрофа. Шмат у чым мы не дацягваем да часу. Занадта многа сілаў зьеў Лукашэнка, і яшчэ зьесьць. Чым мы занятыя? Барацьбой з Лукашэнкам. Мы не выходзім на мэтафізычныя прасторы. Мы ў рамках, навязаных нам рэжымам. Нас цешаць нейкія дробныя перамогі — вось, удалося перавесьці на нашу мову тое ці іншае — але наперадзе ў нас вельмі доўгі шлях. Магчыма, гэта і тупік. У гэтым наша трагедыя! Але, Валянцін Яфімавіч, інтэлектуалы павінны ясна ўсьведамляць: мы нацыя, якая спазь-

# ратуюць маладафронтаўцы»


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

нілася. Мы ў 21-м, жорсткім, стагодзьдзі. Пара скончаць з нацыянальным рамантызмам!

Гаворка яшчэ і пра тое, што беларускай літаратуры сёньня не чуваць. Так, яна ёсьць, але ці даходзіць да чытача, ці знаходзіць яго? Я цікаўлюся літаратурай, але я яе не знаходжу!

### «Мая беларуская мова — як зорка на вопратцы нарвескага караля»

**В Т:** Я хачу запярэчыць Сьвятлане. Па-першае, я ня згодны, што ў мяне рамантычны погляд на сьвет. Калі нацысты акупавалі Данію і прымусілі габрэяў насіць жоўтую зорку, дацкі кароль таксама нашыў на вопратку зорку Давіда. Дык вось, маё рашэньне пісаць і гаварыць па-беларуску — хаця раней я часта карыстаўся ў жыцьці і творчасьці рускай — гэта як зорка на вопратцы дацкага караля... Сёньняшняе становішча мовы патрабуе ад нас учынкаў, падобных да гэтага каралеўскага ўчынку.

Па- другое, наконт таго, што нас ня чуюць. А як дайсьці да людзей, калі нам проста ўсімі спосабамі імкнуцца заткнуць рот? Вы ведаеце, у якіх умовах існуе, напрыклад, «Наша Ніва», ведаеце, што існуюць чорныя сьпісы аўтараў і выдавецтваў?

**СА:** Я сама ў такім сьпісе! І гэта — нагода працаваць як можна лепш, як можна больш прадуктыўна. Вы гаварылі, што ўвесь наклад вашай кнігі «На высьпе ўспамінаў» — хаця яе адмовіліся браць дзяржаўныя крамы — разышоўся за некалькі дзён. Вось і адказ!

### «Лукашэнка скраў у нас час»

**СА:** Вы пытаецеся, як я стаўлюся да людзей нашага часу? Я бачу, што ў нас — патрыярхальнае грамадзтва, і гэта адчуваецца адразу, калі трапляеце ў Беларусь, адразу ў аэрапорце. А сьвет жыве ўжо неяк інакш. Я лічу, што самае страшнае, што зрабіў Лукашэнка — ён скраў у нас час. Асабіста ў кожнага з нас, і нават у нашых дзяцей. А сьвет існуе ўжо зусім іншымі праблемамі. Ня толькі захаваць мову, хаця праблема глябалізацыі — гэта жорсткая праблема. Ёсьць праблема амэрыканскай маскультуры: французы лямантуюць, што яна зьнішчае іх самабытнасьць! Французы, зь іх вялікай культурай! А ёсьць жа яшчэ праблема разбурэньня культуры як такой. І вось пытаньне: як напрацаваць новыя ідэі, з чым увайсьці ў сьвет? З нацыянальным кантэкстам мы ня ўвойдзем: гэта важна толькі для нас. Мы маглі б увайсьці ў мір з чарнобыльскім кантэкстам, але мы не прадумалі яго, мы яго не прапрацавалі. Мы яго не сфармавалі. У нас ёсьць толькі нейкае галашэньне.

А колькі цяпер спакусаў! Гэта і нацыянальная спакуса — а калі нацыянальнае не апрацаваць культурна, яно становіцца спакусай, — і рэлігійная. Вось вы гаворыце пра клерыкальны ўхіл Севярынца. Я цяпер многа езджу па Расеі і там гэта бачу вельмі выразна. Ужо няма нікога, хто скажа слова пра дух, акрамя папа. Поп становіцца лідэрам нацыі. Таму я паўтараю: мы недацягваем. Так, мы нешта робім, нешта пішам, але лідэра, валадара думак няма. Пастыраў няма. Быў Адамовіч, быў Быкаў. Адамовіч быў фігурай такога ж маштабу, як Вацлаў Гавел. Але народ яго ня выбраў. Ён выбраў старшыню саўгасу! Таму трэба рэальна ўяўляць, наколькі складаныя нашыя праблемы.

### «Мне баліць Беларусь»

**СА:** На адным з форумаў чытач НН даў мне такую характарыстыку: «Разумная баба, але не баліць ёй Беларусь» (*сьмяецца*). Але ня трэба забываць, што боль можна пераносіць па-рознаму. Не абавязкова боль — гэта плач, лямант і енкі.

**ВТ:** Найбольшы боль часам — думка, найбольш баліць — думаць.

**СА:** Так. Думаць — гэта прафэсія пісьменьніка. Думаць і гаварыць. У нашым доме жыў адзін дыплямат. Пры сустрэчах ён часта гаварыў мне: «Сьвятлана, навошта вы так адкрыта ўсё гаворыце. Ведаеце, улада вас проста раздушыць, растопча. Маўчыце пакуль!» І я яму адказвала: «Змаўчаць можна, але як потым з гэтым жыць? Сумленьне дзе падзець?» Гаварыць ці маўчаць, сядзець у норцы ці дзейнічаць — гэта пытаньне сумленьня. Наша сумленьне, наш гонар ратуюць сёньня хлопчыкі і дзяўчаткі маладафронтаўцы. Я захапляюся імі. Яны цяпер робяць тое, чаго не зрабіла наша пакаленьне. Адзінае, што я заўсёды гавару: нельга абмяжоўвацца толькі барацьбой. Нельга быць толькі рэвалюцыянэрам. Самае галоўнае, што павінен рабіць кожны — гэта рабіць сябе. Атрымліваць адукацыю, атрымліваць прафэсію, кшталтаваць дух і душу. Гэта галоўнае, што павінен зрабіць у жыцьці кожны чалавек.

**ВТ:** Эмацыйна сёньняшнія маладафронтаўцы шмат у чым нагадваюць падпольшчыкаў Другой усясьветнай. Можа, таму, што гэтыя маладыя людзі адчуваюць сябе цяпер як ва ўмовах нейкай акупацыі: навокал варожая прапаганда. Прапаганда на тэлебачаньні, ў газэтах, у так званай літаратуры (хаця гэта, канечне, не літаратура)... Я згодны са Сьвятланай, што вельмі важна будаваць сябе — чытаць сапраўдную літаратуру, асэнсоўваць, аналізаваць... Сярод

**Працяг на старонцы 40.**

# «Наша сумленьне сёньня ратуюць маладафронтаўцы»

Працяг са старонкі 39.

гэтых юнакоў якраз большасьць тых, зь якіх і паўстане новая Беларусь. Але пакуль іх судзяць і судзяць — за «нецэнзурную лаянку ў грамадзкім месьце і дробнае хуліганства».

### «Агіда да словаў — адна з маіх праблемаў»

**СА:** Гэтая «нецэнзурная лаянка» — яшчэ адзін эўфэмізм: усе разумеюць, што судзяць за пратэст супраць рэжыму. Як раней гаварылі пра абмежаваны кантынгент савецкіх войскаў у Афганістане, а там ішла сапраўдная вайна. Такімі эўфэмізмамі — якія лепш было б назваць хлусьнёй — цяпер поўніцца і тэлебачаньне, і газэты. Яны настолькі дэвальвуюць вартасьць слоў, што словы як такія пачынаюць урэшце выклікаць агіду. Гэта адна з прычынаў, чаму я вырашыла на час зьехаць з краіны: адчула, што, для таго, каб расказаць пра наш час, трэба выскачыць з гэтай плыні, з культуры барацьбы, з культуры супрацьстаяньня. Са словамі нешта адбываецца: у іх няма электрычнасьці, няма току, няма напругі. Нешта адбываецца з гэтай прыладай творчасьці: выходзіць столькі кніг, часопісаў, ёсьць фільмы і спэктаклі — і ўсяго гэтага як бы няма. Важна знайсьці нейкі новы жанр, які б пасьпяваў бы за часам... І калі раней пакаленьні пісьменьнікаў працавалі ў стол, то сёньня яны працуюць у паперу.

Гэта адна праблема: інструмэнтальная недасканаласьць слова, якое не адпавядае часу. Ёсьць і іншая праблема. Цяпер ва ўладзе шпана ў культурным сэнсе. Улада пры саветах — гэта была машына. Цяпер гэтага няма. Людзі ва ўладзе не праходзяць ніякай шліфоўкі, ня маюць ніякай культурнай напрацоўкі. Адкуль яны прыходзяць? Ды адкуль заўгодна! Адамовіч у сваім апошнім выступе прарочa сказаў: «Я чую, што ўжо ідуць палкоўнікі». І гэтыя палкоўнікі прыйшлі. Я скажу жорсткую рэч, але мы павінны разумець: перамагла халопская этыка і халопская эстэтыка. Уключыўшы тэлевізар ці разгарнуўшы газэту, вы ўжо нічога не даведаецеся пра рэальныя падзеі. Замест гэтага — эўфэмізмы! Цяпер улада цесна зьвязаная з уласнасьцю, і яна нашла сабе абслугу. Інтэлектуальную абслугу, пра якую Занусі аднойчы сказаў: «Найбольш мяне ўражвае тое, як хутка расейскія пісьменьнікі зьбегліся да аб’едкаў са стала алігархаў». У нас у Беларусі — тое самае, толькі зьбегліся да аб’едкаў са стала ўлады!

**ВТ:** Я таксама даўно адчуў агіду да словаў, асабліва што датычыцца дрэннай мастацкай літаратуры. Таму я ўцёк ва ўспаміны. Я паставіў задачу не аглядацца не на якія вонкавыя ўстаноўкі, а толькі на свой унутраны сьвет. Трэба быць бясстрашным, і, як не парадаксальна, узрост у гэтым дапамагае. Бо ты пачынаеш бачыць ўсё больш выразна і ясна. Хаця паміж словам і рэальнасьцю існуе супярэчнасьць, канечне, ад яе нікуды не падзецца. Але прыблізіцца да аб’ектыўнай праўды магчыма.

**СА:** Мне здаецца, што любы пісьменьнік можа толькі стварыць свой мір. Мы па сутнасьці ня можам большага.

### «Спакойна рабіць сваю працу»

**СА:** Мне цікава сачыць за НН, за ARCHE. Зь імі ўсё ў парадку. Тут ёсьць мэта, яны прадукуюць неардынарныя думкі ... Трэба спакойна рабіць сваю працу. І пры гэтым варта ставіцца да жыцьця як да сьвята. Я пішу кнігі. Кніга — гэта мой рух да разуменьня чалавека, самой сябе, жыцьця. Але, акрамя асноўнага, акрамя кнігі, у мяне ёсьць і сьвяча раніцай на стале, і размова пры агні зь сябрам, і паход зь дзіцём у цырк. Старажытныя грэкі гаварылі пра мастацтва жыцьця. Мастацтва жыцьця — гэта і свабода, і годнасьць, і сьвята жыцьця. Гэта — прыбраць дом, уладкаваць пад’езд...

**ВТ:** Валодзя Караткевіч у пад’езьдзе на кожнай пляцоўцы паставіў крэслы для таго, каб яго маці магла адпачываць. Але аднойчы аказалася, што ўсе крэслы паламаныя і парэзаныя...

**СА:** І тым ня менш варта ставіць крэслы ў пад’ездах! Мая сяброўка Марыя Вайцяшонак шмат часу аддае свайму саду, і сад у яе прыгажэнны. У вёсцы гэта нязвычна, там больш увагі надаюць бульбе ды капусьце. І вось аднойчы самы страшны вясковы п’яніца на мянушку Чорт перавесіўся праз плот і прыпячатаў: «Ё..., як прыгожа!» Вось дзеля гэтага «як прыгожа» і варт працаваць. Нарошчваць чалавека, вось што мы мусім рабіць!

**ВТ:** Наконт сьвята жыцьця... Я цяпер кожны дзень адчуваю як сьвята. Таму што заход. Сьвята заходу. Выдатна сказаў перад сваёй сьмерцю адзін з найбліжэйшых сяброў Алеся Адамовіча і маіх рускі паэт Наум Кісьлік пра тое, што такое наогул жыцьцё чалавека. Ён — чалавек

Приговорённый к высшей мере —
Жить на Земле и обретать потери...

Заход, сонца сядае за гару, і ўсё сыходзіць. Дуб, які ты бачыш, поле, жаночы твар, што раптам апячэ цябе — усё гэта сыходзіць, і таму бязьмерна дарага і каштоўна, таму гэта сьвята...

Але акрамя прыватных, асабістых падставаў для сьвята ёсьць яшчэ і грамадзка значныя. Так, я заўсёды бязьмерна радуюся, калі Беларусь заяўляе пра сябе ў сьвеце чымсьці пазытыўным. Апошняй такой нагодай для радасьці стала вылучэньне на Нобэлеўскую прэмію міру Станіслава Шушкевіча. Ён яе варты. Ці атрымае, ці не — гэта вырашаць акадэмікі, але для мяне гэтае вылучэньне — знак таго, што сьвет не забывае пра Беларусь. Пра тое, паміж многім іншым, што за Шушкевічам, калі ён быў старшынём Вярхоўнага савету, з нашай тэрыторыі была выведзена ядзерная зброя.

**СА:** Нам няма ў чым адно аднаго пераконваць. Я толькі хачу яшчэ раз паўтарыць словы майго ўлюбёнага Пастэрнака: «Пасьля Хрыста ніводзін з нас ня можа сказаць, што жыве пад плотам. Мы ўсе жывем у гісторыі».

# Выбары мяне

У хуткім часе выбары адбудуцца адразу ў Польшчы, Расеі і Ўкраіне. Піша **Віталь Тарас**.

Ад таго часу, як Сымон дэ Манфор, граф Лестэрскі, сабраў у Англіі першы парлямэнт, мінула ўжо амаль 750 гадоў. Зь іх апошнія гадоў дзьвесьце прадстаўнічыя органы ўлады абіраюць амаль ва ўсіх краінах сьвету. Бо іншай формулы легітымізацыі ўлады (нават калі ў краіне фармальна захоўваецца манархія) дагэтуль ня вынайдзена.

Зразумела, наяўнасьць выбарных органаў улады і самі па сабе выбары яшчэ ня ёсьць прыкметаю дэмакратыі. Гэта ўмова неабходная, але недастатковая. Але, назіраючы за працэсам выбараў, толькі й можна зрабіць высновы пра тое, у якім стане знаходзіцца грамадзтва.

Так надарылася, што сёлета, за кароткі адрэзак часу, выбары адбудуцца адразу ў трох краінах, суседках Беларусі — Украіне, Польшчы й Расеі. (Прычым, ва ўсіх трох дзейнічае прапарцыйная сыстэма, то бок выбарцы галасуюць за партыйныя сьпісы, а не за кандыдатаў ад акругаў.) І гэта дае добрую нагоду зрабіць некаторыя параўнаньні.

## Украіна. Батлейка для ўсіх

Нехта заўважыў, што для сучаснай палітыкі ва Ўкраіне ў найбольшай ступені, калі параўноўваць зь іншымі постсавецкімі краінамі, падыходзіць вызначэньне: тэатар. Схільнасьць пераважнай большасьці ўкраінскіх дэпутатаў да вонкавай афэктацыі, тэатральных жэстаў і палымяных зваротаў да народу, інакш кажучы — работа на публіку, відавочна прысутнічаюць. Пры гэтым ня толькі выказваньні палітыкаў, але іх дзеяньні могуць выглядаць гранічна жорсткімі ды бескампрамісьнымі. Але ў выніку працілеглым бакам ўсё ж удаецца знайсьці кампраміс альбо само напружаньне зьнікае некуды, быццам і не было прычынаў для канфлікту. Дастаткова ўспомніць нядаўнюю чараду ўказаў прэзыдэнта Юшчанкі аб роспуску Вярхоўнай Рады і прызначэньні датэрміновых выбараў і такую ж чараду паседжаньняў Рады, якая прызнавала ўказы нелегітымнымі, а прэзыдэнта абвяшчала ўзурпатарам. Дайшло да таго, што ў Кіеў, паводле чутак, на загад прэзыдэнцкіх структураў, рушылі Ўнутраныя войскі.

Але тыя палітычныя супярэчнасьці, што на пачатку лета здаваліся з-за мяжы непераадольнымі (расейскія СМІ нават пачалі палохаць грамадзянскай вайной), плаўна перацяклі ў звычайную передвыбарчую барацьбу. І хоць супярэчнасьці нікуды не падзеліся і па-ранейшаму існуе імавернасьць, што выбары нічога ня зьменяць у расстаноўцы сілаў у парлямэнце, думаецца, ні ў кога ва Ўкраіне (ды нават і сярод сур'ёзных палітолягаў у Расеі) няма сумневу ў тым, што ніякай «геапалітычнай катастрофы» там ня будзе. Магчыма, спатрэбіцца яшчэ не адны, а некалькі дзясяткаў выбараў у Раду, а таксама яе роспускаў, каб Украіна канчаткова выйшла на дэмакратычны шлях разьвіцьця.

Дый што за праблема, насамрэч, з адстаўкамі ўраду і датэрміновымі выбарамі?

Італія, напрыклад, за пасьляваенныя гады зьмяніла некалькі дзясяткаў кабінэтаў міністраў, адзін урадавы крызіс зьмяняўся іншым. Але на лёсе італьянскай дэмакратыі і дабрабыце італьянскага народу гэта ніякім чынам не адбілася.

Зразумела, дэмакратыі ва Ўкраіне яшчэ далёка да ўзроўню Італіі. Ні для кога не сакрэт, што ў палітыцы тут, як і ва ўсіх постсавецкіх краінах, дамінуюць ня столькі палітычныя, колькі прыватныя ці групавыя інтарэсы. Таму з гледзішча чыстай палітыкі зразумець, што адбываецца, бывае цяжка. Так, прэзыдэнцкая правалібэральная «Наша Ўкраіна» ўступае ў передвыбарны саюз зь левацыкальным згуртаваньнем экс-сацыяліста Луцэнкі, ня менш лібэральная (у эканамічным сэнсе) Партыя рэгіёнаў Януковіча ў хаўрусе з сацыялістамі і нават камуністамі, а нібыта кансэрватыўны блёк Цімашэнкі выступае з пазыцыяў крайняга папулізму! Пры гэтым ад Партыі рэгіёнаў, якую лічаць чырвонай і прарасейскай, у дэпутаты балятуюцца некалькі мільярдэраў (сярод якіх найбольш вядомы — Ахмэтаў)...

Звонку, дзякуючы ня толькі расейскім, але ўсім тэлеканалам, разам узятым, передвыбарная кампанія ва Ўкраіне (дзе гэтая кампанія, фактычна, вядзецца пэрманэнтна) можа нагадваць батлейку. Дзе мэлянхалічны П'еро (Юшчанка) увесь час ліе сьлёзы з розных прычынаў, сарамліва-насьцярожана паглядаючы на Калямбіну (Цімашэнку), экспансіўны Арлекіна (Януковіч) час ад часу заляцаецца замест Калямбіны да П'еро, а шалёная Калямбіна лупцуе ў парывах жарсьці то П'еро, то Арлекіна.

Акрамя таго, на сцэне час ад часу зьяўляецца адзін з важных пэрсанажаў — чорт. (У ягонай ролі па чарзе выступаюць Сіманенка,

Працяг на старонцы 42.



**Віктар Януковіч у перад-выбарнай паездцы на Валыні.**

# Выбары мяне

Працяг са старонкі 41.

Вітрэнка, Паўлоўскі ў абдымку з Затуліным альбо Пуцін уласнай пэрсонай.) Чорт ганяецца за несьмяротнай украінскай душой, спрабуючы ўсіх купіць ды падмануць, але ўрэшце сам застаецца ў дурнях — пад рогат задаволенай публікі.

Зразумела, параўнаньне палітыкаў зь лялькамі не арыгінальнае. Але варта зазначыць, што гаворка ў выпадку з украінскімі палітыкамі вядзецца менавіта пра батлейку, а ня, скажам, тэатар марыянэтак (як у Расеі), дзе лялькамі кіруюць з дапамогай нябачных шнуроў. У батлейцы ж галоўнае — не лялькаводы і нават ня лялькі, а сама публіка, безь якой не было б і прадстаўленьня. Зважаючы на гэта, украінскія палітыкі, якімі б карысьлівымі матывамі яны ні кіраваліся, мусяць увесь час датрымоўвацца правілаў гульні і стараюцца спадабацца простаму выбарцу — часам з дапамогай самых неварагодных трукаў і кульбітаў. Бо адным з галоўных правілаў гульні застаецца свабода СМІ, якія рана ці позна выводзяць любых палітыкаў на чыстую ваду.

І пакуль гэта будзе так, Украіна будзе рухацца да дэмакратыі, хай сабе павольна, штуршкамі, а часам і ўаб’езд.

## Польшча. До блюзнэрства!

Украіна, безумоўна, вучылася й вучыцца дэмакратыі ў сваёй суседкі Польшчы, зь якой гістарычна яе узаемадачыненьні складаліся вельмі нялёгка. Але ж вядома, што ў вырашальны момант, калі Ўкраіна апынулася на Майдане, менавіта Польшча ў асобах прэзыдэнта Квасьнеўскага і экс-прэзыдэнта Валенсы першай прыйшла на дапамогу «аранжавай рэвалюцыі» і спрыяла дасягненьню кампрамісу, які палягаў у 2004-м годзе на перавыбарах. Польшчы, зь яе старадаўнімі традыцыямі Сойму, здавалася б, досьведу ў пабудове дэмакратыі хапае. Але ж і на радзіме



Папуліста Анджэя Лепэра называюць «польскім Лукашэнкам».

першай канстытуцыі, як выявілася, апошнім часам ёсьць свае праблемы.

Словы экс-прэзыдэнта Чэхіі Вацлава Гаўла пра тое, што на выбары ў Польшчы трэба запрасіць міжнародных назіральнікаў, каб ні ў кога не было сумневаў у празрыстасьці вынікаў, выклікалі ў польскіх мэдыях рэакцыю, блізкую да шоку.

Польскае грамадзтва сатрасалі карупцыйныя ды сэксуальныя скандалы. І хоць непасрэдна галоўнай партыі кіраўнічай кааліцыі «Права і справядлівасьць» яны ня тычыліся, бо героямі скандалаў станавіліся то лідэр «Самаабароны» Лепэр, то дэпутаты ягонай фракцыі, то лідэр Лігі польскіх сем’яў Раман Гертых, у грамадзтва паступова высьпявала пытаньні. Калі спыніцца чарада гэтых скандалаў? І ці ж не нясе адказнасьць за іх таксама прэм’ер Качыньскі? Гэта ён доўга і ўпарта трымаўся за саюз з «Самаабаронай» і ЛПС. Пры гэтым не прызнаючы за сабой ніякіх памылак.

Тое, што затушоўвалася й замяталася пад коўдру з мэтай захаваць прыстойны выгляд, раптам вылілася на галовы польскіх абывацеляў у нечуваных маштабах. Тое, пра што многія выбарцы здагадваліся, але баяліся сабе прызнацца, пацьвердзілася — кароль (то бок палітыкі) голыя!

«ПіС» ідзе фактычна нос у нос з апазыцыйнай Грамадзянскай плятформай і імкнецца выкарыстаць свой адміністрацыйны рэсурс перад выбарамі. Аднак, нават калі партыя атрымае перамогу на выбарах, ёй давядзецца шукаць узаемадзеяньня зь непрымірымімі спаборнікамі. Так што лідэрам дзьвюх галоўных партыяў давядзецца неяк дамаўляцца паміж сабой, не спадзеючыся на кааліцыю яшчэ з кімсьці.

Палякі аказаліся ня проста перад выбарамі, але перад выбарам: далей інтэгравацца ў аб’яднаную Эўропу альбо замкнуцца ў сваёй польска-каталіцкай самабытнасьці, крочыць «адзіным і непаўторным шляхам», падобна свайму адвечнаму ворагу — Расеі.

## Расея. Выбары ня месца для дыскусіі

У Адэсе ёсьць Музычная школа імя Сталярскага — першая ў гісторыі СССР школа для дзяцей з музычнымі здольнасьцямі. Яе заснаваў 1933-ім годзе вядомы ва ўсім сьвеце пэдагог Пётра Сталярскі. Сярод яго першых вучняў быў Давід Ойстрах, да ягонай школы належаць Ліяна Ісакадзэ, Гідон Крэмэр і шмат іншых геніяльных музыкаў. Пра Сталярскага і ягонае пачуцьцё гумару складалі легенды. Расказваюць — пасьля таго, як школе, у савецкіх традыцыях, яшчэ пры жыцьці пэдагога прысвоілі ягонае імя, Сталярскі любіў казаць: «Школа имени мине». (Паходжаньнем зь беднай габрэйскай сям’і, ён так і не навучыўся добра гаварыць па-расейску).

Але размова тут не пра Сталярскага, і не пра Адэсу з Украінай, а пра Расею. Усьлед за Сталярскім Пуцін, бадай, мог бы сказаць пра будучыя выбары ў Расеі (у тым ліку парлямэнцкія): «Выбары імя мяне». Ці проста — выбары мяне!

Размовы пра стварэньне дзьвюхпартыйнай альбо трохпартыйнай сыстэмы ў Расеі, хутчэй за ўсё, так і застануцца размовамі. Проста таму, што з чатырох партыяў, якія паводле прагнозаў, могуць прэтэндаваць на месцы ў Думе, ўласна азначэньню «партыя» адпавядае толькі КПРФ. Хоць і яе ідэалёгія адчувае выразную карозію, становіцца ўсё больш двухсэнсоўнай, а ўсё-ткі яна прэтэндуе на званьне апазыцыйнай.

У яе за плячыма ёсьць нейкая гісторыя (праўда, жудасная), яе лідэры, як правіла, адрозьніваюцца ад лідэраў астатніх партыяў кроем пінжакоў і яшчэ больш — выразам твараў. Усе астатнія партыі вызначаюцца толькі ступеньню падхалімажу (тонкім віртуозам тут, безумоўна, выступае Жырыноўскі, але зь лёгкасьцю праходзіць і грубая лісьлівасьць Грызлова зь Міронавым).

Пры гэтым, зразумела, партыі (!) ўлады цэняць ня столькі самога Пуціна і ягоныя шматлікія перавагі, колькі самі статус і пасаду першай асобы ў Крамлі, ад якой залежыць будучыня шматлікага войска чыноўнікаў і палітыкаў. Бо як толькі (і калі) на месца Пуціна заступіць пераемнік, усе лепшыя якасьці цяперашняга прэзыдэнта аўтаматычна будуць прыпісаныя новаму. Пуцін таксама гэта разумее, таму й не сьпяшаецца называць пераемніка, да якога пры першай магчымасьці перабяжыць, можна не сумнявацца, уся каралеўская раць.

Для тых, хто датуль яшчэ не зразумеў асаблівасьцяў бягучай расейскай палітыкі, Пуцін зладзіў бліскучы спэктакль. Калі ў дзяржаўных і незалежных СМІ не засталося ўжо амаль ніводнага палітоляга, які б не прадказваў прызначэньне пуцінскага «пераемніка» Сяргея Іванова на пост кіраўніка ўраду, прэзыдэнт Расеі ўзяў ды прызначыў прэм’ерам Віктара Зубкова.

Можна пагадзіцца з тымі расейскімі палітолягамі, якія лічаць, што галоўным і адзіным матывам Пуціна ў гэтым эпізодзе былі ягоныя асабістыя інтарэсы, ведаць, а тым больш прадказваць якія іншым ня дадзена. Калі зьвярнуцца да габрэйскага фальклёру, дык Пуцін проста нагадаў усім удзельнікам азартнай гульні ў «пераемніка», хто гаспадар у лаўцы.

У любой нармальнай краіне ўрад фармуецца паводле вынікаў парлямэнцкіх выбараў. У краіне «сувэрэннай дэмакратыі» ўрад начале з новым прэм’ерам фармуецца за тры месяцы да выбараў. Такім чынам, чыноўнікам і грамадзтву падаецца недвухсэнсоўны сыгнал. Колькі б ні атрымала «Адзіная Расея» месцаў у Думе на выбарах — канстытуцыйную большасьць ці звычайную — прызначаць прэм’ера будуць не адзінаросы і ня справаросы, а толькі сам прэзыдэнт. А ніякі не «кульгавы качар».

І калі нават Пуцін сыдзе, ён усё адно застанецца, як бы ні называўся наступны прэзыдэнт. Трапныя словы сьпікера Грызлова пра тое, што «парлямэнт не месца для дыскусіяў» можна дапоўніць тым, што і выбары ў Расеі цяпер патрэбныя не для дыскусіяў аб шляхах разьвіцьця краіны, а для плаўнага і стабільнага пераходу ўлады ад аднаго прэзыдэнцкага тэрміну да наступнага.

У зьвязку з усім гэтым ня толькі простыя грамадзяне, але й некаторыя апазыцыйныя палітыкі ў Расеі пачалі задавацца пытаньнем: а ці трэба ўдзельнічаць у такіх выбарах, вынік якіх прадвызначаны?

## Беларусь. А што мы?

Калі ставіць пытаньне пра выбары ў дачыненьні да Беларусі, дык яго трэба, для пачатку, разьбіць на два. Першае зь іх — ці трэба ўдзельнічаць у несвабодных выбарах грамадзянам? Адказ на гэтае пытаньне ёсьць, хоць ён і не відавочны. Чытачы майго пакаленьня памятаюць, што за савецкім часам, калі выбары былі безальтэрнатыўныя (99,8 % заўсёды галасавалі за блёк камуністаў і беспартыйных), начальству вельмі важна было, насамрэч, як прагаласуюць. Калі нехта з выбарцаў заяўляў, што ён ня пойдзе на выбары, бо ў яго дома працякае дах, мясцовыя ўлады, як правіла, прысылалі майстроў і праблема вырашалася. А калі нехта прыходзіў на выбары і, карыстаючыся таемнасьцю галасаваньня, выкрэсьліваў адзінага кандыдата ў дэпутаты (бо іншых не было), гэта псавала вынікі на дадзеным канкрэтным участку. І нават калі яны адрозьніваліся ад заплянаваных усяго на адну сотую адсотка, мясцовае партыйнае начальства атрымлівала наганяй ад райкаму, а райкам у сваю чаргу — ад вышэйшага начальства. Такім чынам, шляхам простага волевыяўленьня, то бок выкрэсьліваньня прозьвішча зь бюлетэня можна было хаця б сапсаваць настрой начальству. Зразумела, гэта нічога не мяняла ў дзяржаўным і грамадзкім ладзе. Але пакідала пачуцьцё выкананага маральнага абавязку. Так што нават у таталітарным грамадзтве ёсьць сэнс паразважаць над тым, ці трэба ісьці на выбары і дзеля чаго. Але рашэньне тут залежыць ад кожнага індывідуальна.

А вось калі задаць пытаньне, ці трэба палітычным партыям удзельнічаць у парлямэнцкіх выбарах, дык ва ўмовах Беларусі яно, на жаль, гучыць некарэктна. Калі цягам дзесяцігодзьдзя ніводнай палітычнай партыі не ўдаецца правесьці сваіх кандыдатаў у парлямэнт, узьнікаюць сумневы ня толькі ў справядлівасьці дзейнага выбарнага заканадаўства, але і ў тым, ці ёсьць самыя партыі? Адказ кшталту таго, што ў выбарах партыям трэба ўдзельнічаць выключна ў мэтах мабілізацыі ці інфармаваньня насельніцтва, таксама недастатковы, паколькі такая стратэгія цягам апошніх гадоў не прывяла да колькі-небудзь заўважных зрухаў у грамадзтве.

Магчыма, пытаньне варта паставіць крыху іначай. Ці варта рыхтавацца да будучых парлямэнцкіх выбараў? Тут адказ падаецца відавочным — безумоўна, варта. Толькі рыхтавацца да іх трэба ня ў часе выбарнай кампаніі, калі ўсё ўжо сапраўды прадвызначана, а задоўга да іх пачатку. Найбольшую колькасьць мэдалёў на Алімпійскіх гульнях, як правіла, выйграюць тыя каманды, мэнэджэры й трэнэры якіх рыхтуюцца з прыцэлам не на бліжэйшую Алімпіяду, а тую, што будзе праз восем-дванаццаць гадоў. Каб быў час для селекцыі, вывучэньня патэнцыйных спаборнікаў, вызначэньня стратэгіі і шмат што яшчэ — улучна да экіпіроўкі. Час пайшоў.




**Калі нават Пуцін сыдзе, ён усё адно застанецца.**

# Плян «Новага Места»

Працяг са старонкі 24.

тавы і 21 публічную лекцыю. Колькасныя паказчыкі дзейнасьці арганізацыі ўражваюць — на склады Менскага Кола было зьвезена каля 600 скрыняў, што ўтрымлівалі каля 36 тыс. прадметаў: гравюраў, абразоў, шкляных вырабаў, зброі і г.д., а таксама архіўных матэрыялаў. Выключна польская арыентацыя таварыства прывяла да стратаў для Беларусі вялікай колькасьці каштоўнасьцяў. У лістападзе 1918 г., пасля адыходу зь Менску нямецкіх войскаў, Кола арганізавала «3 цягнікі» да Варшавы. Агулам Менскаму Колу ўдалося вывезьці 255 скрыняў (9 вагонаў) матэрыялаў. І гэта сучасная польская архіўная статыстыка.

Пасьля заняцьця Менску Чырвонай Арміяй частка дзеячоў Менскага Кола, каб працягваць справу рэвіндыкацыі (вывазу ў Варшаву менскіх каштоўнасьцяў), утварыла так званую Калегію Старажытнасьцяў пры Камісарыяце Асьветы. Рэшта ўдзельнікаў Менскага Кола выехала ў Варшаву. У пачатку 1919 г. у Менск прыбыла польская дзяржаўная камісія, якая мелася заняцца далейшым лёсам сабраных на Меншчыне матэрыялаў. У склад камісіі ўваходзілі, між іншых, прадстаўнік Генэральнага камісара Ўсходніх земляў Уладзіслаў Рацкевіч, а таксама старшыня Менскага Кола Станіслаў Няканда-Трэпка. Увосень 1919 г. Менскае Кола пераўтварылася ў Аддзел помнікаў пры арганізацыі пад назваю Страж Крэсова, якая далейшыя рэвіндыкацыйныя працы праводзіла пры дапамозе войска.

Аддзел Помнікаў забясьпечваў захаваньне, інвэнтарызацыю і арганізоўваў перавозку да Варшавы сабраных матэрыялаў. Фактычным працягам дзейнасьці Менскага Кола стала праца Зьмяшанай камісіі па справах рэвіндыкацыі і рээвакуацыі польскай маёмасьці, утворанай у выніку падпісаньня 18 сакавіка 1921 г. паміж новай Польшчай і Савецкай Расеяй Рыскай дамовы. Менскія каштоўнасьці, пры згодзе чырвоных камісараў, працягвалі мэтадычна вывозіцца ў Варшаву.

У Варшаве з 1920-х гадоў вывезеныя рэчы і дакумэнты захоўваліся ў зборах Нацыянальнага Музэю. У 1950—1951 гг. архіўная частка гэтых матэрыялаў, інвэнтарызаваных у Нацыянальным Музэі пад датамі 1495—1922 гг., была перададзеная ў Галоўны архіў старажытных актаў, дзе і захоўвацца ў нашыя дні.



Кашарская плошча. Выгляд з поўдня.

## Мода на пляны

У XIX ст., да вынаходніцтва і пашырэньня фатаграфіі, мапы і пляны паселішчаў былі модным сродкам іх адлюстраваньня. Значны прагрэс зрабіла і геадэзія. Вось менавіта ў дыдактычных, навучальных мэтах у 1804 г. менскія гімназісты вышэйшых чатырох клясаў вымералі ды склалі плян тагачасных прадмесьцяў Новае Места, Кашары, Ляхаўка. Так адзначана на віньетцы, што з правага боку ўпрыгожвае плян. А зь левага боку напісана па-польску (на мове эліты і адукацыі ў Менску на пачатку XIX ст.): «Гэтую мапу нарысаваў і перанёс на паперу Вінцэнт Вайневіч, вучань клясы III».

## Тапаграфічныя рэаліі пачатку XIX ст.

На пляне адлюстраваныя паўднёва-ўсходнія прадмесьці Менску. Менавіта ў гэтым кірунку з пачатку XIX ст. стаў актыўна разьвівацца горад — уздоўж Сьвіслачы, за мяжой былога гарадзкога валу. У гэтым напрамку знаходзіўся вялікі пагорак, зручны для жыльлёвага будаўніцтва паводле санітарных прычынаў. Той пагорак і стаў ядром новай часткі Менску — **Новым Рынкам**, ці **Новым Местам** (сёньня Тэатральны сквэр каля Купалаўскага тэатру). Назва прадмесьця паходзіла ад новастворанай плошчы, на якой у нядзелі да 1840-х гадоў ладзіліся гарадзкія кірмашы. Беларускі падарожнік і папулярызатар гісторыі Павал Шпілеўскі так апісваў кірмашы на Новым Рынку: «Бывала, сюды зьбіраліся пасяленцы і аднадворцы з усіх навакольных сёлаў, вёсак і засьценкаў з рознымі таварамі. З самай раніцы плошча запаўнялася незьлічонымі падводамі, калымагамі, вазамі і калёсамі (беларуская асаблівай канструкцыі падвода)… Больш заможныя сельскія гаспадары прыязджалі з жывымі кабанамі, каровамі і коньмі. Тут жа зьмяшчаліся і вазы з дровамі, лыкам, пянькой… Хаос страшэнны!... Але паміж прывазнымі таварамі зьмяшчаюцца ў некаторых крамах прадметы туземных менскіх фабрыкаў, напрыклад, сукны фабрыкаў графа Патоцкага, Камінскага і Скірмунта ды баваўнянай матэрыі лагойскай фабрыкі графа Тышкевіча. Апроч таго, у кантрактных крамах знойдзеце мужчынскі і жаночы абутак менскай работы, які славіцца на цэлую Беларусь…»

Іншы аўтар, Аляксей Сапуноў, на прыкладзе гандлю на Новым Рынку падаў свой погляд на эканамічную прыроду пабытовага антысэмітызму: «На плошчы ж у пэрыяд кірмашу (кантрактаў) уладкоўваліся часовыя крамкі… У той жа час некаторыя больш буйныя і прадпрымальныя землеўладальнікі, як Паўлікоўскі, Лукашэвіч ды іншыя, пачалі адчыняць у Менску крамы з каляніяльнымі таварамі, замежнымі вінамі і рознымі мэталічнымі вырабамі з мэтаю продажу тавараў па памяркоўных цэнах, але ім гэта не ўдалося, бо габрэі-канкурэнты пашырылі свой гандаль настолькі, што прадпрымальнікам негабрэям засталося толькі зачыніць свае крамы. Такім чынам, гандлёвая дзейнасьць габрэяў у Менску расквітнела».

Жылыя кварталы Новага Места атрымалі прастакутную форму і выразную геамэтрычную сетку вуліцаў, утвораную шляхам працягу ў паўднёва-ўсходнім напрамку старажытных вуліцаў Дамініканскай (ад 1866 г. Петрапаўлаўская, сёньня

Энгельса), Францішканскай (у далейшым Губэрнатарская, сёньня Леніна) і Фэліцыянскай (у далейшым Багадзельная, сёньня Камсамольская). На ўсход, бліжэй да ракі, паралельна ім разьвіліся вуліцы Кашарская (ад 1866 г. Батальённая, ад 1882 г. Скобелеўская, сёньня Чырвонаармейская) і Паліцэйская (Янкі Купалы). Пэрпэндыкулярна гэтым новым вуліцам былі праведзеныя тры новыя: Магазынная (Кірава ад Сьвярдлова да Купалы), якая атрымала назву ад разьмешчаных непадалёк новых правіянцкіх складоў; Лошыцкая (у сярэдзіне XIX ст. вуліца Новага рынку — Бульвар, ад 1866 г. Базарная, ад 1870-х гадоў Падгорная, цяпер Маркса); Захараўская (праспэкт Незалежнасьці ад вул. Камсамольскай да Янкі Купалы). Праўдападобна, правобраз гэтай новай тапаграфічнай структуры мы знаходзім у левай (паўночнай) частцы пляну — з выразным акрэсьленым пагоркавым ляндшафтам. А менавіта, тут можна пабачыць трасіроўку будучай вуліцы Магазыннай, а таксама паўднёвыя працягі вуліцаў Францішканскай, Дамініканскай і будучых вуліцаў Кашарскай і Паліцэйскай (пералік зроблены зьнізу ўверх).

На ўсход ад Новага Места знаходзілася прадмесьце **Кашары**. Тут у выгіне ракі было выбранае месца будаўніцтва казармаў для разьмяшчэньня менскага гарнізону. Ад казармаў («кашараў» у старабеларускай мове) і паходзіць назва прадмесьця. Ужо на пляне Менску 1858 г. гэтая мясцовасьць пазначаная як «Деревянные казармы, занимаемыя ныне Военнымъ Гошпиталемъ». Як тапанімічны сьлед тых часоў і сёньня захаваўся завулак Казарменны. У пачатку XX ст. Кашары сталі прамысловым раёнам гораду. Усё прадмесьце праціналa вуліца Кашарская (сёньня Чырвонаармейская). Але на пляне 1804 г. яна яшчэ не пазначаная. Дакладней, гэтая вуліца не абазначаная на месцы самога прадмесьця Кашары, але ў Новым Месцы пазначаны расплянаваны кавалак вуліцы, які потым стане працягам вул. Кашарскай. Пакуль жа на пляне мы бачым толькі шэраг пабудоваў казармаў, а таксама створаны на самым усходзе прадмесьця сквэр ля ракі (існуе і сёньня). Рэчышча паказанае яшчэ не спрамлёным.

На поўдзень Кашараў (у паўднёва-ўсходнім кірунку ад Новага Места) знаходзіцца самая старажытная з трох адлюстраваных на пляне 1804 г. частак Менску — **Ляхаўка**. Гісторыкі мяркуюць, што гэтая назва мае этнічнае паходжаньне — прадмесьце магло пачацца зь сялібы перасяленца з Польшчы (такую назву, відавочна, не маглі даць самі палякі, а менавіта беларускае насельніцтва Менску). Вёска Ляхава Лука фіксуецца на паўднёвай ускраіне гораду ўжо ў XVI ст. У XVIII ст. гэтая мясцовасьць была вядомая ўжо як Ляхаўская Слабада. У выніку разьвіцьця прадмесьця на працягу XIX ст. узьніклі Верхняя Ляхаўка (сучасны трохкутнік вуліцаў Магазыннай / Ульянаўскай, Каломенскай / Сьвярдлова і Беларускай) ды Ніжняя Ляхаўка (вакол сёньняшняй вуліцы Кастрычніцкай, а таксама прырэчнай часткі вуліцы Магазыннай / Ульянаўскай). У канцы XIX ст. Ляхаўка таксама стала важным фабрычным раёнам (вінакурны, дрожджавы, гарбарны, мэталаапрацоўчы заводы), чаму паспрыяла зручнае разьмяшчэньне раёну на беразе ракі і паблізу чыгункі. На Пляне 1804 г. раён будучай Верхняй Ляхаўкі паказаны як тэрыторыя зь сенажацямі, ворнымі землямі і толькі зь некаторымі будынкамі. Затое досыць выразна прарысаваны раён Ніжняй Ляхаўкі — на паўвысьпе, у выгіне Сьвіслачы. Тут даволі падрабязна выяўлены маёнтак, вядомы таксама паводле пляну 1858 г. як двор Ляхаўскі. Увогуле, маляўнічасьць Сьвіслачы адзначалі многія аўтары XIX ст. Уладзіслаў Сыракомля, якому вельмі падабалася прыяжджаць зь Вільні ў Менск, пісаў, што «цудоўныя сенажаці аздабляюць яе [Сьвіслачы] берагі; дзе-нідзе дрэвы стаяць купамі, а дзе-нідзе адкрываецца від альбо на прыгожае прадмесьце Ляхаўка, альбо на горад ці поле» (тут апісана візуальная пэрспэктыва з боку Губэрнатарскага парку / Цэнтральнага дзіцячага парку). «Берагі галоўнай ракі, яе затокі і рукавы ўтвараюць шмат дзе цудоўныя пэйзажы; некалькі прыгожых пагоркаў аздабляюць раўніну, а багатая расьліннасьць вабіць пышнымі дрэвамі, весяліць выглядам багатай збажыны і пашы... Рака Сьвіслач плыве то па зялёнай сенажаці, засланяючыся вянком прыгожых вольхаў, то перарываючыся доўгім мостам, перакінутым праз яе затокі. І ўсё гэта разам стварае непаўторны, запамінальны малюнак. Сьпічакі касьцёлаў і гмахі, што здалёк кідаюцца ў вочы, надаюць Менску выгляд гораду нашмат большага, чым ёсьць ён на самай справе».

Таксама на пляне 1804 г. выразна прасочваецца трасіроўка будучай вуліцы Ніжне-Ляхаўскай (цяпер Кастрычніцкай), што праходзіла якраз праз маёнтак. Часткаю гэтай вуліцы быў мост праз Сьвіслач на трох апорах (падобна, што прыблізна ў гэтым месцы праходзіць і сучасны мост). На поўдзень, на правым беразе Сьвіслачы заўважна трасіроўка вул. Верхне-Ляхаўскай (у канцы XIX ст. Круглай, сучасная Беларуская). Тут, у глыбі вуліцаў Ульянаўскай і Беларускай, яшчэ захавалася забудова менскіх прадмесьцяў канца XIX — пачатку XX стст., якія насялялі працаўнікі суседніх фабрыкаў. Іхныя дамы маюць цокальны мураваны ярус і драўляны верхні паверх. Сучасны горад няўмольна наступае на іх. І калі яшчэ за менскія мураванкі ўздымецца голас грамадзкасьці, то драўляная гістарычная забудова нашай сталіцы ўвогуле ня мае заступнікаў.



**Тыповая забудова пачатку XX ст. прадмесьця Верхняя Ляхаўка (зав.Круглы, 2).**

Калі паглыбляесься ў гісторыю менскіх вуліцаў і прадмесьцяў, пачынаеш вастрэй адчуваць, наколькі ненатуральнымі з пункту гледжаньня гісторыі гораду і палітычна кан'юнктурнымі зьяўляюцца многія тапанімічныя назвы XX ст. — яны ня ўлічваюць ні абставінаў узьнікненьня вуліцаў, ні ляндшафтных асаблівасьцяў розных частак гораду, ні сацыяльна-эканамічных аспэктаў іх разьвіцьця. Плян паўднёвых прадмесьцяў Менску 1804 г. зноў зьвяртае нашую ўвагу на неабходнасьць паважлівага і ашчаднага стаўленьня да тапанімічнай спадчыны Менску.


Дом з прывідам
(Заканчэньне)
У-у-у!
А-а-а!
А-а-а!
Капітан Танака і Гузік спужаліся прывіда і зьбеглі...
Хі-хі-хі!
А я проста пажартаваў!
Але раптам...
А-а-а! Гіганцкі павук!
Ратуйце!
Ха-ха-ха! Такі вялікі, а спужаўся ценю ад маленькага павучка!
Канец!
Капітан Танака
http://www.tanakaland.org

# Карціны Сашы ў клубе «Ізюм»


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Тыя дзесяць-дванаццаць карцін Аляксея Хацкевіча (Сашы з дуэту Сашы ды Сірожы), якія прэзэнтавалі на мінулым тыдні ў клубе «Ізюм», падаліся падобнымі на іх песьні; настолькі ж таленавітыя і выклікаюць падобныя пачуцьці. І вось дзіва: здаецца, сьцябуцца і выдурваюцца гэтыя два персанажы з доўгімі насамі і класічнай трасянкай, веселяць народ, а іх песьню «Новы год» не магу слухаць — сьціскаецца горла і падступаюць сьлёзы (ну, хіба не сэнтыментальная дура? — спытаеце вы і будзеце мець рацыю). Так і тут: на тле тлуму журналістачак і прадусераў, якія ласаваліся хто сангрыяй, хто цукеркамі са шчупаком, карціны, падалося, жылі сваім жыцьцём, адлучана і чужародна, не зьвяртаючы вялікай увагі на тое, што іх выставілі — як заявілі арганізатары — каб дасьледаваць уздзеньне на стрававальне наведвальнікаў... Карціна дзіўнаватыя, гранічна гарадскія і вельмі ўпэўненыя ў сабе... Схадзіць, хіба, яшчэ раз у той «Ізюм», паглядзець на іх яшчэ раз у спакойнай абстаноўцы? Тым больш, што гэта ў хвіліне хады ад плошчы Каліноўскага.

**НБ**

# Зорка Міколы Селешчука



**Ад 11 кастрычніка ў Мастацкім музэі** — рэдкая магчымасьць пабачыць творы Міколы Селешчука (1947—1996), аднаго з найбольш яскравых і загадкавых беларускіх творцаў XX ст. Выстава яго жывапісу і графікі прымеркаваная да 60-годзьдзя зь дня нараджэньня мастака. Будуць выстаўленыя каля 50-ці твораў з фондаў дзяржаўных музэяў і прыватных калекцыяў. Мікола Селяшчук — адзін з найяскравейшых мастацкіх талентаў Беларусі другой паловы XX ст. **Выставу можна будзе паглядзець да 10 лістапада у музэі (вул. Леніна, 20).**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Мальер»

Францускі фільм пра слыннага драматурга.

**Мальер** (Molière)

Францыя, 2007, каляровы, 120 хв.

**Рэжысэр:** Лярэн Цірар

**Ролі выконваюць:** Рамэн Дзюры, Фабрыс Лукіні, Ляўра Марантэ, Эдуард Баэр, Людзівін Санье, Фані Валет, Мелані Дос Сантас

**Жанр:** Касьцюмная біяграфічная камэдыя

**Прызы:** Прыз глядацкіх сымпатыяў Лярэну Цірару на Маскоўскім міжнародным кінафэсьце, прыз Фабрысу Лукіні, як найлепшаму актору на МКФ у Маскве.

**Адзнака:** 7 (з 10)

Драматург і актор Мальер — у пазыках. Крэдыторы кідаюць яго ў турму. Нейкі мэсье Журдэн згодны аплаціць даўгі Мальера, калі той дапаможа яму спакусіць салёную прыгажуню. Каб у хатніх Журдэна не было лішніх пытаньняў, мэсье прадстаўляе Мальера як сьвятара Тарцюфа…

Рэжысэр Лярэн Цірар захапіўся карцінай «Закаханы Шэкспір», дзе жыцьцё ангельскага драматурга паказанае надзвычай вольна, як жывы сюжэт зь ягоных п'есаў. «Мальер» 2007 году (а ёсьць яшчэ ранейшыя кінабіяграфіі) — гэта не дакладны жыцьцяпіс слыннага францускага аўтара. Гэта варыяцыі на тэму мальераўскіх п'есаў, дзе драматург — герой і ўдзельнік камічных падзеяў.

Экранны Мальер прыкідваецца пабожным аскетам («Тарцюф»), вучыць «Мешчаніна ў шляхецтве» літаратуры й акторскаму майстэрству, выкрывае «Мізантропа»-пляткарку — і спакушае жонку дурнога мешчаніна, якая стаецца ягонай музай.

Сярод спасылак — «Кабала сьвятошаў» Булгакава й клясычны чатырохгадзінны «Мальер» Арыяна Мнушкіна.

Пяшчотна-яскравыя касьцюмы, лёгкая й нязмушаная гульня — францускага кавалера Рамэна Дзюры, разважлівага Фабрыса Лукіні, дасьціпнай і пекнай Ляўры Марантэ; сьветлыя галянтныя кадры.

І ня страшна, што гісторыя сапраўднага Мальера — іншая. Аўтар жыве ў сваіх творах. А Лярэн Цірар пераклаў гумар і досьціпы мальераўскіх п'есаў на мову сучаснага масавага мастацтва.

**Андрэй Расінскі**

## ВЫСТАВЫ

### Швэдзкае ювэлірнае мастацтва

**Да 21 кастрычніка ў Нацыянальным музэі гісторыі культуры (вул. Маркса, 12)** ідзе выстава сучаснага швэдзкага ювэлірнага мастацтва. Вынік працы пятнаццаці мастакоў-удзельнікаў праекту — разнастайныя па сваёй форме і матэрыяле мастацкія творы, што дэманструюць розныя і самабытныя канцэпты і шляхі ўвасабленьня.

Частка экспанатаў зробленая з срэбра, але выкарыстоўваецца таксама дрэва, папера, плястмаса ды сылікон.

### Толькі добрыя пэрсанажы

**У выставачнай залі Музэю гісторыі беларускага кіно (Сьвярдлова, 4) да 6 кастрычніка** працуе выстава анімацыі і графікі мастачкі-пастаноўшчыцы мультыплікацыйных фільмаў **Таццяны Кубліцкай**.

### Чароўны сьвет

**У М-Галерэі інстытуту імя Гётэ (Фрунзэ, 5) да 12 кастрычніка** працуе выстава літаграфіяў **Вольгі Крупянковай** «Чароўны сьвет».

**Падрыхтавала НБ**

### Выстава, прысьвечаная Напалеону Орду ў Віцебску

Гэтая выстава — плён працы мастакоў падчас зімняга пленэру ў Глыбоцкім раёне.

Будуць экспанавацца 60 карцінаў. Іх аўтары — і маладыя мастакі, і мэтры беларускага жывапісу, якія з 26-га сьнежня да 2-га студзеня працавалі на Глыбоччыне.

Пленэр быў прысьвечаны 200-м угодкам Напалеона Орды — мастака, музыкі, пісьменьніка і пэдагога, які шмат вандраваў па Беларусі і рабіў замалёўкі краявідаў і архітэктурных помнікаў.

**Экспазыцыя месьціцца ў выставачнай залі Музэю сучаснага мастацтва.**

**Радыё Свабода**

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**28 (пт), 29 (сб)** — «Сны аб Беларусі».
**30 (ндз)** — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**1 (пн)** — «Я не пакіну цябе».
**3 (ср), 4 (чц)** — «Эрык XIV».
**5 (пт)** — «Таполевая завея».
**6 (сб)** — «Ідылія».
**7 (ндз)** — «Паўлінка».
*ранішія спэктаклі*
**7 (ндз)** — «Паўлінка».
*малая сцэна*
**5 (пт)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

# Сьвятлана Алексіевіч, Валянцін Тарас: «Наша сумленьне сёньня ратуюць маладафронтаўцы»

Невялікая публікацыя Сьвятланы Алексіевіч у «БелГазеце» ўзрушыла вэтэрана беларускай літаратуры Валянціна Тараса так, што ён памкнуўся напісаць у «НН» адказ – гнеўны. Рэдакцыя прапанавала іншае — каб С.Алексіевіч і В.Тарас сустрэліся. Запісала гутарку Наталка Бабіна. Старонка 41.

## пра-бел / пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі

**Наркамаўка ці тарашкевіца?** Дыскусію працягваюць Сяргей Богдан, Зьміцер Саўка, Сяргей Дубавец, Пётра Рудкоўскі, Андрэй Дынько, Руслан Равяка. .......... 27

**Прэзыдэнт у рэйтынгавай пастцы.** Пра канфэрэнцыю Беларускага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў (БІСД) «Да новага бачаньня Беларусі» піша Аляксандар Класкоўскі. .......... 34

**Пра Дабравольскага і Фядуту.** Крытыканства надакучыла, піша Барыс Тумар. .......... 35

**Задачы незалежнай супольнасьці шырэйшыя за зьмену рэжыму.** З адказаў палітоляга Віталя Сіліцкага, дырэктара БІСД, на онлайн-канфэрэнцыі. .......... 36

**Выбары мяне.** Піша Віталь Тарас .......... 38

**Плян «Новага Места».** Пра невядомую раней мапу Менску, аджуканую ў архівах, піша Алег Дзярновіч .......... 44

## КАЛІ Б...

**Амапаўцы хацелі давесьці, што Івашкевіч быў п’яны.**



ЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

...На гэты момант, таварыш судзьдзя, грамадзянін Івашкевіч быў абсалютна нецьвярозы. На загад прад’явіць дакумэнты, ён прапанаваў мне выпіць за здароўе Аляксандра Лукашэнкі.

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

**Паэтычны фэстываль з удзелам Хадановіча і Жыбуля**

2—7 кастрычніка ў Менску будзе міжнародны паэтычны фэстываль «Парада словаў». Зь беларускага боку ўдзел бяруць Андрэй Хадановіч, Віктар Жыбуль, Джэці, Віталь Рыжкоў. Адкрыцьцё 2 кастрычніка ў Доме літаратара (вул.Фрунзэ, 5) а 18-й.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Дзела аб адабраньні царквы**

17 сьнежня 1905 г у рукойнскае вал. праўл. прышла чарада мужыкоў чалавек трыста, каторая мела раду аб закрыцьці рукойнскай царквы, каб абярнуць яе на касьцёл. Яны патрэбавалі, каб аддалі ім ключы ад царквы і прыстрашылі, што возьмуць сілаю. Тут жа кабета Тамашэўская зьняла ключ са сьцяны. Гэтых мужыкоў вінавацілі ў усенародным скопішчы і адабраньні царквы, каб абярнуць на касьцёл. Суд прыгаварыў Тамашэўскую на тры месяцы турмы, двух на два, двух па месяцу; другіх апраўдалі.

**(С-З. Г.) «Наша Ніва». №34. 1907**



# А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыцеся дамову. Дэталі — **старонка 25.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ТУРНІР

**30 верасьня ў Менску** будзе літаратурна-шахматны турнір. Запрашаюцца ўсе, хто лічыць сябе літаратарамі. Даведкі праз т. (017)255-04-18—29 верасьня з 21.00 да 22.00 (Вольф)

### КНІГІ

**Рыхтуецца да друку** энцыкляпэдычны даведнік «Рэпрэсаваныя мэдыцынскія і вэтэрынарныя работнікі Беларусі. 1917 — 1960». Калі Вам вядома што пра пакутнікаў або ёсьць магчымасьць паўдзельнічаць у праекце, тэлефануйце: 753-82-12, 755-25-61, (017)211-09-53. Леанід Маракоў

### ПРАЦА

**Выпускнік ін’язу** зь веданьнем ангельскай і нямецкай моваў (+ добрае валоданьне кампутарам, хуткі набор тэкстаў) шукае працу. Стаж працы 3 гады. Т.: (1718) 52 6 52 (г.Узда), e-mail: denisalmighty@rambler.ru

### НАБУДУ

**Набуду формы** для адліваньня сьвечак. dubat@tut.by. Т.: 8-0177-75-69-00, 8-029-942-50-96 Алеся

**Набуду** хутар! Для сябе! Разгледжу ўсе прапановы! Т.: 029-766-24-25, 326-24-25. Янак

### ПАКОЙ

**Дзяўчына шукае** пакой. Парадак і своечасовая аплата гарантуецца. Тэл.: 269 45 87 (МТС); 291 10 77 (хатні). Натальля

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** 7 кастрычніка (нядзеля) «Замкі Беларусі» па маршруце: Менск — Мір — Навагрудак — Любча — Ліда — Іўе — Ліпнішкі — Дуды — Менск. 19—22 кастрычніка: Познань — Гнезна. Т.: 292-54-58; GSM 622-57-20; 509-12-16; 110-19-28

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 26.09.2007.

Замова № 5274.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.